Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 40 (4483) 3 кастрычніка 2008 г.

У нумары:

Слову *«дажынкі»* — новы сэнс

Гомельшчына — месца нараджэння адметнага літаратурнага свята.

Стар. 3

З Беларуссю лёс звязаў

Пісьменнік Рыгор Сакалоўскі — старшыня Мінскага абласнога СПБ — выказвае прынцыпова важныя думкі.

Стар. 5

Знаёмцеся: мастак!

Заўважана новае імя ў асяродку таленавітых творцаў-жывапісцаў.

Стар. 11

«Беларуская філалогія — клопат майго жыцця»

Да 90-годдзя з дня нараджэння слыннага сына Беларусі Фёдара Янкоўскага.

Стар. 14

Беларусы ў Прыбайкаллі

Чарговы выпуск рубрыкі «Суайчыннікі ў свеце».

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 6720 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 8710 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры:
1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Нясвіжскі палац адчынены

26 верасня адбылося адкрыццё першай чаргі Нясвіжскага палаца. І гэта сімвалічна, бо першы падмурак замка быў закладзены 425 гадоў таму. Наведвальнікаў сёння прымаюць пакуль пяць экспазіцыйных залаў. А вось цалкам рэстаўрацыю плануецца завяршыць у маі 2010 года.

— Мы не ствараем новы музей, мы толькі спрабуем аднавіць той культурны тэкст, які яшчэ да нас заклалі князі Радзівілы. Ніколі тут не будзе так, як было ў Радзівілаў. Яны жылі ў гэтай прасторы, а сёння тут музейная прастора, — зазначыла навуковы кіраўнік рабочай групы па музеяфікацыі Нясвіжскага палаца Ала Сташкевіч.

Намеснік міністра культуры Віктар Кураш заўважыў, што побач з Нясвіжам размяшчаецца і Мірскі замак, рэстаўрацыю ў якім таксама мяркуюць закончыць у 2010 годзе. Гэта сведчыць аб тым, што ў нашай краіне праводзіцца вялікая работа па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, якая сёння налічвае больш як 4500 помнікаў, з іх 1590 — гэта помнікі архітэктуры.

Супрацоўнікі Нясвіжскага гісторыка-культурнага музея-запаведніка прызнаюцца, што сёння ім не хапае аўтэнтычных рэчаў. Іх вырашылі замяняць копіямі. Музей-запаведнік быў створаны ў 1993 годзе, але камплектацыя экспазіцыі пачалася толькі з 1997. Таму ў фондах сёння больш экспанатаў па этнаграфіі. Каб перайначыць сітуацыю, у Нясвіж для пачатку трэба вярнуць тыя рэчы з замка, што знаходзяцца ў фондах беларускіх музеяў ды іншых установах. Да прыкладу, у мінскім Купалаўскім тэатры знаходзяцца люстры з Радзівілаўскага палаца. І сёння вядуцца перамовы аб тым, каб гэтую каштоўнасць вярнуць у замак. Што да арыгінальных экспанатаў у палацы, то сярод іх — партрэты Радзівілаў, якія для экспазіцыі перадаў Нацыянальны мастацкі музей. У адным з залаў стаіць стол, які "помніць" уладароў палаца. Дзе-нідзе на падлозе можна ўбачыць расколіны. Але гэта расколіны, што пакінулі ў "спадчыну" самі князі. Рэстаўратары вырашылі не мяняць папсаваную кафлю, бо яе ўзрост вымяраецца стагоддзямі. У экспазіцыі залаў размешчаны макеты замка XVI ст. і XVIII ст. Ён не заўжды меў такі выгляд, як сёння. У завершаны архітэктурны ансамбль ён ператварыўся толькі ў сярэдзіне XVIII ст.

Старшыня Нясвіжскага райвыканкама Ігар Макар паведаміў, што за 9 месяцаў гэтага года горад наведалі больш як 67000 турыстаў. І іх колькасць без сумневу да канца года павялічыцца ў некалькі разоў.

У 2005 годзе архітэктурна-культурны комплекс быў унесены ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Цяпер пры падтрымцы гэтай арганізацыі вядзецца праца над праектам віртуальнай рэканструкцыі бібліятэкі і архіваў Радзівілаў. Мэта праекта — узнаўленне архіва, які б адлюстраваў усе дакументы, што знаходзяцца не толькі ў Беларусі, але і ў Літве, Польшчы, Украіне.

Павел РАДЫНА
Фота аўтара

Вясёлка над Сожам

Фарбы жыцця — моваю танца імкнуліся перадаць удзельнікі V Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва "Сожскі карагод", які прайшоў у Гомелі.

З 1997 года, калі арганізатары "Сожскага карагода" ўпершыню выпраўлялі на арбіту свой новы праект, суправаджаючы яго асцярожным "паспрабуем...", фестываль прыкметна "набраў вагу". Змястоўнасць і годны арганізацыйны ўзровень дазволілі яму, як кажуць, застацца ў жывых пасля пазалеташняга ўпарадкавання фестывальнага руху ў краіне. Наогул, "Сожскі карагод" за мінулы час пацвердзіў сваю запатрабаванасць як свята прыгажосці і натхнёнага мастацтва, заваяваў аўтарытэт сярод сапраўдных аматараў танца і прафесійных харэографаў не толькі ў Беларусі, але і ў краінах бліжняга і далёкага замежжа.

Удзельнікамі сёлетняга, юбілейнага фестывалю сталі творчыя калектывы з Францыі, Эстоніі, Літвы, Латвіі, Украіны, Расіі, Беларусі, дэбютавалі на сцэнічных пляцоўках "Сожскага карагода" танцоры з Грузіі ды Польшчы. А ўводзінамі ў храм высокага мастацтва сталіся неўміручыя класічныя спектаклі "Лебядзінае возера" і "Шчаўкунчык", якія прывезлі ў Гомель артысты балета Марыінскага тэатра з Санкт-Пецярбурга.

З аншлагам прайшла цырымонія адкрыцця "Сожскага карагода". Імкненне і гамяльчан, і гасцей нашага горада стаць сведкамі яркай, відовішчнай імпрэзы выклікала небывалы ажыятаж: білеты ў распаўсюджвальнікаў скончыліся за некалькі дзён да фестывалю.

Уладальнікі "шчаслівых квіткоў", патрапіўшы ў той халаднаваты вераснёўскі вечар на Цэнтральны гарадскі стадыён, атрымалі ўражанні сапраўды незабыўныя. Пасля афіцыйных прывітанняў і пажаданняў, адрасаваных удзельнікам фестывалю, танцавальныя калектывы падчас маштабнага шоу, разгорнутага на зялёным полі стадыёна, захапілі ўвагу публікі. І шматлікім удзельнікам святочнай імпрэзы, і чароўнай спявачцы Ірыне Дарафеевай, што завяршала танцавальна-песенны парад, удалося напоўніць сэрцы гледачоў лагодным цяплом. А "кароннымі нумарамі" амаль дзвюхгадзіннай стадыённай дзеі сталі кампазіцыя "Рысавая даліна" ў кітайскіх матывах (водгулле Алімпіяды!) з удзелам 260 выхаванцаў харэаграфічнай школы ад 5 да 16 гадоў, відовішчная харэаграфічная замалёўка "Танец з барабанамі", майстэрскія акрабатычныя нумары артыстаў Гомельскага заслужанага цырка імя Абеля, а таксама кампазіцыя "Беларуская ваза", маляўнічыя элементы якой стварылі сотні маладых гамяльчан. У той вечар Гомель феерверкамі салютаваў гасцям і ўдзельнікам фестывалю, у шматколерную інтэрнацыянальную палітру якога арганічна ўпляліся фарбы горада-імяніннка.

(Працяг на стар. 10)

«Слуцкае Дабравесце» на сучасных носьбітах

У рамках святкавання славянскімі народамі 1020-годдзя Хрышчэння Русі Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і ЗП "Брыціш-Амерыкан Табака Трэйдзінг Кампані" былі рэалізаваны два знакавыя для беларускай культуры праекты. Першы — гэта тыражаванне кампакт-дыска з копіяй унікальнага рукапіснага помніка XVI стагоддзя "Слуцкага Дабравесця", а другі — перадача ў фонды бібліятэкі пяці старадрукаваных кніг. Стварэнне электроннай версіі Евангелля прайшло з бласлаўлення Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта і здзейснена ў цесным супрацоўніцтве з Інстытутам мовы і літаратуры ім. Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. З гэтай нагоды на пачатку верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы прайшла прэс-канферэнцыя.

Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай працы і сувязям з грамадскасцю Людміла Кірухіна прадставіла ўдзельнікаў прэс-канферэнцыі, а менавіта: Васіля Чэрніка — кіраўніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры краіны; клірыка Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора, айца Аляксандра Шымбалёва; дырэктара Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук, прафесара, доктара філалагічных навук Аляксандра Лукашанца; дырэктара НБ Беларусі, доктара педагагічных навук, прафесара Рамана Матульскага і начальніка аддзела па карпаратыўных сувязях ЗП "Брыціш-Амерыкан Табака Трэйдзінг Кампані" Сяргея Бурага.

Айцец Аляксандр Шымбалёў распавёў пра складаны лёс рукапіснай кнігі, напісанай князем Юры Алелькавічам, якая з'яўляецца сёння адной з духоўных святыняў беларусаў. Аляксандр Лукашанец адзначыў, што "такое выданне не толькі вяртае культурную спадчыну, але і працуе на будучае. Выданне помніка беларускага пісьменства на сучасных носьбітах, дазволіць карыстацца не толькі шырока зацікаўленым асобам, але больш за ўсё далучыць да духоўнай спадчыны моладзь, якая цудоўна валодае інфармацыйнымі тэхналогіямі".

"Любы вынік навуковай працы, — сказаў Раман Матульскі, — любыя пошукі, якія прыводзяць да таго, што знаходзяцца новыя кнігі, старадрукі — для бібліятэкі сапраўднае свята. Белых плям на кніжнай карце амаль не засталося. Усё, што збераглося, камусьці належыць. Таму для нас вельмі дарагія тыя падарункі, якія паступаюць у нашы фонды, дзякуючы падтрымцы "Брыціш-Амерыкан Табака Трэйдзінг Кампані".

Супрацоўніцтва з замежным прадпрыемствам пачалося ў 2004 годзе дабрачыннай акцыяй перадачы ў фонды Нацыянальнай бібліятэкі 39-ці унікальных рарытэтных выданняў XVII—XVIII стагоддзяў. Працягам работы стала сумесная праца над выпускам альбома "Рарытэты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі". І вось у гэтым годзе — выпуск электроннага дыска "Слуцкага Евангелля" і перадача ў дар яшчэ пяці рарытэтных старадрукаў XVII—XVIII стагоддзяў. Прадстаўнік кампаніі Сяргей Буры адзначыў, што ва ўсіх краінах, дзе працуе кампанія, яны "займаюць актыўную пазіцыю ў сферы падтрымання сацыяльна значных праектаў у галіне культуры і мастацтва".

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Свята ва універсітэце

На свеце шмат прафесій, але ёсць адна, якая робіць жыццё чалавека значным, напоўненым высакародным сэнсам. Бібліятэкар... Чалавек, для якога часткай жыцця становяцца людзі і кнігі.

Кніга не толькі крыніца ведаў, а найперш тое, што павінна ўшаноўвацца як нешта сакральнае. Зацікаўленасць той ці іншай кнігай ёсць, безумоўна, зацікаўленасць яе аўтарам, пранікненне чытачоў у яго ўнутраны свет.

Штогод 15 верасня адзначаецца прафесійнае свята супрацоўнікаў бібліятэк і чытачоў — Дзень бібліятэк. З гэтай нагоды ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў прайшоў Тыдзень бібліятэкі. Пачыналася свята сустрэчай з пісьменніцай Раісай Баравіковай. Адкрыла мерапрыемства дырэктар бібліятэкі Аксана Барысаўна Валодзіна. Р. Баравікова захапляльна расказвала выкладчыкам, студэнтам, супрацоўнікам бібліятэкі і універсітэта пра свой жыццёвы і творчы шлях. Вельмі яскрава прадстаўляла змест сваіх фантастычных празаічных твораў, па-майстэрску чытала свае вершы. Сустрэча атрымалася цёплай, цікавай, запамінальнай для ўсіх прысутных.

10 верасня бібліятэка ладзіла сустрэчу яшчэ з адным пісьменнікам — Сяргеем Клімковічам. Таленавіты майстар слова аўтар стварае цудоўныя кнігі сучаснай тэматыкі на рускай мове. Тым не менш, пісьменнік шмат гаварыў з аўдыторыяй на добрай літаратурнай беларускай мове. Вельмі цікава расказваў пра свае кнігі "Танцует осень», «Три строки о радости, три строки о грусти», «Забвение сердец» ды іншыя.

У рамках Тыдня бібліятэкі ва універсітэце было праведзена яшчэ шэраг цікавых мерапрыемстваў: фотапрэзентацыя "У аб'ектыве — бібліятэкі Чэхіі, Італіі"; навучальны семінар для выкладчыкаў, супрацоўнікаў універсітэта, студэнтаў "Інавацыйны экспрэс: доступ да Баз дадзеных віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі".

Завершаны святочны тыдзень быў прэзентацыяй "Гаворыць і паказвае бібліятэка..." На экране, у холе універсітэта, на працягу дня прэзентацыя раскрывала розныя напрамкі работы універсітэцкай бібліятэкі, цікавыя праекты, ідэі, якія рэалізуюцца яе творчым калектывам.

Супрацоўнікі бібліятэкі БДУКМ у Дзень бібліятэк прымалі віншаванні ад рэктара універсітэта, дэканаў факультэтаў, выкладчыкаў, студэнтаў і калег.

Таіса ГУРКО-СУПРАНОВІЧ,
вядучы метадыст
бібліятэкі БДУКМ

На здымку: фота на памяць з пісьменніцай Р. Баравіковай.

Маленькая справаздача для сяброў

У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылася творчая сустрэча з паэтам, сакратаром Саюза пісьменнікаў Беларусі, акадэмікам Акадэміі паэзіі, лаўрэатам Залатога Ясенінскага медаля Анатолем Аўруціным

2008 год для паэта юбілейны. Вялікі афіцыйны вечар, прысвечаны 60-годдзю Анатоля Аўруціна, прайшоў два месяцы таму, а сустрэча "Свет вечерний" (назва апошняга зборніка) у Траецкім насіла больш нефармальны характар. Сам Анатоль Юр'евіч назваў яе "маленькай творчай справаздачай для сяброў".

Так і атрымалася. Атмасфера адразу ўсталявалася сяброўская: амаль кожны з выступоўцаў пачынаў з жарту, з цікавай літаратурнай паралелі. Уладзімір Гніламёдаў пачаў з таго, што адзначыў усё большае і большае падабенства Аўруціна да Пушкіна: "Завёў ён нейкія пушкінскія бакенбарды, абсмуглеў, пакрыўся амаль экватарыяльным загарам". Працягам жа гэтага жарту быў самы сур'ёзны роздум пра стыль, сучаснасць праблематыкі і выкарыстанне літаратурнага вопыту ад Геракліта да савецкіх паэтаў у творчасці Анатоля Аўруціна. Увогуле, пра творчасць, пра тры новыя кнігі паэта ўсе казалі сур'ёзна. А выступалі на вечары Алесь Марціновіч, Анатоль Андрэеў, Мікола Шабовіч, Валянціна Паліканіна, Аляксандр Сакалоў і іншыя.

Сапраўдным адкрыццём сустрэчы сталі рамансы на вершы Анатоля Аўруціна. Камандаваў музычнам парадам Мікола Шабовіч. Менавіта яму належала ідэя пакласці гэтыя вершы на музыку. Ажыццявіў ён яе дзякуючы сябрам Дзмітрыю Пятровічу і Анатолю Міхальчэнкаву. Такім чынам, на афіцыйным вечары юбіляра былі выкананы два рамансы на яго вершы, а да "творчай справаздачы" нарадзіліся яшчэ чатыры. Для Анатоля Аўруціна гэта было сюрпрызам:

"Я быў упэўнены, што мае вершы абсалютна не песенныя. І нават у нейкай ступені ганарыўся гэтым, таму што мала ці зусім няма песень на вершы Блока, Ахматавай. Гэта значыць, сур'ёзных паэтаў на музыку пакласці складана. Сапраўдны паэт лічыць, што ён вышэй за паэта-песенніка. І тут з'яўляюцца рамансы... Але, дзякуй Богу, што ніхто не спрабуе пісаць на мае вершы папсу. Я думаю, што гэтага ніколі ні ў кога і не атрымаецца. А раманс — гэта ўсё ж такі асобны жанр у мастацтве..."

Асабліва кранальна прагучаў у той вечар раманс "Грушевка" (аўтар музыкі і выканаўца Анатоль Міхальчэнкаў). Добра знаёмы, уключаны ў школьныя падручнікі верш быў успрыняты слухачамі зусім па-новаму. Так творчасць Анатоля Аўруціна атрымала новую форму існавання, і гэта адзначылі многія госці.

Напрыканцы сустрэчы паэт прачытаў свае новыя, ненадрукаваныя творы.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Фота Кастуся Дробава

Спаконвечная традыцыя: гасцей, сяброў, родных і блізкіх сустракаць хлебам-соллю. Хлеб, як асноўная ежа, прысутнічае ў кожнай хаце. Мая бабуля гаворыць: "Калі ёсць хлеб, галадаць не буду". Кожны дзень на прылаўках з'яўляюцца новыя гатункі хлеба і цяпер нават самыя капрызліва-пераборлівыя гурманы змогуць выбраць хлеб сабе па густе.

Смак хлеба — беларускі!

"А які гатунак хлеба выбіраеце вы?" — з такім пытаннем я звярнуўся да жыхароў горада Мінска.

У адказ пачуў дзесяткі назваў: "Суражскі", "Водар", "Нарачанскі", "Траецкі", "Барадзінскі", "Сілічы", "Чэрвеньскі", "Вязынскі"...

Прычым таленавітыя беларускія хлебапёкі пастаянна вынаходзяць нешта новае. Зусім нядаўна на прылаўках з'явіўся надзвычай смачны хлеб "Белая Русь", пры выпечцы якога выкарыстоўваецца мёд.

Шмат хто выбірае белы хлеб з разынкамі, макам, карыцай, арэхамі... Словам, шматлікія вырабы можна падаваць сапраўды як ласунак. Напрыклад, у "Шчодрым" — і курага, і чарнасліў, і разынкі, і нават семкі! Хоць... некаторыя мілыя дамы, фанаткі розных дыет, пазбаўляюць сябе "хлебнай" асалоды: "Не ем хлеб, бо ад яго ж таўсцеюць!". Ім можна толькі паспачуваць.

Адзін з самых папулярных магазінаў беларускай сталіцы — "Свежы хлеб" Мінскага хлебазавода № 4, што на вуліцы Казінца. Прадаўцы Святлана Марціновіч і Алена Вайтовіч гавораць, што пакупнікоў у краме заўсёды шмат, а перад выхаднымі — дык і наогул, як кажуць, поўны аншлаг.

— Кожны дзень у асартыменце прадстаўлены больш як шэсцьдзесят гатункаў хлеба, батонаў, хлябцоў, дыетычных вырабаў, — распавядае прадавец Ала Богдан.

— *А якія гатункі найбольш хадавыя?* — запытаўся я.

— Як гаворыцца, на смак і колер... Але часцей усяго бяруць "Нарачанскі", "Сілічы", "Камароўскі". Да таго ж, у нас можна заказаць торт і нават вясельны каравай.

Шмат у якіх краінах, напрыклад, ва Украіне (Крымскае ўзбярэжжа) чорны хлеб — дэфіцыт! Нядзіўна, што беларусы бяруць з сабой на адпачынак па пяць боханаў свайго, "роднага" беларускага хлеба. Ды і я сам за два тыдні адпачынку ў Крыме вельмі засумаваў па нашым ні з чым не параўнальным хлебе.

Невыпадкова сябры і родныя з Масквы, Піцера ды іншых гарадоў блізкага і далёкага замежжа заўсёды просяць, каб мы прывозілі ў якасці гасцінца смачны беларускі хлеб.

Толькі вось, на жаль, шмат фірменна-беларускіх гатункаў хлеба называюцца... паруску. У назве ж таксама павінен быць нацыянальны каларыт! Хіба не?

Уладзімір ПАДАЛЯК

Фота аўтара

Класікі і сучаснікі ў адной серыі

Барысаў стаў першым горадам, які падчас Дня беларускага пісьменства атрымаў ад літаратараў з розных куткоў краіны больш як трыста кніг з аўтарскімі подпісамі. У гэты вялікі кніжны падарунак увайшлі пераважна выданні, што выходзілі цягам апошніх двух гадоў. Акрамя таго, ва ўрачыстай атмасферы свята старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец перадаў гораду 13 кніг з серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі". Падрабязней пра гэты літаратурны праект Мікалай Іванавіч распавёў карэспандэнту "ЛіМа".

— Адзін з напрамкаў, у якім працуе наша пісьменніцкая арганізацыя, — гэта выданне кніг. Тут нам, як кажуць, грэх скардзіцца. Толькі за мінулы год выйшла больш як 180 выданняў нашых аўтараў. Сёлетняе ўручэнне кніг у Барысаве гэта пацвердзіла. Безумоўна, яны розныя па аб'ёме і мастацкім ўзроўні. Летась з'явілася ўдалая ідэя — сумесна з выдавецтвам "Харвест" выдаваць кнігі ў серыі "Бібліятэка саюза пісьменнікаў Беларусі", — распавядае М. Чаргінец.

Серыя змяшчае як зборы твораў беларускіх класікаў, так і сучаснікаў. Распачаўся праект у канцы восені мінулага года выхадам кніг Янкі Купалы і Якуба Коласа, прымеркаваных да 125-годдзя з дня нараджэння беларускіх песняроў. Таксама выдадзена кніга твораў І. Чырнына, а неўзабаве чакаюцца выданні І. Шамякіна ды М. Танка. Літаратурная спадчына класікаў выдаецца важкімі фаліянтамі, а кнігі сучаснікаў — у звычайным фармаце, сярод іх выданні твораў У. Гніламёдава, А. Савіцкага, М. Чаргінца, А. Аўруціна, Г. Марчука, Ю. Фатнева, А. Марціновіча, В. Максімовіча, М. Ільінскага, А. Сульянава. У бліжэйшых планах — выхад кніг В. Лукшы, В. Праўдзіна ды многіх іншых пісьменнікаў.

— Праект нечакана выклікаў добры рэзананс. Я падараваў кнігі Янкі Купалы і Якуба Коласа ў бібліятэку ААН, і цяпер ужо шэсць універсітэтаў ЗША просяць выслаць ім гэтыя выданні.

Усяго ў "Бібліятэцы Саюза пісьменнікаў Беларусі" выйшла 15 кніг. Сёлета плануецца выдаць яшчэ каля дзесятка. А ў наступным годзе гэта лічба павялічыцца да 60—70 выданняў.

— Гэтая бібліятэка будзе шматкніжнай. І высветлілася, што ў свеце няма ніводнай пісьменніцкай арганізацыі, якая ажыццяўляла б такі праект. Мы падаравалі гэтыя наборы кніг шэрагу пасольстваў, міністэрстваў, ведамстваў, з якімі супрацоўнічаем, усім абласным і мінскаму гарадскому выканкамам. Першыя шэсць тамоў мы перадалі і Нацыянальнай бібліятэцы, неўзабаве збіраемся ва ўрачыстай атмасферы ўручыць астатнія. Кнігі выклікалі вялікую цікавасць. Аднак людзі па-рознаму ўспрынялі падарунак. Многія даслалі нам цёплыя лісты з падзякай і нават з прапановай набыць гэтыя кнігі. Некаторыя нам не адказалі і, як высветлілася, перадалі выданні мясцоваму аддзяленню Саюза пісьменнікаў. Ёсць пэўнае непаразуменне. Але падарунак выклікаў пераважна станоўчую рэакцыю. Мы атрымалі вельмі цёплы ліст ад Мітрапаліта Філарэта, у якім, у прыватнасці, ёсць такія словы: "Кнігі з серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі", якія Вы перадалі, вылучаюцца годным выкананнем, а імёны іх аўтараў — вядомых і паважаных майстроў слова — гавораць самі за сябе. Гэтыя выданні зоймуць пачэснае месца ў нашай бібліятэцы".

М. Чаргінец выказаў надзею, што серыя прыцягне ўвагу не толькі чытачоў, але крытыкаў і літаратуразнаўцаў.

Саша ДОРСКАЯ

Фота Кастуся Дробава

На службе міру і прагрэсу

Беларускія кнігавыдаўцы і кнігараспаўсюджвальнікі прынялі ўдзел у XXI Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая прайшла пад дэвізам "Кніга на службе міру і прагрэсу". Дарэчы, менавіта сёлетняя ММКВК за ўсе тры дзесяцігоддзі свайго існавання — самая прадстаўнічая: звыш 2500 удзельнікаў з 32 краін блізкага і далёкага замежжа, якія прадэманстравалі звыш 180 тысяч найменняў кніжнай і іншай друкаванай прадукцыі.

Экспазіцыя Нацыянальнага стэнда Рэспублікі Беларусь складалася больш як з 800 найменняў кніжных выданняў па ўсіх тэматычных напрамках. Прадпрыемствы кніжнага гандлю — "Белкніга", "Брэсткніга", "Віцебскаблкніга", "Гроднакніга", "Гомелькніга" — таксама ўдзельнічалі ў кніжным форуме.

Беларуская дэлегацыя ўдзельнічала ў пасяджэнні "круглага стала" "Украіна—Расія—Беларусь: грані супрацоўніцтва", а таксама ў дзвюх цырымоніях узнагароджання кніг-лаўрэатаў: па выніках V Міжнароднага конкурсу "Мастацтва кнігі" дзяржаў-удзельніц СНД (па шасці намінацыях беларускія выданні адзначаны дзевяццю ўзнагародамі) і па выніках IV Агульнарасійскага конкурсу "Універсітэцкая кніга" (узнагароды атрымалі выдавецтва "Вышэйшая школа" і Выдавецкі цэнтр БДУ).

Абмяркоўвалася пытанне ўдзелу Беларусі ў статусе Ганаровага госця на адной з наступных ММКВК альбо на Нацыянальнай выстаўцы-кірмашы "Кнігі Расіі".

Дар'я ЦАРЫК

Слову «дажынкі» — новы сэнс

Добрая справа распачалася ў мінулым годзе на Гомельшчыне — тут упершыню былі наладжаны агледзіны напісанага і выдадзенага членамі абласной пісьменніцкай арганізацыі. Свята афіцыйна мела назву "Літаратурныя дажынкі-2007". Сёлета, напярэдадні Дня беларускага пісьменства, пры падтрымцы Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, свята было замацавана як традыцыйнае. Яно нават пашырыла свае межы: на працягу двух дзён у Гомелі і вобласці адбыліся "Славянскія літаратурныя дажынкі-2008".

У грамадска-культурным цэнтры пісьменнікаў Беларусі, Украіны і Расіі шчыра віталі старшыня абласнога Савета дэпутатаў Валерый Сяліцкі, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы аблвыканкама Анатоль Каціла, старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч і іншыя.

Ва ўрачыстай атмасферы адбылося ўзнагароджванне пераможцаў другога абласнога літаратурнага конкурсу імя Кірылы Тураўскага, а таксама абласных літаратурных конкурсаў, прысвечаных 70-годдзю Гомельскай вобласці і 70-годдзю Анатоля Грачанікава. Дыпломамі і каштоўнымі падарункамі былі адзначаны Тамара Кручэнка і Лілія Чарненка, якім прысуджана першае месца ў намінацыі *"Лепшы паэтычны зборнік"*. Сярод пачынаючых аўтараў такую ж узнагароду атрымалі з рук начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Яўген Семянкоў з Кармы і Таццяна Нілава з Гомеля. Ушанаваны былі і аўтары, якія занялі другія месцы ў конкурсе.

Старшыня абласной пісьменніцкай арганізацыі Уладзімір Гаўрыловіч узнагародзіў граматамі і каштоўнымі падарункамі юных празаікаў Вераніку Ляўчук і Марыю Маліноўскую, якія прызнаны пераможцамі ў абласным літаратурным конкурсе, прысвечаным 70-годдзю Гомельскай вобласці, а таксама Уладзіміра Чараухіна і Аляксандра Бараноўскага, якія сталі лепшымі ў паэтычным конкурсе памяці Анатоля Грачанікава. Таксама ён паведаміў, што сёлета да Дня славянскага пісьменства, што адзначалася ў маі, было прынята рашэнне аб прысуджэнні Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага пісьменніку Расіі Сцяпану Кузькіну, якая ўручана яму гомельскай пісьменніцкай дэлегацыяй на міжрэгіянальным свяце "На зямлі Баяна" ў старажытным Трубчэўску.

Тут жа адбылася невялікая прэзентацыя школы юнага літаратара абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі: выхаванцы Ніны Шкляравай чыталі вершы, распавядалі пра свае выступленні перад чытачамі. Для ўдзельнікаў і гасцей свята быў наладжаны канцэрт, які быў падрыхтаваны ўпраўленнем культуры Гомельскага аблвыканкама.

Пісьменнікі Беларусі, Украіны, Расіі наведаліся ў спецыялізаваную Славянскую бібліятэку, пабывалі ў музеі рэдкай кнігі абласной універсальнай бібліятэкі імя У. Леніна. Тут жа прайшла творчая акцыя "Славянскае літаратурнае братэрства". Старшыня абласной пісьменніцкай арганізацыі Уладзімір Гаўрыловіч прэзентаваў калектыўны твор аўтараў вобласці — да свята выйшлі з друку сігнальныя экземпляры двух тамоў альманаха "Літаратурная Гомельшчына". Цікавая дэталь: у зборніках асобна змешчаны паэтычныя і празаічныя творы не толькі літаратараў Гомельшчыны, але і пісьменнікаў Браншчыны, Чарнігаўшчыны, Куршчыны і Сумскай вобласці Украіны. Аб дзейнасці Міжнароднай літаратурнай арганізацыі "Славянскія званы", аднайменнага літаратурнага альманаха распавялі паэты Веніямін і Алег Саранскія. Прэзентавалі свае творы ўкраінскія паэты Анатоль Міроненка, Лілія Бандарэвіч-Чарненка, гомельскія пісьменнікі Юрый Фатнеў, Аляксандр Джад, Ніна Шкляра ва, Лідзія Возісава, Ганна Атрошчанка, Міхась Сліва, Тамара Кручэнка, Лілія Вялічка, Аляксандр Каляда, Генадзь Говар, Ева Дударга. Дарэчы, набыткам гомельскіх пісьменнікаў за бягучы год — амаль дваццаць новых кніг.

Вечарам таго ж дня ў гарадскім цэнтры культуры адбыўся вечар памяці паэта-земляка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Анатоля Грачанікава, прысвечаны яго 70-годдзю. Прыйшлі сюды родныя паэта, сябры, прыхільнікі творчасці. Кранаючым было выступленне аднакурсніка і сябра Ігара Палешука. Вядучая вечарыны паэтэса Лідзія Возісава адзначана граматай аддзялення СПБ за актыўную прапаганду творчасці выдатнага беларускага паэта.

Назаўтра на радзіме паэта ў вёсцы Шарпілаўка каля бацькоўскай хаты была пранізлівая сустрэча пісьменнікаў Гомельшчыны, Украіны і Расіі з братамі Грачанікавымі — гамяльчанамі Генадзем і Леанідам, а таксама Рыгорам, які прыехаў з Сімферопаля. У двары мясцовай школы адбыўся вечар, прысвечаны 70-годдзю паэта. У вянок Анатолю Грачанікаву чыталіся беларускія, рускія, украінскія вершы, выконваліся песні на мовах братніх народаў.

У спецыялізаванай Славянскай бібліятэцы адбылося падвядзенне вынікаў "Славянскіх літаратурных дажынак-2008": прадстаўнікі пісьменніцкіх арганізацый Беларусі, Украіны і Расіі выказаліся за далейшы працяг творчых літаратурных кантактаў і абменаў. Прыняты зварот да кіраўніцтва вобласці аб падтрымцы ініцыятывы пісьменнікаў Гомельшчыны па правядзенні "Славянскіх літаратурных дажынак" у наступныя гады. У бліжэйшы час у Бранску, Курску і Глухаве будуць падпісаны пагадненні аб літаратурным супрацоўніцтве паміж пісьменніцкімі структурамі рэгіёнаў.

Уладзімір ПРЫАЗЁРНЫ

На здымку: гомельскія творцы на малой радзіме А. Грачанікава.

Кветкі Ф. Скарыне

Побач з будынкам Нацыянальнай бібліятэкі адбылася ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак да помніка Ф. Скарыне з нагоды Дня бібліятэк.

Нягледзячы на кепскае надвор'е, свята сабрала даволі шмат прыхільнікаў беларускай кнігі. У асноўным, праўда, каля помніка першадрукару згуртаваліся не шараговыя чытачы, а бібліятэкары амаль з усіх рэгіёнаў краіны. З прывітальным словам выступіў намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Віктар Кураш. Прачула і ўзнёсла гаварыла пра нялёгкую бібліятэкарскую працу дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А. Пушкіна Наталля Чуева. Наталля Станіслававуна адзначыла, што з Днём бібліятэк Беларусь павіншавалі ўжо і краіны-суседкі — Расія, Польшча і Украіна. Такім чынам, падзея гэтая выходзіць з рэчышча нацыянальнага і становіцца набыткам еўрапейскім. Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі павёў гаворку пра самую сутнасць прафесіі бібліятэкара: "У гэты святочны дзень мы мусім задаць сабе пытанне: «Навошта мы ёсць?»" — звярнуўся да прысутных ён. І тут жа даў свой адказ: "У сённяшнія нялёгкія часы бібліятэкар павінен займацца захаваннем культурнай спадчыны Беларусі". Начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Уладзімір Карачэўскі дадаў, што "бібліятэка з'яўляецца гарантам маральнага і духоўнага здароўя нацыі".

Суправаджаліся віншавальныя прамовы народнымі мелодыямі ў выкананні каларытных музыкаў, апранутых у нацыянальныя касцюмы. Свята працягнулася ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе адбыўся канцэрт, у межах якога лепшыя бібліятэкары краіны атрымалі заслужаныя ўзнагароды.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Вернасць двум жанрам

У апошні дзень лета сваё 60-годдзе адзначыў пісьменнік Васіль Шырко. 60 гадоў — немалы шлях, жыццёвы і творчы. А яшчэ гэта нагода, каб падсумаваць дасягненні, прыгадаць, магчыма, і няўдачы.

Васіль Аляксандравіч нарадзіўся ў вёсцы Чурылава, што на Уздзеншчыне. Чурылава — гэта не толькі назва вёскі, але і вызначэнне чалавека, лічыць сам пісьменнік. Чурылавец — значыць вясёлы, дасціпны чалавек, які вылучаецца на фоне астатніх. Нездарма Васіль Аляксандравіч і сваю кнігу гумару назваў "Вунь чурылавец пайшоў". З гэтай вёскі паходзіць яшчэ адзін пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Алесь Якімовіч.

Бацька, Аляксандр Шырко, быў чалавекам унікальнай памяці. Ён ведаў каля 200 вершаў і 20 паэм. І чытаў гэтыя творы нават у канцлагеры Асвенцім, адкуль цудам удалося выратавацца. На тэлебачанні двойчы запісвалі перадачы з яго ўдзелам. А пасля прыходзілі сотні лістоў, у якіх прасілі тыя перадачы паўтарыць. Бацька і жаданне сына пісаць успрыняў станоўча. А вось маці не спадабаўся занятак, які выбраў Васіль. Яна і сёння не разумее сына.

Пасля школы Васіль паступіў на факультэт журналістыкі БДУ. А за тыдзень да абароны дыплома яго забралі ў войска. Накіравалі ў будаўнічы батальён у Маскву.

— Капаем мы нешта ў цэнтры Масквы, — распавядае Васіль Аляксандравіч. — І раптам пад'язджае чорная "Волга". З яе выходзіць падпалкоўнік. Выклікае мяне. "Здравия желаю, товарищ сержант!" — "Не сержант, а рядовой," — "Сержант, пойдёшь работать в нашу газету!" Да гэтага я даслаў пару нарысаў ім. Так я атрымаў званне і мяне забралі ў газету Міністэрства абароны СССР. Там адпрацаваў два гады. Пасля мне прапанавалі застацца ў Маскве жыць. Але я адмовіўся і вярнуўся ў Беларусь.

У Беларусі Васіль Шырко ўладкаваўся ў "Сельскую газету" (сёння "Белорусская нива"). Гэта было шчасцем, прызнаецца пісьменнік, працаваць з такімі літаратарамі, як Святлана Алексіевіч і Анатоль Казловіч. Затым яшчэ была праца на тэлебачанні, у часопісе "Полымя".

"Калі я чаго і дасягнуў у творчасці, — адзначае Васіль Аляксандравіч, — то ў публіцыстыцы і казках". За кнігу нарысаў "Зямлі бацькоўскай прыцягненне" яго прынялі ў Саюз пісьменнікаў. За кнігу "Беларусь маладая" (разам з сааўтарамі) атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь. Кніжак казак у пісьменніка выйшла дзве. Першая "Дзед Манюкін не салжэ" выйшла накладам 52 тысячы (!) асобнікаў. За лічаныя дні яна была раскуплена. Ёсць попыт і на другую кніжку "Дзед Манюкін і ўнукі".

У літаратуры часта здараецца, што пісьменнікі пішуць казкі пакуль свае дзеці малыя, ці калі ўнукі з'яўляюцца. А Васіль Шырко піша ў першую чаргу для сябе. І адзначае, што рабіць гэта трэба з душой, ні на каго не азіраючыся. Ды прыводзіць выпадак з творчага жыцця Васіля Шукшына.

— Калі ён пісаў "Калину красную", аднойчы ўначы разбудзіў сваю жонку тым, што плакаў. На пытанне "што здарылася?" ён адказаў: "Такога чалавека забілі!..", маючы на ўвазе героя свайго твора.

І сам Васіль Аляксандравіч распавядае, што падчас працы над казкамі можа не толькі рассмяяцца, а нават і слязу пусціць. А вось з чаго ён пачаў пісаць прозу для дарослых.

— Мяне адправілі ў камандзіроўку ў Мазыр. І я вырашыў напісаць нарыс пра партызана. Сюжэт быў такім. Іван Васільевіч Храменка ў адной з вёсак Акцябрскага раёна, акупіраванай немцамі, вывесіў савецкі сцяг. А здымаць яго прыехаў нямецкі афіцэр. Рвануў сцяг (а да яго было прыладжана выбуховае прыстасаванне) і немца разарвала на шматкі. А афіцэр быў вядомы самому Гітлеру. У выніку 20 чалавек са сваякоў Івана Васільевіча расстралялі (нехта бачыў як ён вывешваў сцяг). Партызан злавіў паліцая, які камандаваў расстрэлам і адсёк яму рукі. А ўжо пасля Перамогі Іван Храменка ў Мазыры пачуў: "Людзі добрыя, дапамажыце. Немчура праклятая пакалечыла мяне". Глядзіць, а гэта той паліцай просіць міласціну. Сустрэліся позіркамі. Былы паліцай падхапіўся і пабег прэч... Так я захапіўся, што напісаў дакументальную аповесць. Прапанаваў на ацэнку твор Яўгену Лецку. Пасля яго заўваг на 2/3 твор скараціў, нешта змяніў, нешта дадаў. Двойчы перапісаў. А потым аднёс у часопіс "Маладосць". Праз месяц патэлефанаваў рэдактару Уладзіміру Дамашэвічу — папрасіў яго выказацца адносна аповесці. Рэдактару твор спадабаўся. Так з'явілася "Зелле ад скрухі". Праўда, эпізод пра адсечаныя рукі ў часопісным варыянце апусцілі.

Нягледзячы на дасягнутыя вышыні, пісьменнік шмат ад задуманага яшчэ не зрабіў. Прычына? Сам Васіль Аляксандравіч спасылаецца на словы Марка Твэна, што пісьменнік можа быць любой прафесіі, за выключэннем журналіста. Маўляў, журналістыка — чорны хлеб літаратуры.

Сёння Васіль Шырко працуе адразу над некалькімі кнігамі нарысаў пра беларускія лясгасы. А яшчэ трымае ў памяці каля дваццаці сюжэтаў для новых апавяданняў і аповесцяў.

З нагоды юбілею на яго роднай Уздзеншчыне адбылася ўрачыстая вечарына. У Зенькавіцкі сельскі Дом культуры павіншаваць Васіля Аляксандравіча прыехалі калегі па пяры — Рыгор Сакалоўскі, Алесь Карлюкевіч, Алесь Марціновіч, Анатоль Аўруцін.

Юбіляр чытаў свае творы, гучалі і яго вершы, напісаныя яшчэ ў юнацкія гады. Тады, у 1960-х, Васіль Шырко дэбютаваў як паэт на старонках газеты "Чырвоная змена" і часопіса "Маладосць". Але з паэзіі пераключыўся на публіцыстыку і прозу.

Паміж выступленнямі гасцей гучалі песні. Даўно вядомыя па-руску, яны загучалі на беларускай мове ў перакладзе юбіляра.

У дзень нараджэння Васіль Шырко быў узнагароджаны званнямі ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў.

Дзмітрый БЕРАЖНЫ
Фота аўтара

Каб зберагчы і захаваць

Падвялі вынікі раённага агляду-конкурсу "Гісторыя маёй бібліятэкі" ў Уздзенскай ЦБС. У гэтым конкурсе прынялі ўдзел 17 сельскіх бібліятэк і бібліятэк-клубаў. Сёння бібліятэку сапраўды можна назваць гістарычнай памяццю вёскі, бо сельскія бібліятэкары робяць усё, каб зберагчы памяць пра сваё мінулае. Тут створаны краязнаўчыя фонды літаратуры, дзе значнае месца адводзіцца матэрыялам перыядычных выданняў, архіўныя дакументы, фотаздымкі. Уключаны сюды і звесткі з гісторыі мясцовасці, пра пісьменнікаў-землякоў, пра жывёльны і раслінны свет.

Конкурс быў прымеркаваны да 30-годдзя з дня стварэння цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, арганізатарам выступіў аддзел бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ.

Першае месца атрымала Прысынкаўская сельская бібліятэка, бібліятэкар Таццяна Бойка. Бібліятэка, у якой цяпер працуе Таццяна Антонаўна, пачала сваё існаванне ў 1927 годзе. Загадчыкам у той час працаваў будучы вядомы самадзейны кампазітар Павел Іванавіч Шыдлоўскі. У семнаццаць гадоў пасля няшчаснага выпадку ён страціў зрок і ўладкаваўся ў хату-чытальню, дзе, акрамя выдачы кніг, праводзіў розныя цікавыя мерапрыемствы з моладдзю. У 1949 годзе пасаду бібліятэкара займаў пісьменнік, абаронца Брэсцкай крэпасці Алесь Махнач. Сёння ў бібліятэцы створаны этнаграфічны гурток "Запрашаем у даўніну", дзе шырока прадстаўлены рэчы хатняга ўжытку, тканыя абрусы і ручнікі, посцілкі, вышываныя сурвэткі, лапці, сялянская вопратка. Пры бібліятэцы працуе экалагічны клуб "Сябры прыроды" для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

Другое месца атрымала Лашанская сельская бібліятэка, дзе на працягу 36 гадоў працуе Людміла Салавей. З ахвотай і задавальненнем Людміла Васільеўна ўключылася ў работу, бо ёй было пра што расказаць і што паказаць. У бібліятэцы дзейнічае выставачная зала, дзе пачэснае месца займаюць карціны мясцовага мастака Івана Салаўя, творы маладой таленавітай мастачкі Ганны Радзькоўіч, вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мясцовых умельцаў. Менавіта тут адбываюцца знакавыя для ўсіх вяскоўцаў сустрэчы, урокі гісторыі і літаратуры для сельскіх школьнікаў.

Спадабалася журы і работа Хатлянскай сельскай бібліятэкі, у якой працуюць Алена Зубава і Ала Гільміярава. Яны занялі трэцяе месца. Гэтую культурную ўстанову наведвае больш як 500 чытачоў з 14 вёсак сельскага Савета. Створаны краязнаўчы цэнтр "Край чароўны сэрцу дарагі", для маленькіх наведвальнікаў — дзіцячы пакой з вялікай кніжнай выставай "Куды не пойдзеш — цуды знойдзеш". Аформлены цэнтр нетрадыцыйнай медыцыны, дзе сабраны кнігі са старадаўнімі рэцэптамі, выразкі з перыядычных выданняў.

Бібліятэкарамі раёна была праведзена вялікая работа, і як вынік яны сабралі тэматычныя папкі "Гісторыя маёй бібліятэкі", якія з цягам часу будуць папаўняцца новымі дакументамі. Жыццё не стаіць на месцы, яно працягваецца, а таму будзе працягвацца і гісторыя роднай старонкі, гісторыя бібліятэчнай дзейнасці.

Аксана ДРАЧАН,
метадыст Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса

Неабыякавыя нататкі

Найпершая ўмова прагрэсу

У XXI стагоддзі ў некаторых установах культуры, адукацыі нярэдка забываецца, здавалася б, простая аксіёма — неабходнасць патрыятычнага выхавання.
І не толькі падрастаючага пакалення, але ўвогуле грамадзян краіны.

Нам нельга забываць, што патрыятызм непасрэдна ўплывае на прагрэс грамадства, у якім жывём. Само ўзнікненне патрыятычнай свядомасці — гэта надзвычай працяглы гістарычны працэс, развіццё якога праходзіла як паступальны рух ад ніжэйшага да вышэйшага, ад простага да больш складанага, як шлях духоўнага прагрэсу. Сучасны ж патрыятызм мы павінны разглядаць не як нейкі інстынкт ці настальгію па мясцінах, дзе нарадзіліся, а як высокаразвітае сацыяльнае пачуццё, якое выразна паказвае не толькі прыхільнасць чалавека да малой і вялікай Бацькаўшчыны, да навакольных мясцін, пэўнага грамадскага асяроддзя, але і яго палымянае жаданне змагацца за пераўтварэнне нацыянальнага жыцця на карысць суайчыннікаў. І, дарэчы, сувязь паміж асобай і асяроддзем — гэта не геаграфічная і выпадковая сувязь, а жыццёвая, духоўная і свяшчэнная. Нам трэба цалкам усвядоміць, што сапраўдным патрыятызмам быў і застаецца менавіта патрыятызм народных мас, паколькі ён заўсёды ўключаў і ўключае ў сябе палітычны і грамадзянскі змест: адносіны да эканамічных, сацыяльных і палітычных умоў краіны з пункта гледжання грамадскага прагрэсу. Мы павінны выхоўваць, асабліва ў падрастаючага пакалення, пачуццё нацыянальнага гонару за сваю краіну. Праяўленне патрыятызму ў сучасным грамадстве — гэта не столькі перажыванне, колькі свядомы акт, скіраваны на ўмацаванне велічы і магутнасці маладой суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь.

Мастацтва — таксама з'ява грамадская. Яно цесна звязана з патрыятызмам і абавязана, асвойваючы ўсё больш шырокія сферы духоўнага жыцця, садзейнічаць сцвярджэнню разнастайных патрыятычных ідэй. У мастацтве павінны быць зусім не выпадковымі тэмы грамадзянскага абавязку, перамогі грамадскага пачатку над асабістым, гераізму, доблесці, маральнай чысціні. Сучасныя творы павінны ператварацца ў надзейныя сродкі мастацкага асэнсавання значных праблем агульнанацыянальнай вартасці.

Творчасць сапраўднага мастака надзейна служыць Бацькаўшчыне. Рэмбрант казаў: "У айчыне ты адкрываеш так шмат мілага сэрцу, прыемнага і вартага, што, як толькі гэта адчуеш, то палічыш жыццё занадта кароткім". Святое пачуццё роднай зямлі заўсёды адлюстроўвалася ў мастацтве як неад'емная якасць кожнага сумленнага мастака. Мастацтва і павінна найперш абуджаць любоў да роднай зямлі. Бо любоў да роднага і блізкага — надзейная крыніца высакародных пачуццяў чалавека. Спачатку — прыхільнасць да мясцін маленства і юнацтва, потым — разуменне сувязі з усёй Беларуссю, яе мовай, гісторыяй і культурай, імкненне аддаваць усе свае сілы і здольнасці на карысць Бацькаўшчыне. Важна, каб патрыятызм праяўляўся не толькі ў пачуццях, але ў дзеяннях і ўчынках чалавека.

Высокая каштоўнасць глыбокапатрыятычнага мастацтва — у яго магчымасці несці людзям радасць і эстэтычна ўзбагачаць жыццё. Менавіта чалавечнасць, перададзеная ў высокамастацкіх формах, заўсёды складае падмурак сапраўднага мастацтва. Як разумна выказаўся вялікі Радэн: "Прыгожым сам па сабе малюнак быць не можа, а прыгожыя толькі тыя ісціны і тыя пачуцці, якія ён паказвае".

Канстанцін КАРНЯЛЮК

З Беларуссю лёс звязаў

Рыгор Сакалоўскі, пісьменнік, журналіст, не бачыць вялікай розніцы паміж гэтымі прызваннямі, а галоўнай меркай якасці тэксту лічыць не "дзесяцігоддзі работы ў галіне", а менавіта талент.

Нашага карэспандэнта старшыня Мінскай абласной арганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі, намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў прымае ў працоўным кабінеце ва ўтульным асабнячку ў цэнтры сталіцы.

Першыя дэсанты

Літаратурай Рыгор Васільевіч пачаў займацца рана. У шостым класе юнак апублікаваў верш у раённай газеце на Палтаўшчыне. Як прыйшоў першы ў жыцці ганарар, з тых грошай усяму класу купіў па шклянцы чаю і печыва. Так і набыў прыхільнікаў сваёй творчасці — аднакласнікаў, якія, дзякуючы за пачастунак, падахвочвалі: "Пішы часцей!"

Сярод куміраў Сакалоўскага напачатку былі даўно прызнаныя класікі — Пушкін, Лермантаў, Гогаль... Неўзабаве юнак знайшоў ва Украіне "Глыбокую плынь" Івана Шамякіна — і з гэтай кніжкі пачалося ў яго непарыўнае сяброўства з беларускай літаратурай.

— Тады і падумаць не мог, што пройдуць гады, і я апынуся ў Мінску, пазнаёмлюся з класікам, і ён дасць мне рэкамендацыю для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў ды напіша прадмову да маёй кніжкі "Строки любви", — прызнаецца Рыгор Васільевіч.

А тады... тады былі шматлікія допісы ў раёнку, рэдактарства першай газеты — школьнай насценнай, а пасля заняткаў — паходы ў кнігарню, у секцыю паэзіі. Вядома, пасля школы вырашыў паступаць у Кіеўскі універсітэт на журналістыку, але... атрымаў па сачыненні "двойку".

— Мінуў час, мяне прызвалі ў армію. І я трапляю ў Беларусь, у Бабруйск, у 147-ю брыгаду. І пішу ў газету "Во славу Родины". А потым — паступаю ў Львоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча Савецкай Арміі і Ваенна-марскога флоту, таксама на факультэт журналістыкі, — прыгадвае Рыгор Васільевіч. — Пасля вучылішча было размеркаванне, і я патрапіў на Далёкі Усход, дзе ўпершыню давялося панюхаць пораху: то былі часы вядомага канфлікту Савецкага Саюза з Кітаем на востраве Даманскім.

Аднак неўзабаве лёс вяртае яго ў Беларусь — пад Віцебск, у знакамітую 103-ю віцебскую паветрана-дэсантную дывізію, дзе здзейсніў свой першы прыжок, дзе знайшоў сваё каханне, дзе ў яго вырастуць дзеці, унукі...

Тым часам, дэсантнік Сакалоўскі працягвае пісаць у газету "Во славу Родины". Потым — Афганістан, дзе стаў першым рэдактарам, які выпусціў шматтыражную газету на рускай мове. Пасля па замене паехаў у Тулу, а потым скончыў рэдактарскае аддзяленне Ваеннай акадэміі імя У. І. Леніна і па размеркаванні трапіў зноў у Мінск.

Дзе вуліцы ў гонар беларусаў?

Рыгор Сакалоўскі — чалавек, які перажыў усе ломкі і палітычныя ператрусы: ён быў дваццатым рэдактарам газеты "Во славу Родины" Чырванасцяжнай беларускай ваеннай акругі — і першым рэдактарам газеты "Во славу Родины" Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Пра сябе ён кажа: "Я з Палтаўшчыны, літаратурнае Меккі Украіны. Адтуль выйшлі Рыгор Скаварада, Іван Катлярэўскі, Гогаль, Ганчар, Барыс Алейнік — вельмі шмат літаратурных славутасцей. Да таго ж, шмат у якіх іншых мясцінах, звязаных з пісьменніцкімі геніямі, даводзілася жыць: з Украіны трапіў у Ясную Паляну. Тут жыў Талстой, тут Чэхаў любіў бываць у гасцях у Тургенева. Потым — Тула. Там ідзеш — і на доме напісана: "Тут працаваў стацкім дарадцам Салтыкоў-Шчадрын". Альбо стаіць помнік Ляскову — гэткі ж высокі, як і помнік Леніну. Альбо на вакзале мемарыяльныя дошкі: тут Тургенеў сустракаўся з Талстым, праязджаў Бунін, як ехаў да сябе ў Варонеж... Ці Дом афіцэраў, а на ім шыльда: "Тут праходзіў афіцэрскі сход, у якім браў удзел Талстой". І стаіць більярд — той самы!"

— Як лічыце, Беларусі, пэўна, такога пашанотнага стаўлення да класікаў бракуе?

— Аднойчы я паехаў у творчую камандзіроўку на Мядзельшчыну, на радзіму Максіма Танка — даведацца, як ушаноўваецца яго памяць. Магіла была большменш дагледжанай. Прыязджаем на хутар, а там яго дом, дзе цяпер яшчэ жыве яго брат, і назіраем наступную карціну... Шыбы павыбіваныя. Ляжаць кнігі — з аўтографамі! — зацвілыя. А дарога — бруд, вада...

Ну чаму нельга зрабіць той жа турыстычны маршрут, гэта ж Мядзельшчына! Там няшмат грошай трэба. Можна дарогу пракласці — хоць бы гравійку, будынак адрамантаваць, даць якую стаўку брату класіка, зрабіўшы яго захавальнікам дома-музея... Што за адносіны да класікаў?! Часам уражанне складваецца, што на Беларусі памятаюць толькі двух літаратараў — Янку Купалу і Якуба Коласа. Па некаторых імёнах — то помніка на магіле няма, то няма ніводнай вуліцы, названай у гонар выбітнай асобы.

Напрыклад, я жыву на Паўднёвым Захадзе, і там вуліца — Алібегава. Я нічога супраць гэтай персоны не маю. Але чаму тут няма, напрыклад, вуліцы Шамякіна? Самыя лепшыя вуліцы названы імёнамі прадстаўнікоў іншых краін. А нашы... Узяць нават партыйных дзеячаў нашых. Узгадайма вуліцу Мазурава — яна ж ля самай кальцавой дарогі... А павінны быць вуліцы ў гонар беларусаў. Іх многа — тых, хто зрабіў агромністы ўнёсак у культуру, літаратуру, ва ўсе сферы жыцця.

Не трэба нікога «рубіць»

З вышыні жыццёвага шляху далёка не ўсё бачыцца ясна, лічыць мой суразмоўца: "Які б ты досвед не меў, усё залежыць ад таленту, які табе даў Бог".

— А цяпер прыходзяць да мяне людзі — у 80, у 85 год прыносяць свае тэксты: чалавек пачынае пісаць вершы, падае заяву на ўступленне ў Саюз пісьменнікаў. Не хачу і не магу казаць за ўсе выпадкі, але часам паглядзіш на тыя вершы — ані паэтыкі, ані рыфмы... А адмовіць цяжка, бо чалавек сапраўды заслужаны, ветэран.

Рыгор Сакалоўскі выступае за баланс узростаў сярод членаў Саюза пісьменнікаў. Пакуль, прызнаецца ён, ідэальная прапорцыя не дасягнута: "Сталых прымаем, а моладзі ў нас мала. А без моладзі, вядома ж, аніякая справа спорыцца не будзе".

— А сістэма выяўлення і заахвочвання талентаў — ці адэкватная яна патрабаванням часу?

— Мне падаецца, трошкі мы закасцянелі. Прызвычаіліся, што надрукавана — гэта значыць, на паперы, і — усё. А трэба ж і ў Інтэрнет зазірацьі...

— Але ж, згадзіцеся, у тым жа Інтэрнеце большая частка тэкстаў выбіваецца з, так бы мовіць, фармату, у якім ствараюць, прынамсі, пісьменнікі вашага пакалення...

— Ёсць моладзь, якая піша без рыфмы, без анічога. Яны лічаць, што ўсё, што прадстаўляем мы, даўно састарэла, што літаратура павінна развівацца па іншых законах. Мне здаецца, не трэба іх "рубіць": усё правільна, няхай літаратура развіваецца. Час адсее тое, што было звычайным графаманствам, а шэдэўры застануцца на вякі.

Нядаўна быў вялікі паэтычны конкурс у Маскве, і там перамагла беларуская дзяўчынка з-пад Слуцка. Сульянаў падняўся і кажа: чаму, з якой прычыны мы яе не заўважылі? Магчыма, нехта яе тут пакрыўдзіў, магчыма, у раёнцы не прынялі яе творчасць да ўвагі — а я ўпэўнены, што яна туды даслала творы.

— Як пазбегнуць такіх сітуацый?

— Мне падаецца, трэба часцей сустракацца. Мы нядаўна правялі вечар паэзіі — і адчулі сапраўдную цікавасць да слова. Такія часы, як былі раней, калі паэты збіралі вялікія залы, безумоўна, мінулі даўно, але... Цяпер трошкі абуджаецца цікавасць да паэзіі, я гэта адчуваю.

Падтрымліваць жывых волатаў

Сталічная вобласць няпростая для таго, каб ёй кіраваць, у тым ліку і таму, што амаль ва ўсіх сферах тут ідзе канкурэнцыя з Мінскам — сталіца "цягне" на сябе і творчых людзей. Але ўсё роўна: на Міншчыне — пенаты Якуба Коласа, ды й Янка Купала, як кажа Рыгор Сакалоўскі, — "ён наш, абласны". Паводле Рыгора Васільевіча, Узда — гэта маленькая літаратурная Мекка, адкуль выйшлі Кандрат Крапіва, Васіль Шырко, многія іншыя...

Тым не менш, так склалася, што ў Саюзе пісьменнікаў БССР і ў яго пераемніку СБП было пяць абласных арганізацый, акрамя Мінскай. Сталічная, Мінская абласная арганізацыя з'явілася толькі са стварэннем СПБ, і неўзабаве атрымала моцную падтрымку аблвыканкама.

— Я прыйшоў да Дамашкевіча, калі ён яшчэ быў губернатарам. Пры мне ён падпісаў загад пра заснаванне абласнога літаратурнага конкурсу, дзе былі б чатыры прэміі — у галіне прозы, паэзіі, літаратуразнаўства, дзіцячай літаратуры. І даў прэміі аблвыканкам — па 100 базавых велічынь. Рэспубліканская пісьменніцкая арганізацыя заснавала прэмію памерам 500 тысяч, а мы — 3 мільёны. Вось яны, магчымасці Міншчыны.

Мой суразмоўца шмат добрых словаў кажа пра літаратурныя аб'яднанні вобласці — у Дзяржынску, Валожыне і Барысаве. Расказваючы пра выбітных абласных пісьменнікаў сучаснасці, адмыслова спыняецца на аксакале — Іване Муравейку з Любані, адзіным жывым пісьменніку, які пакінуў свой аўтограф на сцяне рэйхстага.

Нядаўна ў яго быў юбілей — 85 гадоў. Урачыстасці праходзілі не ў самой Любані, а ў пасёлку, дзе ён нарадзіўся.

— У тамтэйшай школе ёсць пакой-музей, дзе стаіць яго пішучая машынка, ягоныя першыя кнігі... Што важна — гэта ўсё пры жывым чалавеку. Памятаеце, як быў жывы Шолахаў — як яго сустракалі! Волатаў трэба падтрымліваць найперш, калі яны жывыя. Для пісьменніка важна, як яго сустракаюць, як шануюць.

Стрынгеры супраць волі

Цяпер існуе цэлая індустрыя стрынгераў — людзей, якія здабываюць тэксты і здымкі ва ўмовах жорсткіх баявых дзеянняў, тых, хто жыве і зарабляе на вайне і вайной. За савецкім часам гэткага спосабу заробкаў не існавала: у полымя ваенных дзеянняў адпраўлялі без дадатковай аплаты.

Рыгор Сакалоўскі хоць і вучыўся на ваеннага журналіста, але пораху не нюхаў да тае пары, пакуль не патрапіў у экстрэмальныя ўмовы афганскай перадавой.

— Быў такі выпадак: мы ехалі на паходнай друкарні, даязджаем да звужэння дарогі ў гарах. Адзін памылковы рух — і мы ў прорве. Прапаршчык кажа: "Таварыш маёр, мы ўсе выйдзем тут, а салдацік няхай едзе". Я кажу: "Стоп. Усім — пастроіцца". Слова маё было кароткае: "Таварышы, баявы загад! Сядаем у машыну, я замыкаю дзверы на ключ, і мы едзем. Калі сарвемся — дык усе разам".

І мы праехалі. Маладому вазіцелю я абвясціў падзяку.

Быў у нас выпадак, калі параніла ротнага ў баі, і наш журналіст Калаціла цягнуў яго на сабе. Ён не кінуў параненага, дацягнуў, прыходзіць і дакладвае: "Таварыш маёр, не магу напісаць: увесь нататнік заліты крывёю". Вядома, гэта той выпадак, калі невыкананне задання даравалі...

Як працуеш на вайне, найбольш адчуваеш, што журналіст заўсёды на вастрыі падзей. Забываешся на сон. Як толькі прыехаў з задання, табе не хочацца — але напішы, бо тэрміны падціскаюць: людзі чакаюць. Іншыя газеты на вайну не ідуць, а маленькая дывізіённая выручае ўсіх, бо без інфармацыі людзі ў такіх умовах вар'яцеюць...

Ніхто не вучыць, як на вайне пісаць і — галоўнае — здабываць факты. Мы тут з вамі сядзім, гадзіну размаўляем ці болей — а там часам ёсць пяць хвілін, а часам — толькі некалькі секунд пасярод бою! Там фарміруецца ўчэпісты журналіст, здольны выдаць галоўнае, а не агульнымі фразамі прыкрыцца.

І самае складанае: цэнзура ціснула. Прыходзілася пісаць "вучэбны бой", браць у двукоссе — "вораг"... Але ўсе разумелі, пра што мы пішам.

Я як вярнуўся, перачытаў Сімонава. Ім, з аднаго боку, жахлівей было, бо з немцамі ваявалі, а з іншага... Яны адстойвалі сваю зямлю, ваявалі на ёй, а мы ж былі там — на чужыне — адрэзаныя ад усіх і ўсяго, і — з кім? за каго? Вось гэтыя думкі яшчэ доўга потым нам спакою не давалі...

Меркаванне — праз друкаванае слова

Рыгор Васільевіч з уласцівай яму дыпламатычнасцю на стан беларускіх СМІ не скардзіцца, але адзначае пэўныя праблемы з іх якасцю і разнастайнасцю.

— Вельмі шмат у нас цяпер газет і часопісаў, але многія на адзін твар. Звузілася жанравая палітра. Інтэрв'ю — у кожным нумары! А каб нейкія развагі, аналіз, каментарый даць — з гэтым складаней, бо дужа цяжка знайсці чалавека, які б той ці іншы факт пракаменціраваў. Жанр фельетона знік, вы разумееце, чаму — бо па судах зацягалі журналістаў...

І яшчэ адзін негатыўны нюанс заўважае Сакалоўскі: з нейкай невядомай яму прычыны ў нас знікаюць "зоркі". "Раней былі імёны — уся краіна ведала, хто ў нас лепшы нарысіст, хто лепшы каментатар. А цяпер..."

Нядаўна мой суразмоўца вярнуўся з крымскага фестывалю журналістыкі, у якім бяруць удзел журналісты Беларусі, Расіі і Украіны. На конкурсе СМІ дзве нашыя газеты — "Жодзінскія навіны" і "Железнодорожник Беларуси" — занялі першыя месцы.

— Па-першае, колер. У Расіі, да прыкладу, вялікай і моцнай краіне, газеты нейкія шэрыя — раённыя, гарадскія... У нас — на галаву вышэй, бо шмат робіцца дзеля таго, каб падняць паліграфічную базу. Па-другое, глядзіце: у нас ужо будзе не асобны факультэт, а Інстытут журналістыкі. Увагай дзяржавы таксама падымаецца статус, прэстыж прафесіі.

Сёння многія ўваходзяць — гэта тычыцца чытачоў — у Інтэрнет, а выданні туды пераходзяць. Прычын безліч: "выдавацца" там прасцей, не трэба выдаткоўваць сродкі на паперу і г. д., а інфармацыя, размешчаная ў сеціве, падаецца даступней.

Першы намеснік старшыні Беларускага Саюза журналістаў лічыць, што Інтэрнет як сродак масавай інфармацыі развіваецца ў Беларусі паспяхова, але кніга, газета ўсё роўна будуць выходзіць. Таму што толькі калі чалавек чытае друкаванае слова, ён пачынае мысліць, меркаваць...

Гутарыў
Мікалай АНІШЧАНКА

Спыніцца, азірнуцца

Часавыя далягляды, лёс роднай зямлі, вайна і мір, дзеі ўладароў... Усё гэта і многае іншае ўваходзіць у гістарычны раман. Жыццё чалавечае — гэта і ёсць гісторыя. Хто цяпер піша гісторыю?

...Людзі ва ўзросце са смуткам і радасцю ўзгадваюць свае маладыя і сталыя гады; ва ўспамінах прысутнічаюць і недарэчныя дробязі, але, паводле законаў псіхалогіі, больш у іх яркіх момантаў. Пісьменнікі, аднаўляючы ў мастацкіх вобразах подзвігі, памылкі, здзяйсненні колішніх пакаленняў, гледзячы на іх не толькі збоку, але і зверху, захапляюцца мужнасцю, сілай духу, нярэдка і самой эпохай. Вядома ж: добра там, дзе нас няма...

Урокі гісторыі? На іх вучацца тыя, хто ўмее ставіць пытанні. Бо людзі насамрэч не змяніліся, хаця... змены ўсё-такі ёсць. І часта даволі дзіўныя. Гістарычны раман, ***добра напісаны***, звяртаецца да народнай свядомасці, да душы народнай, пісьменнік праз карціны мінулага імкнецца падтрымаць дух (менавіта такую мэту ставіў перад сабой Г. Сянкевіч у сваёй "Шляхецкай трылогіі").

Жанр гістарычнага рамана ў беларускай літаратуры перажывае свой уздым, як і дэтэктыў, фантастыка. Паэтыка літаратуры наогул становіцца багацейшай, па-майстэрску пераплятаюцца фантастычныя матывы, гістарычныя, псіхалагізм набывае ўсё больш нюансаў. Справа за крытыкай. Але жанр гістарычнага рамана ўдзельнічае ў фарміраванні духу народнага, менталітэту. Цікава, што колькі гадоў таму адна вядомая беларуская пісьменніца, аўтар гістарычных раманаў заўважыла, што яна і ***не ведала, які добры ў нас народ***, пакуль не пабывала ў іншых краінах. Якая красамоўная агаворка, можна адразу ўстаўляць яе ў літаратурны твор у якасці "мастацкай дэталі", што характарызуе героя, які разважае прыгожа і мудрагеліста, а пасля раптам "прагаворваецца" — кажа штосьці пагардлівае ў бок селяніна ці рабочага. І становіцца зразумела: маніць, крывадушнічае, носіць маску. Хаця любоў да сваёй краіны, народа зусім не выключае самых рэзкіх вызначэнняў. Крыўда за ***сваіх***!

Пра жанр беларускага гістарычнага рамана мяне прымусілі задумацца манаграфіі прафесара Таццяны Камароўскай, прысвечаныя паэтыцы амерыканскага гістарычнага рамана ("Осмысление прошлого в американском историческом романе XX в." (1993), "Проблемы поэтики исторического романа США XX в." (2004)). Сумарны тыраж выданняў, адрасаваных студэнтам-філолагам, — 200 экземпляраў. У манаграфіях надзвычай дакладна, зразумела, прыгожа і лагічна выбудавана паэтыка гістарычнага рамана. Яго характарыстыка мае на ўвазе адкрытае супастаўленне жыцця, гістарычных падзей і літаратурна-мастацкага іх выяўлення. Аналітыка "звычайнага" рэалістычнага рамана гэтага не любіць, але менавіта гэта падштурхоўвае да самых сур'ёзных разваг — і дзіўных высноў. Высвятляецца, напрыклад, што часавая прастора гістарычнага рамана ЗША вузенькая, крыху больш як 200 гадоў. А сюжэты? Амерыканская рэвалюцыя і вайна за Незалежнасць, Грамадзянская вайна 1861—1865 гадоў... і ўсё. Прысутнічае, відавочна, і нянавісць да індзейцаў, і расавая праблематыка. Ёсць і такія раманы, як "Дэмакратыя" Г. Адамса, "Вашынгтон, Д.С." Г. Відала, "Разгул" С.Х. Адамса, гэта ўжо тэмы чыноўніцтва, інтрыг і карупцыі. Прыходзіш да думкі, што буржуазнаму дэмакратычнаму грамадству непазбежна спадарожнічаюць рабаўніцтва, хабар, карупцыя, бо ўгрунтаванае яно ў прынцыпе "ўсё прадаецца, усё купляецца"...

У нас выдадзены творы многіх амерыканскіх аўтараў: Ф. Купера, Г. Мелвіла, Т. Уайлдара, Г. Відала; асаблівую цікавасць выклікаў раман М. Мітчал "Знесеныя ветрам". Як, зрэшты, і ў Амерыцы ў свой час. Але тут мы бачым выхад за межы паэтыкі гістарычнага рамана ў сферу чалавечага жыцця, якое разгортваецца ў пэўных сацыяльна-гістарычных абставінах.

Бліскучыя даследаванні Т. Камароўскай прыводзяць да абсалютна нечаканай думкі: беларускі гістарычны раман нашмат багацейшы і цікавейшы за амерыканскі. Тут не ў патрыятызме справа. Ісціна вышэй і рэлігіі, і палітыкі, і патрыятызму. Насамрэч, межы беларускага гістарычнага рамана ахопліваюць дзве з паловай тысячы год, калі ўлучаць у кола нашых продкаў неўраў. Пра гэтых "лясных скіфаў" пісаў яшчэ Герадот у VI стагоддзі да н. э. Яны ўмелі ператварацца ў ваўкоў, і зараз гэты матыў скарыстоўваецца ў беларускім фэнтэзі (вось вам і перапляценне матэрыялу, і гістарызм з міфалогіяй). А спіс персанажаў! Чарадзей, Міндоўг, Альгерд, Радзівілы, Сапегі, Астрожскія... Ім не бракавала феадальна-магнацкай пыхі і відавочнай дурноты, але ж якія былі ***характары***! Асобна — Францыск Скарына, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі... І многія, многія іншыя. Жанр раманахронікі ў духу Ю. Крашэўскага выйгрышны пры наяўнасці дакументальнай асновы, а яе не так багата. Што ж застаецца? Застаецца тое, што так патрэбна цяпер: ***характар***, дух народны, паэзія *сівой легенды*. Няма і быць не можа ў амерыканскіх пісьменнікаў гэтых скарбаў. А інтрыгі вакол грошай, улады, мітусня і дробная калатнеча, — гэтага нам хапае і ў нашым рэальным жыцці. Г. Відал у рамане "Бэр" жорстка выкрывае культавы вобраз першага прэзідэнта ЗША Джорджа Вашынгтона, і робіць гэта на падставе дакументаў і разнастайных сведчанняў. У нас тое ж самае адбываецца ў дачыненні да гісторыі канца XIX стагоддзя і асабліва савецкага перыяду.

Т. Камароўская закранае таксама цікавую праблему, якая тычыцца "рухомасці" месца рамана ў жанравай градацыі. Сапраўды, сёння "На ростанях" Якуба Коласа, "Подых навальніцы" І. Мележа і многія іншыя творы па сутнасці з'яўляюцца гістарычнымі. У 70-я—80-я гады XX стагоддзя выходзяць творы У. Караткевіча, Э. Скобелева, Л. Дайнекі, Т. Бондар. Сёння актыўна пішуць Л. Рублеўская, Я. Конеў, А. Наварыч, З. Дудзюк.

Цікавай асаблівасцю айчыннага гістарычнага рамана з'яўляецца наяўнасць фантастыка-паэтычнага элемента. М. Адамчык і М. Клімковіч выяўляюць выразную цягу да гэтага ў "Каханцы д'ябла, або Кароне Вітаўта Вялікага", М. Клімковіч і У. Сцяпан — у "Тэолагу", Л. Рублеўская — у "Пярсцёнку апошняга імператара"...

Памежнае — паміж Захадам і Усходам — становішча Беларусі, памежнае найперш у сэнсе палітыка-духоўным стварыла такі клубок сувязей яшчэ з часоў Кіеўскай Русі, а затым эпохі княстваў (вось тут надзвычай эфектна глядзіцца раман Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі"), настолькі заблытала інтарэсы Польшчы, Літвы, Украіны, што сюжэтнае багацце тут проста неверагоднае. Але што ж браць з гэтай скарбніцы? У мінулым народы ваявалі адзін з адным, але рэдка пры гэтым адчувалі сапраўдную нянавісць, гэта прыйшло значна пазней, і да ліку прычын належаць кампаненты рэлігійныя, палітычныя, у меншай ступені — племянныя. Перанясенне ў наш час эмоцый, страсцей і канфліктаў перыяду ўдзельных княстваў — гэта значна небяспечней, чым гульня з агнём... А вось ***характар*** нам патрэбны! Часы зараз надыходзяць ***бесхарактарныя***, суцэльная палітканэктнасць, табуіраванасць слоў, паняццяў, тэрмінаў... Неўзабаве можа з'явіцца які-небудзь Мустафа Монд з ягоным рэзюме "Геніяльна. Забараніць". А характар — гэта моцны герой, мужны, здольны на *ўчынак*. Д. Марціновіч у артыкуле "Пераможцы і пераможаныя (Рэцэпты для гістарычнай прозы)", неблагім, у цэлым, артыкуле, больш піша пра Г. Сянкевіча і чамусьці пра Б. Акуніна з яго чыстаплюем Фандорыным. Ды не мае Б. Акунін дачынення да гістарычнага рамана, гістарызм у дадзеным выпадку — прыём, не больш як модная дэкарацыя; тут у цэнтры прыгодніцтва. А вось пра "падтрыманне духу" як пра "алгарытм" прозы Г. Сянкевіча варта было б паразважаць. І не менш цікава было б пачуць, што гавораць пра жанр гістарычнага рамана Э. Скобелеў, Л. Дайнека, Л. Рублеўская.

Так, многае з мінуўшчыны, з часоў нараджэння "сівой легенды" варта ўводзіць у культурны ўжытак. ***Хто цяпер піша гісторыю***? *"Описывай, не мудрствуя лукаво, // Все то, чему свидетель в жизни будешь..."* СМІ "сведчаць"?... Ды яны пільнуюцца сенсацыі, карцінкі, а дзе ж чалавек?

Якія раманы пра наш час напішуць гадоў праз 100... 2000?.. Вось вам і пытанне. Барацьба з духоўным распадам, з субпасіянарнасцю, з духоўнай лянотай — ці ж гэта не мэта гістарычнага рамана?

Станіслаў САЛАДОЎНІКАЎ

Гомельскі празаік і публіцыст Анатоль Бароўскі выдаў першую кнігу на рускай мове — раман "Искушение". Да гэтага пабачылі свет яго кнігі "Каліна пад акном", "Азірніся ў каханні", "Пякельні рай", шырокі і маштабны публіцыстычны твор "Чорны бусел — белы цень" — пра Чарнобыль, пра лёсы людзей, якіх напаткала жудасная бяда. Некаторыя аповесці надрукаваны ў часопісах. І вось — раман "Искушение", які адразу аказаўся ў цэнтры ўвагі чытачоў.

Каб не баяцца спакусы

Аўтар пісаў твор каля дзесяці гадоў і пачаў працу над ім тады, калі сам прыйшоў да Бога. Разам з іншымі вернікамі, якія жадалі спасцігнуць першапачатковыя веды, што закладзены ў Біблії, вывучаў з дапамогай святара айца Георгія Стары і Новы Запаветы. У той час сустрэўся аўтару чалавек, які хацеў давесці, што ў Біблії зашыфраваныя "ўстаноўкі" па фізіцы і хіміі, будаўніцтве і дойлідстве, літаратуры і мастацтве. Прыводзіў мноства доказаў сваіх здагадак і стараўся "падагнаць" святыя радкі пад тую ці іншую тэорыю... Менавіта гэта сустрэча, як прызнаецца аўтар, і паслужыла штуршком для стварэння рамана.

У тэкст Святога Евангелля ні ў якім разе нельга ўмешвацца і трактаваць яго на свой капыл — гэта грэх. Пра гэта і сказаў Анатоль Бароўскі свайму чытачу-суразмоўцу. Напачатку гэта была спроба паказаць такога "інтэрпрэтатара", які бачыў у Кнізе Кніг зашыфраваную "тэлеграму", "устаноўку" для жыхароў планеты Зямля. Але вобраз інтэрпрэтатара нечакана ператварыўся ў вобраз таго, хто пярэчыць Богу, хто асмеліўся сцвярджаць, што Гасподзь стварыў чалавека недасканалага і супярэчлівага, і што яго трэба перарабіць, і неабавязкова яму слухацца Усявышняга...

Але дакрануўшыся да цёмных тагасветных сіл, "аддаўшы" галоўнага героя мастака Антона Клімовіча, спакусе таямнічага госця — Анатаса Алкепава, які папрасіў напісаць яго партрэт за вялікія грошы, аўтар нечакана для самога сябе ўскочыў у той вір паралельнага свету. "Трапіўшы" туды, здзівіўся, што там іншыя законы і жыццё, дзе перакулена ўсё з ног на галаву, дзе сустрэліся тысячагоддзі і сусветы, рэлігіі і антырэлігіі...

Пісьменнік сам добра разумеў, што рабіў. Маючы ўпэўненасць, што яго самога не падсцерагуць там непажаданыя нечаканасці, ён смела павёў свайго героя па тых лабірынтах і віртуальных павярхах незразумелага карабля, які існаваў калі не тысячы, дык мільёны гадоў таму. На старонкі рамана прасіліся вобразы цара Ірада, які жадаў смерці Збаўцу, Магдаліны, якой дараваў Хрыстос блуд і яна паверыла ў Яго, Залатавуста Кірылы Тураўскага, які ў сваіх пропаведзях вучыў паляшуцкі люд Боскай дабрыні і мудрасці, Ісаака Ньютана, які быў не толькі выдатным вучоным і чарнакніжнікам, а, ўзяўшы за аснову толькі біблейскага Данііла, прадказаў сканчэнне свету...

Няпроста акрэсліць асноўную ідэю рамана. Яна шматпланавая. На кожным кроку нас чакаюць спакушэнні. Яны непрыкметныя, нязначныя, і нельга адразу вызначыць, дзе спакуса, а дзе проста жаданне палепшыць сваё жыццё. Нам могуць прапанаваць вялікія грошы за нейкую нязначную працу, якую мы павінны зрабіць... І непрыкметна для сябе мы і трапляем у той вір залежнасці і вінаватасці перад тым, хто прапанаваў нам лёгкі заробак...

І толькі калі адчуваем, што мы ўжо на самым дне, то міжволі ўсклікаем: "Божа, памажы!.."

Ды не толькі грашыма, вялікім заробкам мы можам спакусіцца. Духоўная спакуса зыходзіць і з экрана тэлевізара. Бруд льецца на нашы вушы, сэрца і душу, і ад гэтага атручваецца нашае "я", чалавек вымушаны падпарадкоўвацца таму чорнаму ўздзеянню... І рэдка ўбачыш фільм ці прачытаеш раман, каб прысутнічаў там Бог.

Кніга прымушае задумацца кожнага над сэнсам жыцця.

Раман прызначаны для вернікаў і для тых, хто яшчэ не прыйшоў да Бога, хто не быў у царкве, не спавядаўся і не атрымаў святое прычасце...

Пісьменніку прыйшлося прыкласці шмат сіл, пераасэнсаваць сваё былое жыццё, урэшце звярнуцца да Усявышняга па дапамогу і атрымаць яе... Каб жыць і не баяцца спакусы.

Васіль ТКАЧОЎ

Рэпрэзентант Беларусі

Быў у Максіма Багдановіча сябар Дзіадор Дзябольскі, якому наш паэт прысвяціў сардэчны верш. І ёсць у Маскве пляменніца Д. Дзябольскага — паэтэса, перакладчыца з французскай і на французскую Ніна Сяргееўна Дзябольская. Прытулілася яна да Беларусі, да нашага паэтычнага слова і стала як родная, і найперш праз супрацоўніцтва з Літаратурным музеем М. Багдановіча ў Мінску. На сёння яна не толькі літаратуразнаўца, але і сапраўдная наша радзімазнаўца: аб'ездзіла, даследавала ўсю Беларусь. І ў Крыме пабывала...

А нарадзілася Ніна Сяргееўна ў Маскве ў 1937 годзе. Скончыла Інстытут замежных моў, працавала перакладчыкам і выкладчыкам, атрымала і мастацкую адукацыю. У 2005 годзе выйшла яе кніга "Вершы. Пераклады. Перастварэнні".

На адной з канферэнцый у Мінску даведалася, што вершы Максіма Багдановіча перакладзены на англійскую мову. Сам Максім перакладаў творы французскіх паэтаў. І задумала перакласці вершы нашага класіка на французскую мову.

Ніна Сяргееўна піша: "Да гэтага часу памятаю, што мой дзядзька Дзіадор Дзябольскі — сябар Максіма па Яраслаўлі — вёў і вядзе мяне па жыцці, прывёў у музей М. Багдановіча, і да перакладаў... Падчас працы адкрываю для сябе новы, дзівосна цэласны свет духоўна блізкіх мне людзей... А галоўнае, мяне проста ўражвае сугучнасць беларускай паэзіі з французскай". І вось вынік натхнёнай работы Ніны Дзябольскай: на французскую мову перакладзены 31 верш М. Багдановіча, каля сотні — Р. Барадуліна, 18 — В. Шніпа, 16 — В. Жуковіча, 14 — В. Коўтун, 12 — Э. Акуліна, 8 — У. Някляева, 6 — Л. Хейдаравай, а таксама Я. Янішчыц, С. Грахоўскага, некалькі маіх. Праца працягваецца. А моўныя кансультацыі яна атрымлівае ад паэта Івана Бурсава, клімавіцкага масквіча.

У знак падзякі я пастараўся перакласці некалькі вершаў самой Ніны Сяргееўны. Паслаў тэксты ў Маскву. І вось яе водгук: "Белорусский в чем-то выразительнее русского..."

Вось, да прыкладу, толькі адзін верш Ніны Дзябольскай — "Пасецца лета..." з прысвячэннем "С. П." — у перакладзе:

Беларусь. Пасецца лета.
З граблямі на беражок
Скокнула. Аж на паўсвета
За стажком стаіць стажок.
Дзе нягода, непагода?
Пырскі-промні з-пад крыла —
Тчэцца бусліка выгода:
"Нада мной няма арла!"

Сяргей ПАНІЗНІК

«Вучоба ў класікаў» па-новаму

Класіка — рэч універсальная і невычэрпная і ў духоўным, маральным сэнсе, і ў эстэтычным, але таксама і ў навуковым. Кожны час, кожная эпоха маюць свае прыярытэты, і мы адпаведна ім, гэтым прыярытэтам, заўсёды вылучаем тое ў нацыянальнай класіцы, што падаецца найбольш актуальным менавіта ў нашай сучаснасці. Акцэнты могуць змяняцца, створанае ж класікамі ўсё роўна застаецца непарушным. Праўда, у беларускай літаратуры XX стагоддзя з гэтай непарушнасцю адбылася свая гісторыя, і ў выніку атрымалася, што і класікі былі не зусім такімі, як мы сабе ўяўлялі, і творы пісалі не зусім такія, якія мы чыталі, і вучыліся не зусім таму, чаму яны нас вучылі... Кніга Міхася Мушынскага "Тэксталогія твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа" якраз і заклікана паспрыяць аднаўленню сапраўднай класікі — такой, здавалася б, блізкай і зразумелай, але, у той жа час, шмат у чым яшчэ невядомай для нас.

Кніга М. Мушынскага мае прадуманую кампазіцыю, яна складаецца з трох частак і "Дадатку". Першая, як бы ўводная ў дачыненні да астатніх, змяшчае артыкул "Праблема навуковага выдання спадчыны Янкі Купалы і Якуба Коласа ў святле вопыту тэкстолагаў суседніх краін"; другая прысвечана некаторым аспектам выдання Поўнага збору твораў Янкі Купалы; у трэцяй — самай вялікай аб'ёмам — разглядаюцца разнастайныя пытанні тэксталогіі твораў Якуба Коласа; "Дадатак" складаецца з пяці артыкулаў, чатыры з якіх датуюцца 60-мі, адзін — 80-мі гадамі. Акрамя гэтага, у канцы кнігі змешчаны "Кароткі слоўнік тэксталагічных тэрмінаў і паняццяў" — першы ў гісторыі беларускага літаратуразнаўства.

Я невыпадкова карыстаюся словам "кніга", а не зборнік артыкулаў, бо "Тэксталогія твораў" сапраўды ўспрымаецца арганічна менавіта як цэласны твор, аб'яднаны агульнай канцэпцыяй. У прадмове да кнігі шаноўны аўтар вялікую ўвагу надаў тлумачэнню зместу тэксталагічнай працы і разбурэнню ўяўлення аб яе выключна прыкладным характары ў дачыненні да літаратуразнаўства. Акрамя таго, што артыкулы знітаваныя агульнай канцэпцыяй, яны яшчэ і прасякнутыя агульным пафасам — пафасам сцвярджэння творчага пачатку прафесіі філолага: для таго, каб працаваць з мастацкай творчасцю, незалежна ад кірунку і аспекту гэтай працы, чалавек павінен сам быць творцам, а не толькі статыстам і каментатарам.

У кнізе разглядаецца шэраг самых разнастайных пытанняў, аднак тое, што закранала "даследчыцкае сэрца" ў першую чаргу, займела больш поўнае асвятленне і абгрунтаванне. Гэта і пытанні адэкватнага ўспрымання "Казак жыцця" Якуба Коласа не як цыкла апавяданняў, але як асобнага, цэласнага твора, і імкненне сцвердзіць паўнавартаснасць публіцыстычнай і літаратурнакрытычнай творчасці пісьменніка насуперак даволі трываламу стэрэатыпу аб іх другаснасці ў дачыненні да мастацкай, і больш адказны падыход да выбару крыніцы асноўнага тэксту твора, і наданне больш сур'ёзнага статуса варыянтам і розначытанням твораў, і больш адказнае стаўленне да навуковага каментавання збораў твораў, і шэраг пытанняў па абнаўленні традыцый выдання поўных збораў твораў пісьменнікаў...

Нягледзячы на спецыфіку тэмы, якая патрабавала шырокага выкарыстання тэрміналагічнай і вузкаспецыяльнай лексікі, кніга можа лёгка і цікава чытацца не толькі спецыялістам-тэкстолагам, але і абсалютна недасведчаным у гэтай навуцы чалавекам. М. Мушынскі заўсёды надзвычай паважліва ставіцца да свайго чытача, незалежна ад яго ўзросту і навуковага досведу, — гэта адчуваецца ў своеасаблівай дыялагічнай манеры апісання — чытач не застаецца сам-насам у шматстайнай плыні інфармацыі, а заўсёды атрымлівае магчымасць належным чынам у ёй арыентавацца. Думаецца, не ў апошнюю чаргу гэта звязана з тым, што прынцыповым момантам для М. Мушынскага было якраз усталяванне кантакту з маладой аўдыторыяй, то бок з філолагам цяперашняга пакалення. Я, акурат як адна з яго прадстаўніц, чытаючы кнігу, з вялікай удзячнасцю да аўтара, пастаянна адчувала гэты кантакт, дыялог ("размову з чытачом", паводле выразу самога Міхася Іосіфавіча) — імкненне перадаваць навуковы досвед, дзяліцца здабыткамі і думкамі — з чаканнем плёну, працягу.

Вельмі цікавыя ў кнізе М.Мушынскага старонкі, прысвечаныя адэкватнай ацэнцы "вынікаў палітычнага заказу" ў беларускай літаратуры. Немалое месца займае таксама разгляд перапрацоўкі твораў пад уплывам цэнзурных патрабаванняў — альбо самім аўтарам, альбо без яго непасрэднага ўдзелу. Разгляд гэты ў М. Мушынскага надзвычай падрабязны невыпадкова, яго мэта — вярнуць чытачу сапраўдныя тэксты твораў, а, значыць, — і пісьменніцкіх задум, без чаго немагчымае вывучэнне творчасці і Янкі Купалы, і Якуба Коласа, і адпаведнага літаратурнага перыяду ўвогуле. Скажаючы змест твора, цэнзурныя праўкі заканамерна прыводзілі да скажэнняў у вывучэнні паэтыкі твораў: "Рэдагаванне аповесці "Адшчапенец" — гэта не прыватны выпадак у біяграфіі яе аўтара, а трагічная старонка гісторыі духоўнага жыцця беларускага народа, беларускай літаратуры. Павага да ісціны і справядлівасці патрабуе, каб яна, старонка, сёння была прачытана аб'ектыўна, непрадузята, каб тая праўда, якую нёс у сваім змесце твор Якуба Коласа, была вернута чытачу".

Выключна важнае значэнне менавіта для маладога філолага павінна мець і меркаванне М. Мушынскага аб немэтазгоднасці падзелу творчасці пісьменнікаў на "дакастрычніцкі" і "паслякастрычніцкі" перыяды: "На вялікі жаль, у нас і да гэтага часу выходзяць навучальныя дапаможнікі, дзе выкарыстоўваецца ранейшая схема: дакастрычніцкі перыяд, 20—30-я гады як штосьці адзінае, перыяд вайны і г. д. Як бачым, у размове пра літаратуру дамінуюць голая палітыка, ідэалогія, а эстэтыкі і почуту няма".

Вельмі цесна з гэтым звязана праблема адэкватнай ацэнкі і працы саміх даследчыкаў. Мы не заўсёды маем смеласць прызнацца, што ў беларускім літаратуразнаўстве склалася атмасфера пэўнай "сваяцкай салідарнасці", калі адзначаць хібы, недакладнасці ці проста нейкую асабістую нязгоду з выказанай думкай "неяк няёмка". Гэта ў адналькавай ступені датычыць і ранейшых прац, і сучасных. М. Мушынскі гэтым прынцыпам не карыстаецца, заўсёды вельмі канкрэтна, але карэктна расстаўляючы акцэнты.

Не лічу патрэбным спыняцца на пераказе зместу артыкулаў — кніга будзе прачытаная і будзе чытацца, у гэтым няма сумневу. Мне хацелася б звярнуць увагу найперш на універсасальнасць даследчыцкай манеры М. Мушынскага, дзякуючы чаму даследаванне па тэксталогіі сталася надзвычай глыбокім даследаваннем па гісторыі беларускай літаратуры і — разам з тым — і метадычным, і навуковым даведнікам для маладога беларускага філолага. Насампраўдзе, маладому даследчыку можна многаму павучыцца ў Міхася Іосіфавіча, напрыклад, абсалютнай канкрэтнасці разгляду і аналізу без лішніх, недатычных справы падрабязнасцяў і зацягнутых адступленняў, выключнай інфармацыйнай насычанасці, выразнасці ацэнак, абгрунтаванасці высноў, цеснай сувязі з літаратуразнаўчай практыкай.

Калі М. Мушынскі заклікае вучыцца ў Янкі Купалы і Якуба Коласа як класікаў беларускай літаратуры, то я заклікаю вучыцца ў М. Мушынскага як класіка беларускага літаратуразнаўства.

Жана КАПУСТА

Вуда, што прыносіць цуды

Згадваючы сваё маленства, прыпамінаючы кнігі, якія даводзілася тады чытаць, часам мушу з сумам канстатаваць, што іх — цікавых, захапляльных — было куды меней, чым цяпер. Безумоўна, цікава чыталіся творы народных песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама тых, хто знайшоў сваё прызванне ў галіне дзіцячай літаратуры, як, да прыкладу, Янка Маўр, Алесь Якімовіч, Васіль Вітка, Віталь Вольскі і некаторых іншых аўтараў.

Затое сённяшнія хлопчыкі і дзяўчынкі маюць вялікі выбар таго, што можна не проста чытаць, а і рабіць гэта з задавальненнем. Згадаю толькі аўтараў, кнігі якіх выдадзены літаральна апошнім часам: Алесь Савіцкі, Валянцін Лукша, Міхась Пазнякоў, Віктар Гардзей, Алена Масла, Людміла Рублеўская, Раіса Баравікова... А нядаўна выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпусціла і кнігу Уладзіміра Мазго "Цуда-вуда", аздобленую цудоўнымі малюнкамі Таццянай Беразенскай.

Як сведчыць выдавецкая анатацыя, у "Цудзе-вудзе" прадстаўлены не толькі новыя вершы У. Мазго, а "і лепшыя творы, напісаныя ім за трыццаць гадоў творчай дзейнасці". Значыць, надарылася мажлівасць узнавіць у памяці і тое, што ўсцешвала раней, пры знаёмстве з ягонымі папярэднімі кнігамі "Калі спрачаюцца маланкі", "Суседзі на сусвеце", "Смехапад", "Прыгоды марахода".

У пачатку кнігі змешчаны верш, які можна ўспрымаць свайго роду эпіграфам да яе, але, бадай, правільней усё ж будзе сказаць — запрашэннем увайсці у свет яе герояў.

Калі возьмеш гэту вуду,
Прыйдзе час адбыцца цуду:

Зловіш столькі анаграм —
Пэўна, цэлы кілаграм.

Шмат загадкавых шарад —
На сняданак акурат.

Многа вершаў на абед.
А смяшынак —
на дэсерт.

Столькі казак на вячэру,
Што табе я не паверу!..

Праўда, апошні радок усё ж гучыць крыху ненатуральна. Відаць, правільней (і больш лагічна) было б сказаць нешта накшталт, "што сабе ты не паверыш".

Толькі гэтыя недагляды ў кнізе — выпадковасць, бо пераважаюць у ёй такія творы, у якіх надзіва дакладны паэтычны малюнак, удалыя вобразы і параўнанні. Творы лёгка запамінаюцца, бо паэт хоць і дае волю сваёй мастакоўскай фантазіі, усё ж ідзе ад самога жыцця. Яго героі — гэта самі дзеці ці тыя, каго яны добра ведаюць з маленства. А дзе маленства — там лёгка жывецца і дыхаецца, і амаль на кожным кроку чакае цябе здзіўленне. Нават у самых звычайных рэаліях. Дастаткова толькі крыху пафантазіраваць і: "Кошка Мальта // Робіць сальта // І стаіць на галаве" ("Кошка Мальта"), "Крот // Сабраўся на курорт: // Хату, // Мэблю, // Агарод // І падземны // Свой гараж // Прапануе// На кірмаш" ("Аў-кцы-ён"), "Вось пацеха, // Дык пацеха: // Развязаўся мех // Са смехам, // І па вуліцы // Пабег // Незвычайны гучны // Смех" ("Смехапад"),

Як арэшкі,
Лушчаць зоркі
У вершалінах
Вавёркі.

Можа,
З вас хто
Акурат
Бачыў гэты
Зорапад?..

І, канечне ж, шмат радасці дзецям прынясуць казкі У. Мазго. Гэта і "Лясная аптэка", і "Сябрабуд", і "Цуда-вуда", і "Папугаю сніцца гай"і "Прыгоды марахода".

А ёсць жа яшчэ і анаграмы, і шарады. Ёсць, нарэшце, "Загадкавая азбука", у якой абыгрываюцца літары алфавіта.

"Цуда-вуда" і сапраўды прыносіць цуды. Як жа добра было б, калі б яна трапіла ў школьныя бібліятэкі!

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Кніжная паліца

У выдавецтве "Галіяфы" выйшаў у свет чарговы зборнік вершаў *"Готыка тонкіх падманаў"* паэткі **Таццяны НІЛАВАЙ**. *"Яркая, каляровая, гучная, нібы спевы буры, — гэтая паэзія прыйдзецца даспадобы не толькі інтэлектуалам, але і шырокай чытацкай публіцы"*, — сказана ў анатацыі да зборніка. Прадмова вядомага крытыка Ірыны Шаўляковай.

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў серыі "Казкі XXI стагоддзя" выйшла ў свет кніжка для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту маладой пісьменніцы **Кацярыны ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВОЙ** *"Падарожжы ў чароўны лес"*. У кніжцы *"кожнае падарожжа — гэта сустрэча з новымі казачнымі персанажамі, якія стануць для дзяцей сапраўднымі сябрамі. Разам з імі дзеці будуць спасцігаць вечныя каштоўнасці сяброўства, узаемадапамогі, дабрыні і міласэрнасці"*. Прыгожа афарміў і размаляваў кніжку вядомы беларускі мастак, пераможца многіх міжнародных выставак-конкурсаў **Віталь ДУДАРАНКА**.

У выдавецтве ""Кнігазбор" выйшаў зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў *"Найвышэйшае і светлае"* пісьменніка з Рагачова **Міхася СЛІВЫ** (сапраўднае прозвішча Кавалёў). У тэкстах аўтара разглядаецца творчасць беларускіх (у тым ліку і рускамоўных) празаікаў і паэтаў, а таксама аналізуюцца творы сучаснай нацыянальнай літаратуры.

У Гродне (у праекце "Гарадзенская бібліятэка") выйшла кніга вядомай паэткі **Дануты БІЧЭЛЬ** *"Хадзі на мой голас"*. Гэта своеасаблівыя эсэ, прысвечаныя калізіям яе ўласнага жыцця і творчасці, а таксама тым высакародным людзям, што атачалі і скрашвалі няпросты лёс паэткі. *"Гэта — яшчэ не развітанне, не запавет, але падвядзенне вынікаў..."* — піша на зачыне кніжкі аўтар.

У сталічным выдавецтве "Конфидо" выйшла кніжка **Яраслава ЧАПЛІ** *"Кулацкі эшалон"*. Гэта расповед пра драматычны перыяд у гісторыі беларускай вёскі — калектывізацыю і высылку дзесяткаў тысяч сялян у аддаленыя рэгіёны Савецкага Саюза. Глыбіню даследаванню надае не толькі багаты архіўны матэрыял, але і ўспаміны сведкаў тых падзей, якіх аўтар адшукаў у Архангельскай вобласці. Разам з тым кніга лёгка чытаецца і будзе запатрабаваная тымі, хто хоча ведаць сваю гісторыю. Прадмову напісаў доктар гістарычных навук, прафесар Георгій Штыхаў.

Анатоль ШУШКО

Тут

Пінску

О, места маё дарагое!
Святар з купаламі над Пінай!
Не трэба мне долі другое.
Тут ліпа мая, тут рабіна.

З каштанам шапочуцца мірна,
Вітаючы з неба заранку.
Тут шчырай душы маёй — лірна
Ля кожнага дома і ганку.

Тут ласку знайшоў я, вітанні
Ўзнавіў на дарозе жыццёвай.
Тут Вера мая і жаданні
Святлом наліваюцца — СЛОВАМ.

Тут жніўняў маіх зарапады.
Надзеі надзейны прытулак.
Тут родным на ясную радасць
Любоў мне асновы вярнула.

І пэўны я: тым, каму сэрца
Аднойчы ўдзячыцца шанай,
Ніколі не стыць ў паняверцы
Між ліп
між рабін,
між каштанаў.

Прыпамінанне

Лепшай долі няма, як суладны санет
Прад вачмі на паперу кладзецца...
Чапялою матуля папеліць загнет...
Нешта мыш у запечку шкрабецца...
О, дзяцінства нязрушнага
ясны сусвет!
О, святла самы шчодры
праменьчык!
Колькі восеней,
зімаў і вёснаў, і лет
Я лячу на твой цудны
агменьчык!?

Там ні скрухі,
ні смутку няма ані-ні.
Як не пружся,
не тужся і як не цягні
На сябе "коўдры мудрых дасвецяў".

Пра мінулае трэба
тады гаварыць,
Як святляк зазіхоча
ў чорным бары,
І абвесціць прычасце суквецяў.

* * *

Не спяшайся, жыццё невымернае,
Споры ў скорым ані не было.
Бо ты ёсць маладое й хімернае,
Бо цвіцеш, як і ўчора цвіло.

Не спяшайся, прашу,
у самоце хоць.
Бо самохаць не клічуць юдоль.
Шчырай ВЕРЫ
хай зведае моцы плоць,
На якую не квапіцца моль.

Нямнога

Кожны па-свойму
Прыходзіць да БОГА

с ц е ж к а ю,

што павяла ад парога
памяць ж ы ц ц я,
дарагою дарогай
матчын трыпутнік
аблашчвае ногі.

У блакнот

Адкакурсніцы-зямлячцы
Марысі Ф...ч

Сягонны Вы. А заўтра той
Каго зусім яшчэ не знаю,
Каго выпадкам напаткаю
У сцішнай цемрадзі начной...
Падаць даверліва руку
І спагадальна, і спакусна
Ва ўсмешцы расплывуцца вусны...
Прамоўлю: "Бог мой! На вяку
Не меў я радасці, каб стрэць...
Вось так: зусім неспадзявана,
Ды звыкла-проста... апантана
Далонь сваю ў чужой сагрэць..."
Магчыма, смешна стане Вам,
Калі скажу, што стрэчы кожнай
Чакаю з думкаю трывожнай,
Як сэрца гордае аддам
Навек адзінаму таму,
Каго прыму душой свавольнай,
З кім шчасце падзялю супольна —
Пяшчоту, маладосць саму...
Аднак чаму (салодкі зман?)
Я Вас цалую, абдымаю,
А сэрца мудрае сцвярджае,
Што больш ужо не пакахае...
Адкуль такі самападман!?
Не! Вы павінны нешта знаць!
Бо нельга быць для слоў відушчым.
І ўсё ж не зразумець Вам душы,
Што не развучацца кахаць!..

Радзімнае

Мора дабра.
Мова пры ім.
Зла не жадаю —
Ведаю:
Вечнай зямлі
Зялёны кілім
Размаляваны
Бедамі.

Сняцца, аднак,
Цуда-вясна,
Сонечная,
Стараннае
Лета
І восень,
Што любіць сабраць
З нівы сваёй
Жаданае.

Зычыш — любі!
Кажаш — крычы!
Кожны
З раднёю спеецца.
Людцы,
Паселі б не крумкачы
Там,
Дзе дабро пасеецца.

Прачулае і весняе

Мне гаманіць ВЯСНОВЕЙ
На БЕЛАРУСКАЙ мове
На матчынай, на КРЭЎНАЙ,
Расістай, зорнай, спеўнай.
Мне прасвятляе вочы
Душа яе прарочая:
Здаецца, што Айчыну
Нясу я за плячыма,
І гэты груз найважкі
З УСІМ
Зусім не цяжкі.

Верш

А я паэт дваццатага стагоддзя.
Век дваццаць першы —
век маіх сыноў.
Світальнае тысячагоддзе
Няхай шукае
думных прапаноў.

Бо, як паэт дваццатага стагоддзя,
Нашчадкам прапаную
перш-найперш:
Радзімнага сумлення
для народзін
І... верш.



Аксана СПРЫНЧАН

* * *

Ты мяне ратаваў
ад шэршня,
я цябе ратавала
ад шэрасці,
ад зашэрхласці адзіноты,
я дарыла табе самоту,
даравала табе — са-мной-ты,
паэтычнаю і празаічнай,
трагедыйнаю і камічнай,
ашалелаю і вясёлай,
шашаль труны тачыў
нам новыя...
Шэдэўральна
яны рассыпаліся,
як да шчасця ў жыцці
дакраналіся...

* * *

Глядзіцца Прыпяць,
нібыта Нарцыс,
у вочы мае...
А калі ў люстэрку
вейкі судакранаюцца,
дна прыгажосці
кранаецца
рэч-ка-ў-сабе,
у сябе зацягвае
жанчыну-ў-сабе,
а можа, і не ў сабе...
Ды розніцы аніякай,
калі на дне...

* * *

Ку-ку, ку-ку, ку-
ку, ку-ку, ку-ку, ку-ку,
ку-ку, ку-ку...

Недакувала зязюля
хоку.

* * *

Выпраўляю цябе ў дарогу
і не плачу,
бо ёсць каму плакаць
ад расстання з табой...
Выпраўляю цябе ў дарогу
і не плачу,
бо ёсць каму маўчаць
ад расстання з табой...

* * *

Вочы заплюшчыла:
не ведаю, куды глядзець —
на мапу радзімак тваіх
ці на зорную мапу неба
над намі?

* * *

На Чорным возеры
ратуюся лілеямі.
На Белым возеры
ўглядаюся ў празрыстае дно.
Прачытала запіс:
«На беразе знойдзена вопратка
невядомага мужчыны»...
Узгадваю:
ты стаіш з белай лілеяй,
а я гляджу на яе дно:
«На белым пялёстку застаецца
адзенне...»
Дадаю:
«невядомай жанчыны»,
хоць ведаю — маё...

* * *

Двух акцёраў тэатр
мы з табою стварылі.
У п'есе сучаснай
мы выконваем ролі.
Сталі сцэнаю
сцены ўласнай кватэры.
І банальнае
Быць ці не быць
пераходзіць
у наша банальнае.

* * *

Стала часта паліваць кветкі,
выглядаючы цябе праз акно.

Кветкі захлынуліся
ад майго чакання.

Цяпер баюся глядзець
праз краты з мёртвых сцяблін...

* * *

Пачала вучыцца
забываць цябе
і адразу адчула,
што я з тых вучаніц,
якія бяруць прадмет
не здольнасцямі,
а карпатлівай
цярплівасцю.

* * *

Тыя,
каго я калісьці кахала,
не застаюцца адзінокімі.
Ім спадарожнічаюць
мае німфы —
аксаніды.*

Адчуваю нараджэнне
самай прыўкраснай...

* * *

Ты падаеш надзею мне,
а жабраку —
рубель апошні...
Ды не глядзіш
у нашы вочы...

* * *

Шукаю тое,
што яшчэ згублю.
Сама сабе дапамагаю...
...губляць...

---

* Аксаніды — німфы акіяна (памылка друку): трэба "акіяніды".

Фота Васіля Жуковіча

Кароткія апавяданні



Іван СТАДОЛЬНІК

Ластавачка

Днела. Пара было ўжо ўставаць з ложка. Але Святаславу Круглянскаму страшэнна хацелася яшчэ пабыць у пасцелі. Ён да хрумсту ў суставах выцягнуў ногі... І раптам прымроіліся яму вялікія, сумныя, балюча-журботныя вочы. Святаславу падалося, што ён зноў засынае і яму пачынае сніцца нейкі дзіўны сон.

Святаслаў пастараўся ўспомніць, дзе і калі ён мог бачыць гэтыя вочы. І раптам як нейкі выбух выкінуў, вырваў яго з пасцелі.

— Ластаўка! Ластавачка!.. Ластавачачка! — бы не сваім голасам закрычаў ён.

Вялікія, круглыя і сумна-сумна журботныя вочы некуды зніклі, як усё роўна растварыліся ў прыкметным блакіце чэрвеньскай раніцы.

— Ластаўка! Ластавачка!.. Ластавачачка! — ужо ў поўнай свядомасці і рэальнасці свайго адчування крыху цішэй паўтарыў Круглянскі, успомніўшы колішнюю бальнічную кабылку Ластаўку і яе першую і адзіную дачушку Ластавачачку.

Ластаўка ў Мосарскай участковай бальніцы, што на Глыбочыне, была старая, мела ледзь не пятнаццаць гадоў. Яна вазіла ўсіх бальнічных медсясцёр і доктара па вёсках да хворых, і проста так, куды каму трэба было. Але яе яшчэ ні разу не дапусцілі да жарабца. І вось аднойчы, калі Святаслаў быў ужо выконваючым абавязкі галоўнага ўрача, ён падышоў да Ластаўкі, якая была навязана ў бальнічным садзе. Ластаўка не скубла траву і самотна-журботнымі вялікімі акруглымі вачыма глядзела на Круглянскага, ці, лепш сказаць, проста яму ў душу. Доктар зразумеў, што Ластаўка просіць, моліць... Яна хоча стаць мамай.

Круглянскі паклікаў загадчыка гаспадаркі бальніцы Бернася і папрасіў, каб той звадзіў Ластаўку да жарабца. Крыху паморшчыўшыся, маўляў, навошта лішнія клопаты, Бернась, тым не менш, сеў на Ластаўку верхам, і кабыла, нібы здагадваючыся, якое шчасце яе чакае, ледзь не адразу кінулася ў галоп.

...Назад Ластаўка вярталася з Бернасем на спіне таксама падбегам. У вачах яе гарэлі шчаслівыя агеньчыкі.

А калі надышла пара ажарабіцца, Ластаўка абудзіла ўсю вёску Мосар сваім іржаннем. Збегліся на бальнічны двор не толькі бальнічныя работнікі, хворыя, але і многія вяскоўцы.

Ластаўка стаяла, шырока расставіўшы заднія ногі і крыху прысеўшы, а цюлечка ў цюлечку падобнае на маці жарабя з белай зорачкай на ілбе смактала маміна малачко. Пазней ужо дачушцы далі мянушку Ластавачачка.

...Мінула сорак гадоў з таго часу. Вядома, ні Ластаўкі, ні Ластавачачкі на свеце ўжо няма. Але і сёння трывожаць Круглянскага вялікія круглыя самотна-журботныя, як маленькія люстэрачкі, вочы кабылкі Ластаўкі і яе дачушкі Ластавачачкі.

Цудадзейны ўкол

Так званы кабінет зубнога ўрача сельскай бальніцы, якая размяшчалася ў доме былога ксяндза, што ў свой час раздзяліў лёс з польскімі афіцэрамі ў Катыні, знаходзіўся ў самай прыхожай. Ён быў занавешаны ад пацыентаў дзвюма белымі прасцінамі. І ўсе пацыенты маглі не толькі чуць, але і бачыць зубаўрачэбныя працэдуры.

Звычайна хворых было мала-вата, асабліва летам. Але ў гэты дзень на прыём да ўрача Янука Савоські сабралася чалавек пяць-шэсць.

Савоська выглянуў з-за шырмы-"кабінета", пацікавіўся, каму пільней трэба лячыцца.

— Во-ёй-ёй! — ледзь не хорам адказалі хворыя жанчыны, і сярод іх — адзін пажылы дзядзька.

І яны паказалі на бабулю, якая сядзела на лаўцы каля ўваходу.

— Гэта маці таго хлопца, што некалі застрэліўся. Мо чулі пра яе гора? Яна з таго часу вельмі хворая. Прыпадкі бяруць. І мы ўсёй вёскай яе ратуем.

І хворыя расказалі, як старая траціць прытомнасць на вуліцы, але чамусьці толькі пры людзях.

— Доктар, уважце. Не зрабіце ёй балюча, — падняўся з лаўкі той самы пажылы дзядзька. — Гэта мая жонка. Кожны дзень падае без памяці, і я ледзь-ледзь адліваю яе вадой. Ды суседзі памагаюць. Але дактары, да якіх мы звярталіся, ёй веры не даюць, кажуць, што не такая яна ўжо і хворая. А вы, можа, чулі, якая бяда з нашым сыночкам здарылася?

Доктар з разуменнем кіўнуў. Ён чуў пра бяду, якая напаткала не толькі гэтых людзей, але і старшыню мясцовага калгаса, Героя Сацыялістычнай Працы, і яго жонку.

Старшыня, бальшавік, партызан, заўсёды ездзіў па калгасе і ў раён на падводзе, сам, без возчыкаў, калі ледзь не ўсе старшыні паперасядалі ўжо на сталёвых "кабылак" пад стандартнай назвай "Волга". Каб не псаваў твар раёна, яго, старшыню самага перадавога ў раёне калгаса, прымусілі купіць "сталёвую кабылку". Але яна так і прастаяла некранутай у хлеўчуку. Дачка старшыні і сын гэтай хворай жанчыны ўжо вучыліся ў дзевятым класе. Дзяўчына вельмі кахала хлопца. І вось аднойчы, нібыта прадчуваючы што нядобрае, на вечарынцы яна спыталася ў каханага:

— Што б ты рабіў, калі б я памерла?

— Закахаўся б у другую, — жартам адказаў ён. — А ты?

— А я не жыла б без цябе.

І вось под канец хрушчоўскай кукурузнай эпапеі здарылася трагедыя: хлопец зрабіў самапал і вырашыў яго выпрабаваць. Запаліў порах, але самапал не стрэліў уперад, а аддаў увесь зарад назад, у пах хлопцу. І прабіў пахавую артэрыю. Маладая ўрачыха-мінчанка, якая адбывала тут два гады "прынудзілаўкі", затампавала марляй з ватай рану, загадала старшыні гаспадаркі Бернасю запрэгці кабылку Ластаўку і везці за васемнаццаць кіламетраў у Глыбокае. Бо "хуткія дапамогі" не маглі пераадолець непралазную гразь. Па дарозе хлопец і памёр.

У той прыгожы летні дзень дзяўчына папрасіла маці схадзіць у магазін і купіць ёй газіроўкі. Схадзіла, купіла, вярнулася. А дачка ўжо не дыхае. На століку стаіць паўшклянкі нейкай вадкасці і ляжыць паперка, дзе дачка піша, просіць, каб даравалі ёй яе мусовую смерць і каб абавязкова пахавалі побач з каханым.

Старшыня-бальшавік так разбушаваўся, што забараніў выканаць апошнюю волю дачкі. Пахавалі яе асобна ад каханага.

...Савоська пазваў пацыентку і прапанаваў сесці ў зубаўрачэбнае крэсла, якое ўпіралася ў сцяну і побач з якім стаяў маленькі столік з медінструментамі. Доктар выпадкова не зашморгнуў "занавескі"-дзверы свайго "кабінета". Ён пачаў аглядаць хворую. Яе пярэдні зуб хістаўся.

— Трэба рваць. — сказаў доктар.

Але хворыя пачулі гэта і ўсе ў адзін голас закрычалі:

— Рабіце замарозку, рабіце, хіба не бачыце, што яна ледзь дыхае!

Сапраўды, старая пачала задыхацца. Савоська адламаў у ампулы з навакаінам "носік" набраў у шпрыц меншую палову вадкасці і ўкалоў у дзясну. Счакаўшы хвіліну-дзве, узяў са стэрылізатара абцугі тут жа ў плявальніцу выкінуў той нячшасны зуб.

Старая пачала ціхенька спаўзаць з крэсла і асцярожна, каб не стукнуцца, уперлася ў сцяну.

— Ой, доктар, што вы нарабілі, — пачалі крычаць хворыя і асабліва муж. Савоська адразу зразумеў, што старая сімулюе. Бо калі чалавек страчвае прытомнасць, ён не думае, як і куды ўпасці.

— Не хвалюйцеся! — супакоіў усіх Савоська. — Мне сябра з Амерыкі прывёз нядаўна цудадзейныя ўколы. Вось, паглядзіце.

І доктар, выйшаўшы з бакоўкі, прынёс акурат такую ж па памеры ампулу з такім жа навакаінам, адламаў "носік" і дзесятую долю ўвёў бабулі ў вену. Праз якую хвіліну бабуля бадзёра ўскочыла, выплюнула тампончык, на якім не было ні кропелькі крыві, і выйшла ў прыёмную да аднавяскоўцаў і мужа.

Савоська вырашыў давесці справу да канца. І паклікаў маладзейшую з хворых жанчын, падаў ёй дзве скарыстаныя ампулы:

— Чытайце!

Жанчына ўголас прачытала на адной ампуле: "Новокоин 2-процентный, 2 миллилитра", на другой — тое самае.

— Вядома, — сказаў доктар, — гора ёсць гора, але нельга спекуляваць ім. І калі гэтая бабулька будзе падаць перад вамі, не надта звяртайце ўвагі, так будзе лепш і вам, і ёй.

Праз два тыдні муж той бабулькі прыйшоў да доктара, прынёс бутэльку самагонкі і колца хатняй каўбасы і, ледзь не ўкленчыўшы, прамовіў:

— Дзякуй, доктар, ты адзін так хутка вылечыў маю старую.

Фёдар ГАНЧАРОЎ

Пад промнем Боскай ласкі

Перад тым, як узяцца за штосьці надзвычай патаемнае, адчуваеш далікатны, але патрабавальны штуршок, які сыходзіць аднекуль з глыбіні душы. Чытаючы нядаўна аповесць добра знаёмага мне пісьменніка Віктара Карамазава "Мой брат духоўны..." пра слыннага жывапісца зямлі нашай Станіслава Жукоўскага, адчуў менавіта такі штуршок...

Карамазаўскія радкі — аб тым, што пасля смерці маці Стасік цэлы месяц згараў у ложку на мяжы жыцця і смерці. А лекары не знаходзілі сродкаў, каб ураташаць хлопчыка. Уратавала Маці Боская, якая з'явілася ўначы. Ужо, здаецца, паміралі дзіцятка, калі яна схілілася над ім і мовіла: "Я — Панна Марыя, маці нашага Пана Бога і твая маці нябесная. Я прынесла табе, сыне мой, крыж Гасподні. Пацалуй яго — на гэта ёсць воля Спаса нашага".

Яна паклала на далонь крыж са сваіх грудзей, што зззяў, нібы сонейка, і паднесла Стасю. Ён прыўзняўся над падушкаю, пацалаваў крыж, лёг і неўзабаве адчуў, што да яго вярнулася Мама, якую звалі Марыяй, як і Маці Боскую. І са шчымлівым вобразам у вачах і сэрцы заснуў.

А раніцай, прачнуўшыся, убачыў на ложку сястру Серафіму, якая пыталася:

— Чаму ты, Стасік, сёння гэткі белы? Цэлы месяц гарэў чырвоным полымем, а сёння тваё полымя белае.

Не адважыўся выдаць сястры таямніцу пра Маці Боскую і Крыж Пана Бога. Праз шмат гадоў, стаўшы акадэмікам жывапісу, зразумеў, што белы твар ад белага агню.

...Той патаемны штуршок прымусіў мяне ўзгадаць аповед старэйшага сябра, газетчыка Яўгена Леўчыка. Ягонае дзяцінства выпала на пасляваенныя гады. Яўгенка, зусім яшчэ малеча, бавіў час з маці на цялятніку. Вядома, ёй тады было не да малога.

Пакуль маці ўвішна займалася сваёй справай, Яўгенка цешыўся язычкамі полымя ў печцы, грэў ручкі, якія прабірала ранішняя прахалода.

Ды вось аднойчы аднекуль з'явіўся нахабны верабейчык, які прымусіў малога адвесці позірк ад вогненных языкоў. Хлапчуку вельмі закарцела злавіць назолу. Той амаль даваўся ў рукі, змушаючы малога непрыкметна пасоўвацца да катла. А кіпень булькаў пад тымі дашчэчкамі. Захапіўшыся лоўляй верабейчыка, Яўгенка непрыкметна апынуўся на накрыўцы булькаючага варам катла. І раптам дашчэчкі разышліся і дзіцячая ножка слізганула ў булькаючы вар.

Прыбегла маці, схапіла сваё дзіцятка, хуценька зняла з яго нагі абутак разам з апечанай дзіцячай скурай. І ледзь не страціла прытомнасць ад убачанага. Жывой засталася толькі падэшва пакутніка. З крыкам і болем кінулася дахаты з дзіцяткай на руках.

На пасінелым ад нясцерпнага крыку тварыку сына маладая кабета бачыла нясцерпны боль.

У хату пачалі збірацца суседзі са сваімі спачуваннямі і парадамі. Маці, калоцячыся ад жаху, узлівала на пякучую рану бялок з яйка, які, здавалася, у імгненне зварваўся на вачах. Яўгенка сцішыўся і глядзеў на свет шырока адкрытымі вачанятамі...

У хуткім часе з'явіўся калгасны старшыня. Загадаў маці адразу збірацца і везці Яўгенку ў Басценавіцкую лякарню.

...А там пацягнуліся бядотныя дні як для сынка, так і маці. Страшэнны апёк не гаіўся. Макрэў і крывяніў. Поўніў болем сэрца матулі.

— Цярпі, малеча. Боль болем лечаць, — казаў медбрат.

А медсястра цётка Валя, асцярожненька змочваючы засохлы бінт, рабіла перавязку. Час цягнуўся нудотна. Радавала толькі вясновае сонейка і царкоўны звон. Непадалёку ад лякарні стаяла Басценаўская царква. З акна палаты Яўгенка любаваўся сонечнай гульнёй на залацістых крыжах, якія велічна са сваіх макавак цягнуліся ў неба да Бога.

Аднойчы ў нядзельную раніцу маці разам з іншымі хворымі панесла Яўгенку ў храм. Усё тут было надзвычай светла і прыгожа. Гарэлі свечкі, надаючы лікам святых таямнічасці і надзвычай прыцягальнай сілы. Пахі ладана злёгку кружылі дзіцячую галоўку. Такога яшчэ хлапчук не адчуваў у сваім кароткім існаванні на гэтым свеце. Маці тройчы перахрысціла Яўгенку. Кудысьці адышоў боль. І дзіцячая сэрцайка напоўнілася чымсьці таямнічым, раней невядомым для ягонай маленькай душы.

Пасля малебна маці панесла Яўгенку да святара на прычасце. Той з асаблівай пяшчотай паставіўся да хлопчыка. Салодкую лыжачку хлапчук прыняў надзвычай радасна.

Пасля прычасця святар сказаў маці некалькі слоў аб тым, што на твары хлопчыка бачыцца яму праменьчык Боскай ласкі. (Праз шмат гадоў, чытаючы вершы Сяргея Ясеніна, Яўген некалькі разоў перачытваў вершаваныя радкі: "Все живое особой метой // Отмечается с ранних пор". Перад ім тады паўставала аблічча айца святара падчас прычасця).

Глыбокі апёк ножкі з цяжкасцю паддаваўся лячэнню. Доктарка Дубіцкая, падчас абходу хмурыла твар і аднойчы сказала маці:

— Без народных сродкаў не абысціся.

Пачуўшы словы доктаркі, палатныя суседкі казалі:

— Варта засмажыць у чугунку жывога вожыка, і яго тлушчам мазаць апечаную ножку.

А затым, падчас адной з праходак, на вясковых могілках непадалёк ад лякарні ім натрапіўся вожык. Яўгенка ўзрадаваўся і вельмі прасіў маці забраць калючага звярка ў палату.

А сэрца маці смылела ад роспачы: засмажыць жывое стварэнне — вялікі грэх. Не зварыўся сын у кіпені, дык навошта губіць божае стварэнне такой лютай смерцю? Угаварыла хлапчука пакінуць на волі вожыка, бо яму наканавана радавацца вясне і сонейку.

Уцеху хворым прыносіў штодзённы царкоўны звон. Асабліва чакаў яго Яўгенка, кажучы маці, што ў яго душы пасяляецца радасць і боль зусім сціхае.

На чарговай перавязцы дзядзька Халімон падаў думку: знайсці заечага і гусінага тлушчу. Гэтым сродкам гаілі апёкі ў палявым шпіталі абгарэлым у танках франтавікам. Маці паімчалася ў свае Асмалавічы да кума Герасіма, які паляваў на зайцоў, і да цёткі Куліны, якая трымала на падворку гусіны статак. Для абваранага Яўгенкі знайшоўся ў добрых людзей гаючы сродак. Апёк павольна зацягваўся. Весялела дзіцятка, а матчына сэрца поўнілася Боскай надзеяй. Праз пэўны час Яўгенку выпісалі з лякарні...

...Лёсам было наканавана Яўгену пабачыць яшчэ і Афган. І тут душманскія кулі не кранулі. Прамень Боскай ласкі ратаваў праваслаўную душу. На апошняй сустрэчы мой сябра параіў мне перад сном хрысціцца і прамаўляць кароткую малітву: "Огради мя, Господи, силою Честного и Животворящего Твоего Креста, и сохрани мя от всякого зла".

Арт-пацеркі

Сёння ў Мінску ўрачыста адкрываецца V Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек. Да 8 кастрычніка гледачы маюць магчымасць знаёміцца з мастацтвам лепшых айчынных і замежных лялечных тэатраў. Прываблівающь нават самі назвы на афішы: "Таемнае" (Германія), "Вослік з Назарэта" (Славенія), "Крыжакі" (Бельгія), "Рамаяна" (Індыя)... Арыгінальныя пастаноўкі прывезлі ў Мінск тэатр "Гулівер" (Польшча), брытанскія, літоўскія, індыйскія, расійскія, чэшскія артысты. Сярод спектакляў нашых абласных лялечных тэатраў — "Песня пра зубра" (Брэст), "Памінальная малітва" (Гомель), "Голы кароль" (Маладзечна) і іншыя. 9 кастрычніка адбудзецца святочная вечарына, прысвечаная 70-годдзю Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек.

Адкрыў свой 81-ы канцэртны сезон Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі. Пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора калектыву — маэстра Аляксандра Анісімава прагучала разнастайная праграма, якая прадставіла рускую класіку розных часоў: славутую сімфонію № 2 Аляксандра Барадзіна з праграмнай назвай "Волатаўская", Першы канцэрт Дзмітрыя Шастаковіча для віяланчэлі з аркестрам, сюіты з балетаў "Раймонда" Аляксандра Глазунова ды "Канёк-Гарбунок" Радзіёна Шчадрына.

25 верасня, у дзень нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага, распачаў свой чарговы канцэртны сезон Ансамбль салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава. Калектыў выступіў у Малой зале імя Рыгора Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Новая праграма пад назваю "Мелодыі радзівілаўскіх паркаў" уключала творы Міхала Клеафаса Агінскага, Яна Давіда Голанда, Яна Абрахама Шульца і, вядома ж, Мацея Радзівіла. А таксама — нядаўнія сенсацыйныя знаходкі беларускіх даследчыкаў нашай даўняй музычнай культуры. Канцэрт адбыўся пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску.

Бенефіс заслужанага артыста Беларусі Віктара Манаева наладзілі ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. У той вечар купалаўцы паказалі "Пінскую шляхту" — нядаўнюю прэм'еру, у якой Віктар Манаеў стварае неверагодна вобраз станавога прыстава Кручкова. Пасля спектакля адбылася віншавальная імпрэза ў гонар 50-годдзя бенефіцыянта. Афіцыйныя і сяброўскія віншаванні дапоўніў капуснік — найлепшы падарунак ад купалаўцаў свайму калегу.

У верасні на сцэне Ялцінскага тэатра імя А. Чэхава праходзіў Міжнародны фестываль "Тэатр. Чэхаў. Ялта". Дзесяць творчых калектываў з Беларусі, Украіны ды Расіі прадставілі пастаноўкі паводле твораў вялікага класіка. Нашу краіну прадстаўлялі Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы і Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Купалаўцы, якія паказалі ў Ялце пластычны спектакль "С. В." паводле чэхаўскай п'есы "Вішнёвы сад", атрымалі дзве ўзнагароды. Самому спектаклю дастаўся прыз у намінацыі "Арыгінальнасць тэатральнай мовы сучаснай чэхавіяны", а выканаўцы ролі Купца Дзмітрыю Есяневічу — прыз у намінацыі "Лепшая мужчынская роля".

С. ВЕТКА

Вясёлка над Сожам

(Працяг. Пачатак на стар. 1)

У другі фестывальны дзень горад над Сожам святкаваў свой 866-ы дзень нараджэння.

На сцэне гарадскога Палаца культуры працягваліся конкурсныя выступленні ўдзельнікаў фестывалю — у народна-сцэнічным, эстрадным харэаграфічных жанрах, у намінацыі "брэйк-данс" (гэты від сучаснага танца ўпершыню быў уключаны ў конкурсную праграму — прыйшоў на змену мадэрну). Зусім непадалёк, у Палацы гульнявых відаў спорту, рабілі першыя "па" 250 пар удзельнікаў адкрытага турніру па спартыўных бальных танцах на кубак Гомеля "Залатая рысь".

Тым часам на цэнтральных вуліцах і ў раёнах абласнога цэнтра ўжо разгарнуліся шумлівыя кірмашы. Запрацавалі музейныя і кніжныя выставы, сваю унікальную прадукцыю прадстаўлялі ўмельцы з "Горада майстроў"... Гасцей сустракалі не толькі жартамі і песнямі: бясплатна частавалі наварыстай юшкай, аладкамі, а замежныя студэнты гомельскіх ВНУ — нацыянальнымі стравамі...

Адначасова разгортваліся і падзеі на галоўнай плошчы, дзе артысты Гомельскага абласнога драмтэатра ў асобах узнаўлялі старонкі гісторыі горада-імяніннка. А лепшыя калектывы і выканаўцы вобласці разам з замежнымі танцорамі і зоркамі беларускай эстрады — Ірынай Дарафеевай, Іскуі Абалян, Аляксеем Хлястовым, групай "Тяни-Толкай" падаліся "ў народ", на пляцоўкі гарадскіх мікрараёнаў...

Мовай танца — аднаго з самых старажытных і зразумелых відаў мастацтва — за тры фестывальныя дні ў Гомелі ствараліся маляўнічая, шматколерная і захапляльная карціна, імя якой "Сожскі карагод". Як заўсёды, надзвычай інтрыгаваў заключны акорд свята — вердыкт журы, што ўсе гэтыя дні натхнёна працавала пад "патранатам" народнага артыста нашай краіны, прафесара, мастацкага кіраўніка і галоўнага балетмайстра Дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь Валянціна Дудкевіча.

І вось — галоўны вынік: Гран-пры V Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва атрымалі расіяне — народны ансамбль танца "Калінка" з горада Навазыбкава. Мастацкаму кіраўніку гэтага калектыву Вользе Хахловай на сцэне Гомельскага абласнога драматычнага тэатра была ўручана статуэтка з сімвалам "Сожскага карагода" — выявай бусла, што імкнецца да нябеснай вышыні, а таксама Дыплом пераможцы.

— Я і сама — выхаванка гэтага калектыву, які існуе ў нашым горадзе 35 год. Вось ужо больш як дзесятак гадоў кірую "Калінкай", дзе займаюцца танцамі дзеці да 11-га класа, — распавяла расчуленая кіраўніца. *— Сёння проста рада, што наша праца тут, у Гомелі, гэтак высока ацэнена...*

Сярод прызёраў сёлетняга фестывалю ў розных жанрах і намінацыях —самабытны калектыў з расійскага Сургута, народны танцавальны калектыў "Тарадзенскія карункі" з горада над Нёманам, балет-студыя сучаснага танца "Алексіс" з Мазыра, аматарскі ансамбль танца гамяльчан "Гомій", група песні і танца "Малэ Падляссе" з Польшчы...

Што ж, дзякуй, фестываль, за яскравыя ўражанні. Да новых сустрэч, свята над Сожам!

Мікола ЖДАНОВІЧ
г. Гомель

На здымках: Гран-пры фестывалю "Сожскі карагод-2008" у руках Вольгі Хахловай — мастацкага кіраўніка ансамбля танца "Калінка" з расійскага горада Навазыбкава; імпрэзы ў святочным горадзе.

Фота аўтара

Сёлета адзначаецца 210 гадоў з дня нараджэння выдатнага паэта-рамантыка XIX стагоддзя Адама Міцкевіча. Па ініцыятыве Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Баранавіцкага райвыканкама, Польскага інстытута ў Мінску і Беларускага грамадскага аб'яднання "Фотамастацтва" ажыццяўляецца сацыяльна-культурны праект "Ёсць ў мяне зямля, край светлых мрояў...". У межах гэтага праекта адбыўся і летні Міжнародны фотапленэр "Па мясцінах Адама Міцкевіча".

У краі светлых мрояў

Вынік пленэру, праведзенага пры фінанасавай падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску ды Беларускага грамадскага аб'яднання "Фотамастацтва", прадстаўлены ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры: тут адкрылася прыгожая і цікавая выстаўка "Сцежкамі Адама Міцкевіча".

Фальварак Завоссе, возера Свіцязь, Валеўка, Варонча, Туганавічы, Навагрудак, Шчорсы, Карэлічы... Вандроўка фотамастакоў з Польшчы, Літвы і нашай краіны пралягала па беларускіх мясцінах, звязаных з асобай і жыццяпісам паэта, з біяграфіямі яго сяброў, родных. Рамантычны маршрут сабраў разам на тры незабыўныя чэрвеньскія дні беларускіх майстроў Юрыя Васільева, Валерыя Сібрыкава, Сяргея Плыткевіча, Валерыя Вядрэнку, Віктара Сядых, Наталлю Ракіцкую, літоўцаў Сігітаса Канцявічуса, Раймандаса Пуйшыса, Рамуальдаса Вайткуса ды знаных польскіх калег Ежы Пёнтака і Кшыштафа Макоўскага. У полі зроку пільных і натхнёных, зычлівых і заўсёды суб'ектыўных аб'ектываў апынуліся не толькі старыя дрэвы, ахінутыя легендамі маляўнічыя руіны, святыя муры, вясковыя краявіды, але і абліччы сучасных жыхароў тых памятных, ды можа, і забытых, і адкрытых наноў, мясцін...

Візуальная разнастайнасць, якой уражвае выстаўка, адлюстроўвае, вядома ж, не толькі багацце самой фактуры ці натуры, але і рознасць (нават часам да процілегласці) мастакоўскіх індывідуальнасцей. Што ні здымак — то адметны позірк, часам на той самы аб'ект, свая ступень абагульнення або дэталізацыі. Адсюль разнастайнасць і ракурсаў, і маштабу выяў, і тэхнік "светлапісу", і сэнсавых акцэнтаў — усіх складнікаў аўтарскага почырку, творчага стылю.

Фотамайстры трох краін глядзелі на радзінную Міцкевічаву Беларусь, на яго сцежкі праз настальгічную смугу стагоддзяў, многае ўбачылі ў повязі часоў, узнавілі неўміручы дух нашага вялікага суайчынніка — паэтычны і патрыятычны дух, які нібыта лунае ў прысадах Туганавіцкага парку, над свяшчэнным каменем брацтва філарэтаў, над радкамі рукапісу, спавітага музейнай цішынёй...

Прысутныя на фотавернісажы адзначалі, што ўдзельнікі пленэру шчыра ўспрынялі Адама Міцкевіча як гістарычную асобу, здатную аб'яднаць беларусаў, літоўцаў і палякаў. Такое ўспрыманне, безумоўна, падзяляюць многія звычайныя, але неабыякавыя гледачы — і тыя, што наведваюць выстаўку ў Мінску, і тыя, што чакаюць, калі яна завітае ў Навагрудак, Гродна, Варшаву, Вільнюс. Бо экспазіцыя прабудзе ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры да 18 кастрычніка, а потым рушыць у падарожжа. Далей, па сцежках паэта.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Фота Кастуся Дробава

Штрыхі да партрэта маладога творцы

Знаёмцеся: мастак!

Уладзімір Кандрусевіч-малодшы нарадзіўся ў Мінску ў 1976 годзе. Скончыў аддзяленне манументальнага жывапісу Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У 2001 годзе стажыраваўся ў Італіі, дзе вывучаў тэхніку выканання фрэсак. Меў персанальныя выставы ў Швейцарыі, Германіі. Увосень 2007-га мастацкая галерэя "ЛаСандр-арт" зладзіла яго персанальную выставу пад назовам "Гарадскія гульні".

За тоўстымі цьмянымі шкельцамі аўтобуса плаўна слізгалі, а потым імкліва праносіліся урбаністычныя малюнкі сучаснага жыцця. Шалёна круціліся колы, няспынна адлічваючы імгненні існавання недасканалага механізму. Бабулька-Зямля як звычайна з жахлівай хуткасцю неслася ў чорнай бездані космасу, шырэў Сусвет. І ўся гэтая ўтрапёнасць знаходзілася на кончыку іголкі, што гафтавала Палатно Быцця гэтак спрытна, як толькі можа вышэйшае стварэнне.

Але яшчэ хутчэй змяняліся думкі ў маёй галаве. Як пазнаць чалавека, якога ніколі не сустракаў, ведаеш толькі куцыя ўрыўкі няпэўнай інфармацыі пра яго? Пошук шляхоў найменшага супраціўлення — ганебная ўласцівасць чалавечай натуры, але я хацеў менавіта гэтага: каб усё склалася як мага прасцей. Фантазія малявала, як сярод гучных грубых выкрыкаў маіх суседзяў-пасажыраў чуецца спакойная беларуская мова —выратавальная тычка, што і прывядзе мяне да чалавека, якога я шукаю. "Аддаюся ў абдымкі плыні", — кажу я сам сабе. "Аддасі сябе ў абдымкі плыні", — чуецца ў свісце й шыпенні пнеўматычных механізмаў дзвярэй, што выпускаюць мяне на волю.

Прырода з Лёсам у хаўрусніках зрабілі куды прасцей, чым мне меркавалася: Уладзіміра Кандрусевіча-малодшага я прыкмеціў на прыступках МДЛУ за добрую сотню метраў, забыўшыся на дрэнны зрок. І хаця сумнеў не адпускаў мяне — пакуль не павіталіся, штосьці ў глыбіні мне няспынна паўтарала: "Не памыляешся"...

Пачнём праМовы

Вось і першае пытанне да мастака:

— Уладзімір, для вас размаўляць па-беларуску — гэта жыццёвы прынцып ці ўнутранае запатрабаванне?

— Сёння я размаўляю не толькі па-беларуску. Вось пачуў, як вы звярнуліся да мяне на беларускай мове, і адказаў адпаведна. У штодзённым жыцці я пераключаюся паміж мовамі, але ж быў час, калі я прынцыпова размаўляў па-беларуску. Ну, а чаму б у Беларусі не размаўляць па-беларуску?

— Скажыце, як сталася, што вы валодаеце сямю мовамі?

— Наколькі валодаю — тое вельмі адносна. Проста вывучаў у розныя часы шэраг замежных моў і валодаю імі ў рознай ступені. Мне ад маці дасталіся пэўныя здольнасці да моў. Дый вымушалі абставіны: у школе я вывучаў французскую, калі вучыўся ў Акадэміі, мне прапанавалі паехаць у Швейцарыю, але для гэтага трэба было ведаць англійскую мову. Ну, а потым, як снежны камяк, пачало абрастаць: Швейцарыя — шматмоўная краіна, там у розных мясцінах нямецкая, італьянская мовы і гэтак далей.

ГаРОДня

— Я нарадзіўся ў Мінску, — распавядае мастак, — а вось мой бацька (знаны кампазітар Уладзімір Кандрусевіч. — **З. Ш.**) паходзіць з Гародні. Увогуле шмат Кандрусевічаў адтуль, з Гарадзеншчыны. У вёсцы Жорнаўка ёсць могілкі — цалкам Кандрусевічаў.

Мне сам гэты горад вельмі падабаецца сваёй непаўторнай атмасферай, нягледзячы на тыя архітэктурныя змены, што там адбываюцца. Для мяне Гародня — такі еўрапейскі ўтульны і невялікі гарадок. І здаецца, яму зусім не пасуе, калі там спрабуюць здзейсніць нейкія амбітныя архітэктурныя планы з відавочнай арыентацыяй на іншыя беларускія гарады.

— Ёсць жаданне штосьці змяніць?

— А я сваёй справай займаюся, — глыбока і шматзначна кажа мастак.

Дом, хор, фрэскі

— Уладзімір, у вашай сям'і яшчэ былі мастакі?

— Так, напрыклад, мой дзед — Натан Воранаў. У 2016 годзе споўніцца 100 гадоў з дня яго нараджэння. Спадзяюся, што яго імя яшчэ ўспомніцца. Ён вучыўся ў Ленінградзе, а потым многія з беларускіх мастакоў вучыліся ў Натана Воранава. Нейкі час ён быў старшынёй Саюза мастакоў БССР.

— А чаму вы пайшлі менавіта па дзедавых слядах?

— Магчыма, проста здольнасці праявіліся, таксама атмасфера была спрыяльная, творчая ў доме. Да музыкі ў мяне няма асаблівых здольнасцей: спрабаваў спяваць, дык заўважылі, што слыху няма. Гадоў, мабыць, пяць таму я пачаў хадзіць у хор. Спяваць у мяне ніколі асабліва не атрымлівалася, але гэтую "сцяну" хацелася прабіць. Я стараўся шмат займацца, і, у прынцыпе, трапляць у тон ужо атрымліваецца. Калі сярод выканаўцаў харавой партыі ёсць упэўнены чалавек, то пад яго падладзіцца не праблема. Я хорам даволі актыўна займаўся, таму ў маёй творчасці гэта адбілася. У 2003 годзе ў Браславе была выстава "Унісон", дзе выстаўлялася шмат маіх карцін, прысвечаных менавіта музычнай тэматыцы. Так што ў нейкай ступені я навучыўся спяваць, на побытавым узроўні, прынамсі, прыемна паспяваць свае ўлюбёныя песні.

— Кажучы "ўлюбёныя песні", вы якую музыку маеце на ўвазе?

— О, то вельмі складанае пытанне! — смяецца мастак. — Быў час, калі я вельмі захапляўся французскімі выканаўцамі: Джо Дасэн, Патрысія Каас ды іншыя. Але цяпер для мяне гэтая музыка ў стане настальгіі, ужо не актуальная.

— Раскажыце, калі ласка, пра сваю працу ў Полацкім касцёле.

— Працэсам аздаблення новага касцёла кіраваў скульптар Валяр'ян Янушкевіч, і менавіта ён прапанаваў мне паўдзельнічаць у гэтай справе. Сам ён рабіў скульптуру, а я пад яго кіраўніцтвам ствараў фрэскі. Дарэчы, над гэтым праектам я пачаў працаваць, калі рабіў дыпломную працу ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, для самога дыплома рабіў тры фрэскі, а пасля завяршэння дыпломнай працы — яшчэ дзве.

— Ці ладзіўся якісьці асаблівы абрад, кшталту бласлаўлення, каб дапусціць вас да працы ў касцёле?

— Людзі часта ўяўляюць сабе, што калі ты працуеш у касцёле, дык мусіш нічога не есці, барадою абрасці, ні з кім не размаўляць і гэтак далей. Навошта гэта? На мой погляд, кожная праца павінна выконвацца сумленна, мастак ты альбо дворнік — гэта ўсё адно: людзі будуць хадзіць і бачыць тую чысціню, якую ты ствараеш, і ім будзе прыемна. У жывапісе ўсё адпаведна. А наконт бласлаўлення... Была згода святара, але адмысловага рытуалу — не.

— А спецыфіка такой працы?

— Сама па сабе тэхніка фрэсак даволі спецыфічная. І хаця ў Акадэміі мастацтваў на аддзяленні манументальнага жывапісу праходзілі гэтую тэму, ёсць шмат нюансаў, якія выяўляюцца, калі ты пачынаеш працаваць. Таму я і паехаў на стажыроўку ў Італію, а дакладней у Фларэнцыю, да рэстаўратараў, якія займаюцца аднаўленнем італьянскіх фрэсак. Вось там я высвятляў менавіта тэхнічныя пытанні.

— Вы пакінулі адбітак сваёй працы ў Італіі? — пытаюся з непрыхаваным захапленнем.

— У асноўным я працаваў у рэстаўрацыйных майстэрнях. Увогуле я там цікавіўся не столькі праблемамі творчасці, колькі тэхнічнымі пытаннямі: фарбамі, пэндзлямі, якімі карысталіся італьянскія мастакі. Таксама хацелася "набрыняць" той атмасферай, культурай, што лунае ў Фларэнцыі на кожным кроку. Незабыўныя будыніны, памяшканні, напрыклад, келля тры на тры метры, дзе адно акно глядзіць у горад, а побач фрэска з выявай акна ў нейкае іншае вымярэнне, іншы свет. Гэта зрабіла на мяне найвялікшае ўражанне.

Позірк у мінулае...

Цяпер не вельмі лёгка сустрэць чалавека, які ведаў бы хоць слова "дрэварыт", ужо не кажучы пра семантычны бок тэрміна.

*Дык вось, дрэварыт, альбо ксілаграфія (ад грэч. **xylon** — дрэва і **grapho** — пішу, малюю) — гравюра на дрэве, у якой друкарская форма (кліша) выконваецца гравіраваннем драўлянай дошкі. Адрозніваюць абразную ксілаграфію (гравіруюць дошкі падоўжанай распілоўкі) і тарцовую (гравіруюць дошкі папярочнай распілоўкі). Дрэварыт у Беларусі з'явіўся на пачатку XVI ст. "Якое дачыненне мае старажытны спосаб мастацкай апрацоўкі матэрыялу да нашага героя?" — спытаецеся вы. А вось якое...*

— Нейк я пазнаёміўся з людзьмі, — распавядае Уладзімір, — якія займаюцца эксперыментальнай археалогіяй. На падставе археалагічных раскопак яны спрабуюць перастварыць, стварыць нанова, знойдзеныя артэфакты. Знаходзяць, напрыклад, сякеру і задаюцца пытаннем: а як яна магла быць зроблена? Праз эксперымент яны распрацоўваюць старажытныя спосабы стварэння розных рэчаў і, так бы мовіць, "культурных з'яў", мэты іх выкарыстання. Эксперыментальная археалогія мае значную колькасць пэўных кірункаў: пісьменства, здабыча агню, ганчарства, апрацоўка дрэва і інш. У Беларусі яна ўсплывае ў розных праявах: гэта фэсты ў Нясвіжы, Міры і г. д. Вось і мне цікава было далучыцца: па-першае, нейк паўдзельнічаць у гэтых фэстах, імпрэзах, а па-другое, нейкая частка мяне, зацікаўленая гісторыяй, такім чынам знайшла выйсце, сваю матэрыяльную праяву. Мяне зацікавіла тэхніка дрэварыту, якая сама па сабе крыху няўклюдная, бо тут на паўудыху, як у афорце, нажом трэба весці лінію і адначасова змагацца з супраціўленнем матэрыялу (наш герой займаецца абразной гравюрай, дзе лінія вядзецца нажом; у тарцовай гравюры — штыхелем. — **З. Ш.**). І вось у гэтым змаганні адчуваецца нейкі адбітак часу. На мой погляд, гэта быў бы цікавы кірунак, напрыклад, у аздабленні эксклюзіўных кніг.

... і на сучаснасць

Восень 2007 года падарыла сталічнаму аматару жывапісу выставу Уладзіміра Кандрусевіча-малодшага "Гарадскія гульні". Экспазіцыя, нібы шырока расхінутае акно, паказала ўласны позірк мастака на існаванне ў горадзе.

— Выстава "Гарадскія гульні" прысвячалася сучаснаму гарадскому жыццю. Я заўважыў, што вельмі многа мастакоў нараджаецца і вырастае ў горадзе, яны ўсмоктваюць гэтую гарадскую атмасферу, культуру. Але, калі ідзе размова пра культуру беларускую, то зараз жа згадваюць лапці, поле, жняю, бульбу ці вясковыя краявіды ўвогуле. Гэта нядрэнна, бо былі і ёсць мастакі, што нарадзіліся і прыйшлі ў гарадское асяроддзе з вёскі, для іх гэтая тэматыка вельмі блізкая. Але я хацеў звярнуцца менавіта да гарадской тэмы, каб паказаць людзям, што вакол нас, у горадзе, адбываецца таксама шмат адметнага. Некалькі карцін прысвечаныя канкурэнцыі ў гарадскім грамадстве. (Прыкладам, "Шахматы", 2007 г., палатно, алей. — **З. Ш.**). Я вось адпачываў на Браслаўшчыне: шорты, шлапакі — больш табе там у прынцыпе нічога не патрэбна. А ў горадзе колькі ўсяго лішняга! Ходзіш па ім, і цябе ўсюды ацэньваюць: адзежу, машыну... У грамадскім транспарце, нават у краме адбываецца нейкае "супрацьстаянне". Дый і іншыя гарадскія працэсы сваёй творчасцю хацелася зачапіць.

♦

Зачапіла яна, паважанае спадарства, не толькі працэсы, але і людзей, у прыватнасці, мяне, прадстаўніка гарадской моладзі, ганаровага носьбіта кедаў і доўгіх валасоў. А цяперашняя восень з галерэяй "ЛаСандр-арт" і нашым героем, Уладзімірам Кандрусевічам-малодшым, зноўку рыхтуюць творчы падарунак — новую выставу мастака. Пойдзем глядзець!

Захар ШЧАРБАКОЎ

Фота аўтара

Кіно будзе!

15 лістапада ў Палацы Рэспублікі адбудзецца святочнае адкрыццё XV юбілейнага Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад-2008". Пра падрыхтоўку да гэтай падзеі гаварылася на нядаўняй прэс-канферэнцыі, якая адбылася ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

"У гэтым годзе ў конкурсных і пазаконкурсных паказах будуць прадстаўлены фільмы з 45 краін свету. Упершыню — з Нарвегіі і Мексікі. Чакаецца прыезд на "Лістапад" такіх знакамітых кінематаграфістаў, як Эмір Кустурыца і Кшыштаф Занусі. Падчас адкрыцця кінафестывалю плануецца паказ карціны "У кожнага сваё кіно", якою адкрываўся юбілейны Канскі кінафестываль у 2007 годзе", — расказаў журналістам старшыня ММКФ народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі.

Дырэктар Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад" Валянціна Сцяпанава паведаміла, што ў конкурснай праграме возьмуць удзел 18 фільмаў рэжысёраў розных краін. Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" прадставіла на "Лістапад" прэм'еры гэтага года: "На спіне ў чорнага ката" (рэжысёр Іван Паўлаў), "Шчыт Айчыны" (рэжысёр Дзяніс Скварцоў) і "Чарада" (рэжысёр Дзмітрый Зайцаў). "Лістапад" пакажа толькі фільмы, якія ўжо атрымалі добры розгалас і ўзнагароды на вядомых кінафорумах у свеце.

Тры журы будуць ацэньваць работы, прадстаўленыя на конкурс. Сёлета старшыня міжнароднага журы кінематаграфістаў— знакаміты рэжысёр з Расіі Валерый Тадароўскі. Журы кінапрэсы ўзначаліць Людміла Саянкова — загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ, а журы гледачоў — рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Барыс Святлоў. Традыцыйна галоўныя ўзнагароды фестывалю — Золата, Срэбра і Бронза "Лістападу" — размяркуюцца паводле вынікаў галасавання гледачоў, згодна набранаму карцінамі рэйтынгу.

Свой пятнаццацігадовы юбілей "Лістапад" сустрэне ў новым фармаце: упершыню ў конкурснай праграме будуць спаборнічаць тэлевізійныя фільмы, сярод іх стужкі Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм": "Цень самурая", "Пакуль мы жывыя", "Рыфмуецца з любоўю", "У чэрвені 41-га...". Журы ацэніць і работы дакументалістаў.

Міжнародны кінафестываль дзіцячых і юнацкіх фільмаў "Лістападзік" сёлета таксама святкуе свой юбілей — 10 гадоў! Апроч паказу лепшых фільмаў, плануюцца творчыя сустрэчы з вядомымі акцёрамі і рэжысёрамі дзіцячага кіно. Сярод іх заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, рэжысёр-аніматар Барыс Грачэўскі. Конкурсныя паказы адбудуцца ў кінатэатры "Піянер" і ў Доме кіно. Так што дзецям сумаваць таксама не давядзецца.

Уладзімір ПАДАЛЯК

«Мой хросны бацька — Сталін...»

Эсэ

А было гэта так. Неяк завіталі мы на Камароўскі рынак — добра вядомую "Камароўку" — самы вялікі ў стольным горадзе Мінску, каб купіць сяготаго — смачных далікатэсаў, "смачнэго", як казаў наш паважаны Віценька, наш добры сябар, рэдактар у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, дзе мы працавалі.

Накупілі ўсяго: і сырога мяса, і сала, і вэнджанага, і па колцу розных каўбас, і рэбраў, і ад кумпяка і ад паляндвіц мажныя кавалкі. Еш ад пуза!

— А ці не купіць да нашых мясаў яшчэ хрэну з гарчыцай! — прапанаваў Слава.

— А чаму і не! — падтрымаў яго Міхась.

І мы дружна рушылі туды, дзе прадаюць і хрэн, і гарчыцу.

Прайшліся па гандлёвых прылаўках. Усяго навалам, абы толькі грошы. Крыху асобна ад асноўнай масы гандляроў на крайку даўжэзнага гандлёвага стала прадае хрэн у слоічках з-пад маянэзу — белы, па колеру зусім звыклы і зафарбаваны бурачковым сокам — бурачковы, такі вось вясковы акуратна апрануты дзядок.

Мы накіраваліся да яго.

— Які б нам прапанавалі купіць у вас хрэн? — пытаюся я.

— Вазьміце вось гэты бурачковы, "прадсядацельскі"!

— А чаму "прадсядацельскі" — пытае Слава.

— Яго ўвесь час купляе былы прадсядацель урада Беларусі!

— ?

— А хто ён? — пацікавіўся я.

— Добра не ведаю, завуць яго Іван Сямёнавіч!

— А калі ён у вас купляе? — пытае Міхась.

— Кожную сераду! Прыходзіць каля 11 гадзін.

— Значыць, будзе заўтра?

— Так!

Мы купілі па дзве маянэзныя слоічкі "прадсядацельскага" хрэну, падзякавалі дзядку за пакупку і падаліся на працу.

Назаўтра а 10 гадзіне (хлопцам не выпала далучыцца да мяне) я ўжо быў на Камароўскім рынку. Падышоў да дзядка. Прывітаўся. Дзядок мне кажа:

— Яшчэ не было!

Шпацырую між гандлёвых прылаўкаў, бавячы час, а сам не зводжу вачэй з краю стала, дзе гандлюе дзядок. Ажно гляджу, важна падыходзіць да дзядка высокі, плячысты, ужо ў гадах мужчына, з густам, акуратна апрануты — светлы аднаборты гарнітур, белая сарочка, спакойнага колеру ў тон гарнітура гальштук.

Павітаўшыся з дзядком за руку, як даўні знаёмы, бярэ ў яго тры слоічкі "прадсядацельскага" хрэну.

"Значыць ён!" — рашаю я і хуценька падыходжу да яго.

— Мне таксама такога "прадсядацельскага" хрэну два слоічкі! — кажу дзядку.

І адразу ўступаю ў размову з пакупніком:

— А ці не ў ваш гонар названы гэты зафарбаваны далікатэс?

— Можа! Не ведаю! — сціпла адказвае ён.

— Вы сапраўды былі старшынёю ўрада Беларусі?

— Так! Цяпер я пенсіянер, а быў старшынёю Савета народных камісараў БССР да вайны і ў час вайны! Прозвішча маё Былінскі Іван Сямёнавіч.

І працягвае руку для знаёмства.

Я хуценька ўключыў, вобразна кажучы, у працу свой "мазгавы камп'ютэр" — няма ў маёй галаве ніякіх дадзеных пра Былінскага!

— Я супрацоўнік Беларускай Савецкай Энцыклапедыі Анатоль Іосіфавіч Валахановіч і вельмі рады пазнаёміцца з вамі бліжэй!

— Калі ласка! Я таксама!

Мы абменяліся тэлефонамі. У рэдакцыі гісторыі КПСС, КПБ СССР і БССР, дзе я працаваў, мы дамовіліся сустрэцца з ім і даць у Беларускую Савецкую Энцыклапедыю пра яго артыкул. Праз два дні Іван Сямёнавіч Былінскі патэлефанаваў мне на працу. Дамовіліся сустрэцца праз дзве гадзіны.

І вось Іван Сямёнавіч Былінскі ў нас. У рэдакцыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Прысеў на крэсла і пачаў распавядаць пра сябе:

— Нарадзіўся я ў вёсцы Якубоўка, што на Гомельшчыне, 28 студзеня 1903 года. Паходзіў з сям'і чыгуначніка. У 1936 годзе скончыў Гомельскі лесатэхнічны інстытут, у 1920—1926 гадах працаваў слесарам паравозавагонарамонтнага завода, сакратаром камітэта ЛКСМБ Залінейнага раёна горада Гомеля, сакратаром Бабруйскага акруговага камітэта ЛКСМ Беларусі. У 1927—1931 гадах — намеснікам дырэктара Белкалгасбудтрэста. У 1938—1939 гадах кіраваў Белтрэстам фанернай прамысловасці, у 1939 годзе працаваў інструктарам, потым загадчыкам аддзела лясной прамысловасці ЦК КП(б) Б, з сакавіка 1940 года першым сакратаром Палескага абкама КП(б)Б, з 28 чэрвеня 1940 года стаў Старшынёй СНК БССР.

У 1940 годзе, як толькі мяне рэкамендавалі на Бюро ЦК КП (б)Б на пасаду старшыні СНК БССР, а гэтая пасада, як вядома, зацвярджалася ў Маскве, мы з тагачасным першым сакратаром ЦК КП(б)Б Панцеляймонам Кандратавічам Панамарэнкам паехалі ў Маскву.

Былі на прыёме ў Сталіна. Сядзім у яго кабінеце. Цішыня. Каб ляцела муха, было б чутно.

Чытае Іосіф Вісарыёнавіч "аб'ектыўку". Маўчыць. Потым:

— Прозвішча нейкае "лошадиное". А давайце зробім так! — на добрым грузінскім акцэнце кажа, невядома да каго з нас звяртаючыся.

Узяў чырвоны, па-майстэрску адточаны аловак і закрэсліў у маім прозвішчы дзве першыя літары. З кабінета Сталіна я выйшаў з новым прозвішчам — Былінскі. Мы ведалі, што Сталін часам мяняў прозвішчы. Напрыклад, народнаму камісару ўнутраных спраў БССР Лаўрэнцію Фамічу Джанджгава — на Цанава, імя па бацьку Маршалу Савецкага Саюза Канстанціну Канстанцінавічу Ракасоўскаму — Ксаверавіч памяняў на Канстанцінавіч.

Справа ў тым, што для Сталіна вымаўленне гэтых слоў было складаным, і гэта было звязана з артыкуляцыяй яго голаса.

Панцеляймон Кандратавіч Панамарэнка з Масквы дае ўрадавыя тэлеграмы ў Мінск у СНК БССР і ЦК КП(б)Б сустракаць новага старшыню СНК Беларусі Былінскага. У Мінску — перапалох, вэрхал. Толкам не разабраўшыся, думалі, што Масква дае новага, свайго старшыню ўрада Беларусі. А потым, як разабраліся, то аказалася, што той жа самы, але толькі з крыху скарочаным прозвішчам.

Вось так воляю лёсу я з Кабылінскага стаў Былінскім, а маім хросным бацькам быў сам Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. З пачатку 1944 года я працаваў намеснікам старшыні СНК БССР, з кастрычніка 1944 года да ліпеня 1946 года першым сакратаром Палескага абкама Кампартыі Беларусі, потым намеснікам міністра, міністрам лясной гаспадаркі, намеснікам міністра сельскай гаспадаркі БССР, начальнікам Галоўнага ўпраўлення лясной гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР. Быў членам бюро ЦК КП(б)Б, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і БССР. Маю дзяржаўныя ўзнагароды: ордэн Леніна, тры іншыя ордэны, шмат медалёў. Вось кароткая мая біяграфія.

І кладзе мне на стол стандартны ліст паперы, дзе акуратна надрукавана яго біяграфія і сваю фотакартку тых часоў, калі ён быў на пасадзе старшыні Савета народных камісараў БССР.

Так мы пазнаёміліся з цікавым чалавекам, сціплым, сумленным, не ганарлівым, добрым.

У другім томе Беларускай Савецкай Энцыклапедыі мы яшчэ паспелі змясціць кароткую біяграфію Івана Сямёнавіча Былінскага і далі яго партрэт. І з нашай, як кажуць, "лёгкай рукі", Іван Сямёнавіч Былінскі быў уключаны ў многія энцыклапедычныя выданні, якія пазней выходзілі ў Беларусі.

І ў дзядка, і ў нас, супрацоўнікаў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, пра Івана Сямёнавіча Былінскага засталася добрая памяць пра сустрэчы з ім.

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

Фота Кастуся Дробава

Беларусы ў Польскай арміі

У 2005 годзе, калі ўвесь свет адзначаў перамогу над германскім нацызмам, у Мінску выйшла ў свет фундаментальная калектыўная манаграфія «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945» пад рэдакцыяй прафесара Аляксандра Кавалені. Адным з яе аўтараў быў малады беларускі ваенны гісторык Юрый Грыбоўскі. Потым была паспяховая абарона яго кандыдацкай дысертацыі ў спецыялізаваным Савеце Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Малады гісторык Юрый Грыбоўскі праз год у Санкт-Пецярбургу выдаў самастойную манаграфію "Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918—1945".

Кніга распавядае пра малавядомыя і невядомыя шырокаму чытачу старонкі беларуска-польскай гісторыі — удзел беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ва ўзброеных сілах 2-й Рэчы Паспалітай, польскіх вайсковых фарміраваннях пад камандаваннем заходніх саюзнікаў, а таксама Войску Польскім на савецка-нямецкім фронце ў час Вялікай Айчыннай вайны. У манаграфіі Ю. Грыбоўскага даследуецца стаўленне польскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці да выканання вайсковага абавязку, аналізуецца палітыка польскіх улад да жаўнераў-беларусаў, паказваецца змаганне нашых землякоў на франтах Другой сусветнай вайны.

Рэцэнзуемая кніга адрасавана навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам, усім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі, гісторыяй Першай і Другой сусветных войнаў. У прадмове Юрыя Грыбоўскага да чытачоў ёсць такія радкі: "Шчыра спадзяюся, што гэтая праца паспрыяе выпраўленню гістарычнай праўды, знішчыць яшчэ адну белую пляму ў гісторыі беларускага народа. Кніга з'яўляецца своеасаблівай данінай пашаны землякам, імёны якіх доўгія гады несправядліва былі забытыя, а іх гераічныя ўчынкі знаходзіліся ў нябыце. Доўгія гады на Радзіме іх абміналі ўрачыстасці і віншаванні з нагоды Дня Перамогі..."

У апошнія гады ў Рэспубліцы Беларусь і ў замежных краінах выйшлі кнігі і артыкулы, якія прама ці ўскосна асвятляюць удзел беларусаў у Польскай арміі ў 1918—1945 гадах. Чым жа істотна адрозніваецца ад іх манаграфія Ю. Грыбоўскага "Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918—1945"?

Па-першае, калі папярэдняя літаратура разглядала дадзеную праблему фрагментарна, то кніга Ю. Грыбоўскага ўяўляе сабой цэласнае комплекснае даследаванне гэтай тэмы на працягу амаль трох дзесяцігоддзяў.

Па-другое, у ёй упершыню прыводзяцца дакументы з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі, Польшчы і Літвы, а таксама са шматлікіх апрацаваных успамінаў, зыходзячы з якіх аўтар прыйшоў да высновы, што ўдзел прадстаўнікоў беларускага народа ў шэрагах польскіх рэгулярных узброеных фарміраванняў з'яўляецца яскравым сведчаннем сапраўднай салідарнасці і баявога братэрства двух народаў.

Па-трэцяе, ні ў адным папярэдніх выданняў не дадзена такая шырокая геаграфія ўдзелу беларусаў у фарміраваннях Польскай арміі. Тут і Польшча, і СССР, і Францыя, і Італія, і Вялікабрытанія, і Сярэдні Усход, і Заходняя Еўропа, і Іран, і Мексіка, і Усходняя Афрыка, а таксама добраахвотнікі-беларусы з краін Паўднёвай Амерыкі.

Па-чацвёртае, асаблівую каштоўнасць маюць «Даведачныя матэрыялы», прыведзеныя на 623-й — 715-й старонках кнігі. Сярод іх дадатак 3 — «Беларусы ў Войску Польскім паводле радоў войск», дадатак 14 — «Абмежаванні для нацыянальных меншасцей у Войску Польскім, прадугледжаныя Міністэрствам вайсковых спраў», дадатак 23 — «Польскія ваеннапалонныя беларускага паходжання, накіраваныя вольнанаёмнымі іншаземнымі працоўнымі ў прамысловасць і сельскую гаспадарку Нямеччыны з траўня 1940 па снежань 1942 г.», дадатак 25 — «Беларусы-вайскоўцы Войска Польскага, вызваленыя з лагераў ваеннапалонных у СССР у кастрычніку 1939 г.», дадатак 31 — «Польскія ваеннапалонныя беларускай нацыянальнасці са Старабельскага лагера, якія адмовіліся ўступіць у Польскую армію», дадатак 47 — «Афіцэры-беларусы ў пяхотных злучэннях польскіх узброеных сіл у СССР», дадатак 50 — «Працэнтная колькасць ураджэнцаў Заходняй Беларусі сярод афіцэрскага складу пяхотных злучэнняў 1-й арміі Войска Польскага (1944—1945)».

У адрозненне ад папярэдняй літаратуры, кніга Ю. Грыбоўскага добра ілюстраваная. У ёй змешчаны 184 фатаграфіі і факсіміле цікавых дакументаў, большасць з якіх апублікавана ўпершыню, а таксама прыведзены паказальнік імён.

Ацэньваючы рэцэнзуемую манаграфію Ю. Грыбоўскага, трэба адзначыць, што гэта даследаванне ўяўляе сабой істотны ўклад у беларускую і еўрапейскую гістарычную навуку.

На дзесятках прыкладаў аўтар кнігі пераканаўча даказаў, што польскія вайскоўцы беларускага паходжання вызначаліся гераічнымі ўчынкамі і самаахвярнасцю падчас баявых дзеянняў супраць нямецкіх войск. Прааналізаваўшы шырокае кола разнастайных крыніц, аўтар манаграфіі прыходзіць да наступнага заключэння: "Такім чынам, удзел беларусаў у польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях падчас Другой сусветнай вайны з'яўляецца яскравым фактам вайсковай і грамадзянскай салідарнасці беларусаў і палякаў у змаганні супраць супольных ворагаў. Мы смела можам сцвярджаць пра сапраўднае братэрства зброі гэтых народаў, змацаванага крывёй і добраахвотнасцю...".

Безумоўна, манаграфія Ю. Грыбоўскага «Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918—1945» — своеасаблівы помнік тысячам нашых суайчыннікаў, якія мужна змагаліся з германскім нацызмам.

Эмануіл ІОФЕ,
прафесар БДПУ імя М. Танка,
доктар гістарычных навук.

Дыханне паэзіі

З «Туркменскай кнігі»

Туркменскія паперы, газетныя выразкі, асобныя часопісы – у бальшыні сваёй усё гэта і цяпер з'яўляецца бессістэмным зборам, які па-ранейшаму не ў Мінску, а ўсё яшчэ "хаваецца" для мяне ў Пухавічах. Прычыны на тое вельмі простыя. У красавіку 1988 года ўжо канчаткова было ясна, што наступным, пасля Ашхабада, месцам службы стане для мяне Куба. Маючы мо не болей, як тыдзень-паўтара на зборы (трэба было выбірацца ў Адэсу, дзе нас павінны былі загрузіць на цеплаход, пераапрануўшы ў цывільнае і назваўшы сельскагаспадарчымі спецыялістамі), мы з жонкай вырашылі пазваніць бацькам, каб па магчымасці прыехалі. Літаральна за два дні перад адлётам ці мо за дзень нават з Мінска прыляцелі мой і жончын бацькі. Рэчы ўсе былі сабраны, звязаны. Кнігі, паперы – у стосіках, кардонных каробках. Цесць і бацька адпраўлялі кантэйнер, у якім ці не аснову складаў мой "ашхабадскі архіў". А сам спрычыніцца да яго разбірання я змог ужо толькі ў чэрвені 1990 года, калі вярнуўся з Кубы. Але ж яшчэ пяцігодку жылі ў Мінску без кватэры. І разбіранне тое, як і хуткая адпраўка з Ашхабада, характар мела бессістэмны. То многае і падаецца страчаным, а мо і сапраўды страчана.

...Выпадкова патрапіў на вочы лісток, вырваны, пэўна, з агульнага вялікага сшытка. Нешта кшталту дзённікавага запісу, які я зрабіў, відаць, адразу пасля чарговай сустрэчы з Керымам Курбаннепесавым. "...Вечарам быў у Керыма... Доўга гутарылі. Керыму расказаў пра перадачу пра Андрэя Вазнясенскага. Асабліва Керыму спадабалася выказванне, што Высоцкі — само сумленне паэта ці сумленне народа. Керым пазаўчора быў у Тэджэне. У раённым доме культуры праходзіў вечар памяці Курбанназара Эзізава. З-за гэтага і паехаў туды Керым. Былі з паэтам і жонка Курбанназара, яго дочкі. Ездзіў у Тэджэн і Арэ Дашкынаў, брат Курбанніяза (размова пра Курбанніяза Дашкынава, паэта, сябра Курбаннепесава — **А. К.**). Чытаў свае вершы. Гаварылі пра падабенства. Пра класікаў. Керым назваў сваіх настаўнікаў — Махтумкулі, Маланепес, Пушкін, Твардоўскі. Сказаў, што займаецца не голым наследаваннем, а найперш вучыцца ў іх..."

Керым Курбаннепесаў — цэлая эпоха ў туркменскай паэзіі. Творца, які выпеставаны нацыянальнай літаратурай. І разам з тым — майстар, які вырваўся за межы нацыянальнага, здолеў зазірнуць у шырокі і бязмежны свет.

...У Ашхабад я патрапіў у жніўні 1985 года. Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча атрымаў размеркаванне ў Туркестанскую ваенную акругу. Штаб, палітупраўленне — у Ташкенце. Недзе з тры тыдні пахадзіў па калідорах штаба. А 20 ці 21 жніўня быў у Ашхабадзе. На першым плане, канечне ж, — служба карэспандэнтам-арганізатарам салдацкай "шматтыражкі" "За Родину" (вайсковыя газеты называліся ўвогуле без фантазіі — «Защитник Родины», «Во славу Родины», «Слава Родины»...). Тры супрацоўнікі: апроч карэспандэнта-арганізатара, рэдактар і адказны сакратар. Выпуск — тры разы на тыдзень па дзве паласы фарматам А3. Дывізія — не малая, болей за 10 тысяч салдат і афіцэраў. Рыхтуецца папаўненне ў "Афган" па многіх спецыяльнасцях. Ды ўжо першыя (выпадковыя, як тады падавалася, знаёмствы) сустрэчы з музейнымі работнікамі, ашхабадскімі журналістамі зводзілі мяне з "правільнай" сцяжыны ваеннага журналіста. А яшчэ важкую ролю адыгрывала тое, што рэдакцыя і друкарня знаходзіліся ў цэнтры горада.

Ужо позняй восенню 1985 года, дзякуючы навуковаму супрацоўніку Гістарычнага музея ТССР Герою Савецкага Саюза Івану Васільевічу Багданаву, знаёмлюся з пісьменнікам Мікалаем Калінковічам. Ён, слухач ці аспірант Вышэйшай школы КДБ СССР, прыехаў на чарговы з'езд пісьменніцкай арганізацыі. Нядоўгая размова, абмен адрасамі, а праз які месяц Мікола зноў наведваецца ў Ашхабад. І ўжо знаёміць мяне з Керымам Курбаннепесавым.

Сустракаліся дома ў паэта на вуліцы Карпінская. Як мне падаецца з тае даўніны, гаварыў болей за ўсіх Мікола. Керым-ага і прыглядаўся да мяне, і, здавалася, у думках адыходзіў ад нашай размовы. А як жа іначай?! Я прыйшоў у вайсковай форме. Ён яшчэ, пэўна, толькі прызвычаіўся да Міколы, пакінуўшы перасцярогу перад яго кэдэбэшнай пасадай. А тут вось... І я, выйшаўшы з дому паэта, перад гэтым марачы і пра інтэрв'ю з ім, і пра нейкія іншыя творчыя праекты (як цяпер разумею — наўздзіў амбіцыйныя, без усялякіх на тое падстаў з майго боку), цвёрда вырашыў да Курбаннепесава не заходзіць і ўвогуле ні па якіх пытаннях не звяртацца.

Мінула колькі месяцаў. Наладзіліся стасункі з рэдакцыямі туркменскіх газет, часопісаў. Аднавілася ліставанне з беларускімі гісторыкамі, пісьменнікамі, якія нешта маглі б падказаць у сувязі з Туркменіяй. І неяк склалася наша знаёмства з народным пісьменнікам Туркменістана, галоўным рэдактарам часопіса "Корпе" ("Малыш") Каюмам Тангрыкуліевым. Якраз я пачаў збіраць інфармацыю для артыкула пра Еўдакію Лось у сувязі з яе наведваннем Ашхабада і яе вершам з прысвячэннем Б. Кербабаеву, Т. Эсенавай і К. Тангрыкуліеву... Заходжу, папярэдне патэлефанаваўшы, у рэдактарскі пакой Каюма. А там — Керым Курбаннепесаў. Галоўны рэдактар "Корпе" (сустрэча з ім, здаецца, была ўжо другая ці трэцяя) знаёміць нас. Я, канечне ж, маўчу, пакідаючы паэту права (ды яшчэ — нашмат старэйшаму за мяне чалавеку: Керым-ага нарадзіўся ў 1929 годзе) на далейшае развіццё падзей. Курбаннепесаў вытрымаў паўзу і гаворыць, прыязна ўсміхаючыся вачыма: "А мы знаёмы..." Гаспадар пакоя крышачку здзіўлены. Для яго я ўсё яшчэ — іншапланецянін з дзіўнай цікавасцю да тэмы падарожжа беларускай паэткі ў краіну Каракумаў. А высокі госць прадаўжае: "Што не заходзіце?.. Я чакаў". Не вызначаючы час і дзень, дамаўляемся пра сустрэчу. На душы адчуваю нейкую палёгку. Уражанне такое, што я ўжо сам пазнаёміўся, без рэкамендацыі і "пратэкцыі" Калінковіча, з паэтам, сімпатыі да якога па меры адкрыцця яго творчасці і знаёмства з Туркменіяй увогуле шырыліся неймаверна.

...Пройдзе час — і мне на вочы патрапіць томік "выбранага" Керыма Курбаннепесава ў маскоўскай "Художественной литературе». Кнігу я набываю, але пра гэта паэту не кажу. Керым-ага ў адну з сустрэч дорыць мне тую ж кнігу: "У цябе, відаць, няма... А я саромеўся даваць, бо не лепшы асобнік застаўся..."

Прычына маўчання пра набытак з кнігарні была такая, хаця мо крыху і дзіўная. У прадмове да томіка , аўтарам якога з'яўляўся добры знаўца нацыянальных літаратур Савецкага Саюза Дзмітрый Малдаўскі, прачытаў: "Мне прыйшло на памяць пісьмо жанчыны з Беларусі, прыведзенае ў "Литературной газете": "Нечакана жорсткі ўдар зваліў мяне з ног, я думала, што пазбаўлюся розуму. І я дайшла да краю. Накіравалася на пошту, каб напісаць апошні ў жыцці ліст. І раптам на вочы мне патрапіла вітрына з кнігамі. Увагу захапіла сонечнага колеру вокладка невялікай кніжкі і назва "Ради доброты». Узяла зборнік і адразу ж прачытала на дзесятай старонцы:

Скажите , вы, наверно, замечали
Средь уличной текучей тесноты
Отмеченные глубиной печали
Людские лица скорбной красоты!

(Пераклад Ю. Рабініна).

Прачытаўшы верш, я стрымала слёзы. Але нязмушана прыціснула да грудзей чароўную кніжачку, як самае дарагое, баючыся згубіць. Я нават забылася, што ішла пісаць апошні ў жыцці ліст." (" Литературная газета", 1976, 15 красавіка).

Тут размова ішла пра вершы Керыма Курбаннепесава!"

Мне хацелася пагаварыць з Керымам пра гэты ліст, але і карцела сваімі вачыма ўбачыць публікацыю ў "Литературной газете", прачытаць яе цалкам. Не паспеў...

Затое цяпер ужо два асобнікі "выбранага" выдання 1979 года павярнулі размову ў іншае рэчышча. Пачалася наша шматгадзінная размова пра характар перакладчыцкай работы ў паэзіі.

Канечне ж, няшмат запомнілася з тых размоў. Памятаю, Керым-ага досыць выразна акрэсліў свае сімпатыі да беларускай паэзіі, пералічыўшы, каго ведае з нашых паэтаў. Сказаў, што, калі б меў больш часу (ён, пэўна, ужо тады лічыў гады жыцця, бо прайшоў мяжу першага інфаркта), то пераклаў бы Максіма Багдановіча. Гучала з вуснаў туркменскага паэта і назва зборніка вершаў нашага "Страцім-лебедзя" — "Вянок". Нешта я спрабаваў расказаць пра адносіны Максіма з бацькам — Адамам Ягоравічам Багдановічам. Томік паэзіі Максіма Багдановіча — адно з маскоўскіх выданняў — меўся і ў хатняй бібліятэцы Керыма. Мне вельмі карцела, каб туркменскі паэт стаў бліжэйшым да беларускай паэзіі. І нешта наіўнае я раіў свайму суразмоўцу, падчас забываючы, якой велічыні асоба перада мною.

Памятаю, як доўга (і, здаецца, не раз) Керым-ага распытваў у мяне, што значыць слова "жалейка", чаму менавіта так — "Жалейка" — назваў Янка Купала сваю першую кнігу, якія яшчэ народныя інструменты ёсць у беларусаў. Мне б тады сённяшняе маё веданне, мне б тады набытыя ў роспытах ва Уладзіміра Грома ці Міхася Дрынеўскага веды!.. Мне б тады знаёмства з бацькам і сынам Жукоўскімі з Мар'інай Горкі, прызнанымі майстрамі народных інструментаў!.. Складвалася ўражанне, што да асэнсавання велічнасці Купалы, яго бязмежнасці туркменскі паэт тады яшчэ толькі падыходзіў. Справа тут вось у чым. У першыя пасляваенныя гады паэзія Купалы і Коласа прыйшла да ўсесаюзнага чытача не ў самых лепшых перакладах рускіх паэтаў. Засваенне беларускай літаратурнай класікі толькі пачыналася. А мо так і не адбылося напоўніцу, калі меркаваць, прыкладам, па перакладзе "Новай зямлі" Якуба Коласа на рускую мову. А яшчэ ў 1941 годзе ў Ашхабадзе ў адной кнізе па-туркменску загучала паэзія Янкі Купалы і Якуба Коласа. Перакладчык — Ату Ніязаў. Паэт 1906 года нараджэння. Выпускнік педвучылішча, рабкор рэспубліканскай газеты. Камсамольскі работнік. Пясняр новага жыцця, змен, прынесеных Вялікім Кастрычнікам. Дэлегат Першага Усесаюзнага з'езда пісьменнікаў. Загінуў у Сталінградскай бітве... Біяграфія сама і падказвала Ату Ніязаву і рытмы, і інтанацыю адпаведную. Ды і выбар твораў для перакладу быў абумоўлены. Таму вось ужо і праз уласны вопыт, праз папярэдне ўсталяваныя барыкады і даводзілася прарывацца Керыму Курбаннепесаву ў пошуках сапраўднасці паэзіі Янкі Купалы.

А Керым-ага быў вялікім кніжнікам з самага юнацтва. І, не жадаючы прастойваць у паэтычнай рабоце, ён шмат працаваў над перакладамі лепшых і разам з тым сімпатычных яму ўзораў сусветнай паэзіі. Так склалася яго паяднанне з творчасцю венгра Шандара Пецёфі. Чытаем у вядомай ужо прадмове Дзмітрыя Малдаўскага: "Калі ён пераклаў Шандара Пецёфі, венгерскі паэт прыйшоў у край Махтумкулі не як чужаземны, няхай сабе і дарагі госць, а як пазнаны вялікі брат.

Керым перакладаў рускіх класікаў і савецкіх паэтаў. Ён стварыў нешта большае, чым пераклад, застаючыся паэтам, цяснейшым чынам звязаным з нацыянальнай будовай верша, ён змог увесці ў традыцыю туркменскай паэзіі заваёвы паэзіі рускай, пераадолець тую мяжу, рысу, якая аддзяляла паэтыку адной паэтычнай стыхіі ад другой. Вялікі, арыгінальны паэт, ён — так пішуць туркменскія літаратуразнаўцы — змог перадаць своеасаблівасць самых розных пісьменнікаў, знайсці нацыянальны эквівалент мове, голасу, музычнаму тэмбру кожнага з іх. І ў гэтым адна з рыс яго майстэрства."

А я так і не дачакаўся перакладаў Керыма Курбаннепесава з паэзіі Багдановіча і Купалы... Ведаючы, якая высокая ў туркменскай прасторы вага паэтычнага слова, мяркую, што з гэтымі перакладамі туркменскаму народу беларусы сталі б значна бліжэйшымі.

У 1987 годзе ў Ашхабад прыехаў літкансультант Саюза пісьменнікаў БССР Алесь Емяльянаў. Ён прывёз з сабою рукапіс анталогіі беларускай дзіцячай літаратуры для выдання ў перакладзе на туркменскую мову. Толькі размясціўшыся ў гасцініцы ЦК Кампартыі, Алесь знайшоў мяне. І пачаліся нашы паходы — у выдавецтвы "Туркменистан" і «Магарыф», дахаты да паэта Касыма Нурбадава, да пісьменніка Курбана Чаліева (яго кніжку вершаў пераклала на беларускую мову Любоў Філімонава)... Керым-ага тады ляжаў у цэкоўскай Лечкамісіі. Схапіла ў чарговы раз сэрца. Я прыйшоў да паэта за дазволам, ці магу прывесці да яго беларускага літаратара. "Канечне, Саша, канечне..." Сустрэча наступным вечарам атрымалася непрацяглай. Прычына простая: не хацелася стамляць хворага чалавека. Алесь расказаў пра мэту свае паездкі. Папрасіў, каб Керым-ага ўзяў пад свой "патранат" альбо асабіста пераклаў класічныя творы — вершы Купалы, Коласа, Багдановіча. Курбаннепесаў адказаў тактоўна і ўсё ж няпэўна. Мяне, які чакаў імгненнай згоды, гэтая нявызначанасць, прызнацца, пакрыўдзіла.

Ужо пазней, калі Керым-ага быў дома, ён сам пачаў размову пра пераклады для беларускай дзіцячай анталогіі. "Ачык асман" ("Яснае сонейка") выйшла, здаецца, у 1989 годзе (я тады служыў на Кубе). Быў прадстаўлены ў зборніку і Максім Багдановіч. Перакладаў яго вершы зусім не Керым-ага. Тут і іншыя горкія абставіны наклаліся: Курбаннепесаў памёр на пачатку восені 1988 года...

У ліку сваіх настаўнікаў Керым-ага назваў Маланепеса. Раней пісалі: "Мала-Непес". Менавіта — праз злучок. Нарадзіўся каля 1810 года паблізу Серахса. Вучыўся ў медрэсе Мерва (Мары) і Бухары. Усё жыццё настаўнічаў у родным ауле і займаўся сялянскай працай. Памёр ад ран, атрыманых у баі з іранскімі захопнікамі ў 1862 годзе. Аўтар папулярнага дэстана "Захрэ і Тахір". Майстар інтымнай лірыкі. Сам стварыў музычныя мелодыі на ўласныя вершы і сам іх выконваў. У туркменскім народзе Маланепеса называлі "паэт-дыханне". Згадваючы гэткую характарыстыку, думаю пра тое, што народны паэт Туркменістана Керым Курбаннепесаў, наладжваючы сваю ўласную сістэму мастацкіх вобразаў, будуючы ўласны паэтычны дом, шукаў якраз тое галоўнае, дзеля чаго вырваўся ў вялікі свет з маленькага туркменскага аула — шукаў дыханне паэзіі.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

«Беларуская філалогія — клопат майго жыцця»

Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі ўсё жыццё прысвяціў працы са словам. Дастаткова пералічыць званні і пасады, якія ён займаў, каб зразумець, якую карпатлівую працу няспынна вёў гэты неардынарны чалавек на працягу доўгіх гадоў. Доктар філалагічных навук (1970), прафесар (1971), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1972), член Саюза пісьменнікаў. Узначальваў Рэспубліканскае метадычнае аб'яднанне лінгвістаў-беларусазнаўцаў, быў старшынёй лінгвістычнай секцыі навукова-метадычнага савета Міністэрства асветы Беларусі, членам Рэспубліканскага камітэта славістаў. Узнагароджаны шматлікімі медалямі, атрымаў ордэны Чырвонай зоркі, Айчыннай вайны I ступені, "Знак пашаны".



Будучы філолаг-пісьменнік нарадзіўся ў в. Клетнае Глускага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыўшы пачатковую школу ў родным Клетным, працягваў адукацыю ў сямігодцы ў суседнім Глуску. Там настаўнік Станіслаў Бараноўскі прывіў удзячнаму вучню любоў да роднага слова, народнай казкі, песні.

Але прафесію Фёдар Міхайлавіч абраў не філалагічную — паступіў у Мінскі архітэктурны тэхнікум, давучыцца ў якім не дазволіла здароўе. Прафесійную адукацыю ён усё-ткі атрымаў: у 1936 годзе скончыў Рагачоўскі педагагічны тэхнікум з выдатнымі адзнакамі. Пасля маладога настаўніка прызначылі выкладаць беларускую і рускую мову і літаратуру ў Буцавіцкай школе Заслаўскага раёна. Апынуўшыся ў новай мясцовасці, Фёдар Міхайлавіч звярнуў увагу на тутэйшую гаворку, на адрозненні ў маўленні ў параўнанні з жыхарамі родных вакольц. Якраз тут і ў гэты час ён зрабіў першыя занатоўкі яркіх народных слоў, фразеалагізмаў, прыказак, прымавак.

Праца ў Буцавіцкай школе стала пачаткам доўгага і плённага шляху Янкоўскага як назіральнага, цікаўнага, скрупулёзнага навукоўца. Нягледзячы на тое, што акрамя школьных заняткаў, Фёдар Міхайлавіч завочна вучыўся ў Мінскім настаўніцкім інстытуце, што амаль не пакідала яму вольнага часу, усе 3 гады ён працягваў папаўняць сваю картатэку, якая стала грунтоўнай практычнай базай у далейшых даследаваннях.

У лістападзе 1939 года Янкоўскага прызвалі ў Чырвоную Армію. Ад фінскай вайны ў яго засталося пасведчанне інваліда. Аднак, і там ён не забываўся весці дзённікавыя запісы, дзе занатоўваліся пачутыя ад салдат яскравыя словы і выразы. Праз некаторы час пасля вяртання ў Буцавічы Фёдару Міхайлавічу давялося перажыць яшчэ адну вайну, Вялікую Айчынную. Ён стаў партызанам, начальнікам баявой і агентурнай разведкі атрада "Грозны", які дзейнічаў супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў на Міншчыне.

І ўсё ж, нягледзячы на выпрабаванне дзвюма войнамі, жаданне працягваць вучобу, удасканальваць прафесійнае майстэрства ў Ф. Янкоўскага не знікла. У 1948 годзе ён заканчвае філалагічны факультэт Гродненскага педагагічнага інстытута, выкладае беларускую мову і літаратуру ў Радашковіцкай сярэдняй школе і адначасова вучыцца ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя А. Горкага. Менавіта гэтая ўстанова пазней стане месцам працы выдатнага даследчыка. А навуковым кіраўніком Фёдара Міхайлавіча ў аспірантуры быў акадэмік АН СССР, АН ЧССР, АН ГДР і АН ФРГ Віктар Іванавіч Баркоўскі, вучань славутага беларускага мовазнаўцы Яўхіма Фёдаравіча Карскага.

Фёдар Янкоўскі з партызанскім сябрам Вінеравым

Фундаментальныя веды, атрыманыя падчас няспыннай і працяглай вучобы, дапамаглі Ф. Янкоўскаму ў напісанні кандыдацкай дысертацыі на тэму "Глускія гаворкі", абароненай у 1954 годзе. Асноўным матэрыялам паслужылі асабістыя запісы жывой народнай гаворкі з уласнай картатэкі. Вынікам даследавання сталі 3 выпускі "Дыялектнага слоўніка" (1956, 1960, 1970), у якіх сабраная лексіка не толькі гаворак роднага Глускага раёна, але і іншых беларускіх гаворак, змешчаныя паралелі з некаторых іншых славянскіх і неславянскіх моў (польскай, чэшскай, балгарскай, нямецкай і інш.).

Кнігі Фёдар Міхайлавіч выдаваў рэгулярна, бо нястомна працавала творчая думка, бесперапынна збіраліся, сістэматызаваліся і аналізаваліся новыя запісы. Ужо праз год пасля выдання першага тома слоўніка, у 1957 годзе, свет пабачылі "Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі", што змяшчалі больш як 5 тысяч устойлівых народных выразаў і былі, па сутнасці, першым зборнікам беларускіх прыказак і прымавак, выдадзеных у савецкі час. Картатэка Янкоўскага ў той час налічвала больш як 20 тысяч адзінак, і ў 1962 годзе з'яўляецца другое выданне зборніка — "Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы". Працягваючы апрацоўваць фразеалагічную спадчыну беларускай мовы, у 1969 годзе ён выдае кнігу — "Беларуская фразеалогія. Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне", якая ўяўляе сабой тлумачальны слоўнік беларускай народнай фразеалогіі. Смела можна сцвярджаць, што, менавіта дзякуючы самаахвярнай працы даследчыка, беларуская лінгвістыка ўзбагацілася новымі раздзеламі — фразеалогіяй і фразеаграфіяй.

Праблемы, якімі цікавіўся Ф. Янкоўскі, былі абсалютна не вывучанымі, нікім не даследаванымі, не апісанымі ў навуковай літаратуры. У многіх галінах лінгвістыкі менавіта ён стаў першапраходцам. Так адбылося і з кнігай "Крылатыя словы і афарызмы" (1960), дзе ўпершыню сабраныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў. Фёдар Міхайлавіч не адносіўся да ліку тых навукоўцаў, якія галоўную мэту сваёй дзейнасці бачаць у напісанні як мага большай колькасці тэарэтычных прац, ён на першае месца ставіў магчымасць выкарыстання вынікаў даследаванняў на практыцы. Пра гэта сведчаць шматлікія падручнікі, дапаможнікі для студэнтаў і настаўнікаў, напрыклад, "Гістарычная граматыка беларускай мовы", раздзелы ў падручніках для ВНУ, прысвечаныя апісанню розных мовазнаўчых дысцыплін.

У сферу цікаўнасці навукоўца ўваходзіла не толькі фразеалогія, ён займаўся і іншымі лінгвістычнымі пытаннямі. У 1960 годзе пабачыла свет кніга "Беларускае літаратурнае вымаўленне", у якую аўтар уключыў кароткі арфаэпічны даведнік з 450 слоў і іх формаў. Па сутнасці, гэта першы арфаэпічны слоўнік беларускай літаратурнай мовы.

Навуковую спадчыну Фёдара Міхайлавіча складаюць яшчэ і манаграфіі "Пытанні культуры мовы" (1961), "Вусная мова і выразнае чытанне" (разам з У. Калеснікам) (1962), "Беларускія народныя параўнанні" (1973) і іншыя. Акрамя таго, ён аўтар шматлікіх артыкулаў, аглядаў і рэцэнзій, рэдактар слоўнікаў, усяго яго пяру належыць больш як 300 прац. Не будзем забывацца, што ўвесь гэты ўклад у развіццё беларускай лінгвістыкі зрабіў чалавек, які падчас вайны атрымаў пасведчанне непрацаздольнасці.

У 1973 годзе на старонках газет і часопісаў друкуюцца яго першыя філалагічныя эцюды, своеасаблівыя мастацкія замалёўкі — абразкі. Пазней яны ўвойдуць у зборнікі апавяданняў, нарысаў, мініяцюр "Абразкі" (1975), "Прыпыніся на часіну" (1978), "І за гарою пакланюся" (1982), "Радасць і боль" (1984), "Само слова гаворыць" (1986), "З нялёгкіх дарог" (1988). Супакойваючы тых, хто баяўся, каб Фёдар Міхайлавіч не адышоў ад лінгвістыкі, у прадмове да "Абразкоў" ён піша: "Беларускае мовазнаўства — шырокае роднае поле, на якім яшчэ ёсць неўзараныя дзялянкі і недагледжаныя нівы. Яшчэ не ўсе сабраныя мною матэрыялы і назіранні апрацаваў і падрыхтаваў да друку, яшчэ не ўсё з гэтага асэнсавана, вывучана. Лінгвістыка, філалогія не стане ў мяне пабочным заняткам." А сабрана ім было больш як 50 тысяч фразеалагізмаў, прыказак, прымавак, устойлівых параўнанняў, афарызмаў, выслоўяў.

Цікавіўся ён і перакладам з рускай мовы на беларускую. Праўда, лічыў, што не існуе такіх слоўнікаў, якія здолелі б цалкам забяспечыць перакладчыка неабходным і дастатковым слоўнікавым (у тым ліку і фразеалагічным) матэрыялам, — пераклад любога тэксту ў першую чаргу павінен мець творчы характар.

Ад 1953 года Фёдар Міхайлавіч самааддана працаваў у педагагічным інстытуце, 27 гадоў узначальваў кафедру беларускага мовазнаўства. Вялікую ўвагу надаваў падрыхтоўцы маладых вучоных, перадаваў ім свой досвед, не шкадаваў ні часу, ні сіл на павышэнне ўзроўню іх ведаў. У выніку пад яго кіраўніцтвам 23 чалавекі абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Пераадолець усе жыццёвыя нягоды і стаць выдатным навукоўцам, вядомым не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі, Фёдару Міхайлавічу Янкоўскаму дапамагла любоў да роднага слова, якая ніколі не была для яго толькі прафесійным абавязкам. Сваё жыццёвае крэда ён фармуляваў так: "На світанні, на змярканні, золкаю ці ветранаю ноччу, хмурным ці сонечным днём — заўсёды і ўсюды жыццё маё будзе не дзеля кавалка хлеба; найгалоўнейшае, ад чаго не адступлюся, хоць апынуся ці ў акопе, ці ў шпіталі, хоць буду халодны ці галодны, — маё роднае слова, родная натура вялікага краю, родная Беларусь."

Ганна РАК

Здымкі з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Слова пра Міколу Аляхновіча

4 красавіка 1925 г. пры Барысаўскім педтэхнікуме была ўтворана Барысаўская філія "Маладняка". Напрыканцы гэтага ж года (10-11 лістапада) актывісты філіі правялі першую акруговую канферэнцыю. У канферэнцыі бралі ўдзел Мікола Аляхновіч (старшыня філіі), Хведар Паўлоўскі (сакратар), ад Цэнтральнага Бюро прысутнічаў адзін з заснавальнікаў аб'яднання Анатоль Вольны. Спачатку склад філіі быў вельмі сціплы. Па сутнасці — 4-5 чалавек, але неўзабаве яна напоўнілася заявамі шматлікіх аматараў літаратурнай славы. Аднак у далейшым літаратурную вядомасць набылі толькі Рыгор Мурашка і Мікола Аляхновіч.

Самым яркім прадстаўніком Барысаўскай філіі быў Мікола Аляхновіч. Нарадзіўся будучы крытык 21 красавіка 1903 г. у Барысаве. Цікавы той факт, што сваё сацыяльнае паходжанне ён пазначаў па-рознаму: у 1925 г. у анкеце Барысаўскай філіі "Маладняка" ў графе "сацыяльнае становішча" напісана — земляроб, а ў 1928 г. у анкеце таго ж "Маладняка" — з рабочых. У 1920 г. М. Аляхновіч скончыў восем класаў Барысаўскай мужчынскай гімназіі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне, вучыўся на медыцынскім факультэце (1921—1924), а ў 1930 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ, працаваў настаўнікам (1925—1930). У лістападзе 1925 г. выбраны кіраўніком Барысаўскай філіі «Маладняка». У 1930—1932 гг. становіцца аспірантам, а ў 1932—1934 гг. — навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. Адначасова працаваў выкладчыкам Мінскага вышэйшага педінстытута (1933—1936).

Літаратурнай дзейнасцю М. Аляхновіч пачаў займацца з 1918 г., друкавацца — з 1919 г. Ён быў адным з найбольш актыўных крытыкаў у "Маладняку". Як і большасць маладнякоўцаў, у сваёй творчасці за аснову браў ідэалагічныя крытэрыі і недаацэньваў мастацкія — адсюль павярхоўныя, дагматычныя, часам прымітыўныя, уяўленні пра некаторыя творы.

Нягледзячы на гэта, яго літаратурна-крытычныя артыкулы — цікавая старонка гісторыі беларускай літаратуры, а разам з тым — і яскравая характарыстыка думак і поглядаў маладога творчага пакалення 1920—1930-х гадоў.

У 1936 г. М. Аляхновіч быў арыштаваны і ў 1938 асуджаны на 12 гадоў. Адбываў ссылку на Калыме (1938—1942), а пасля на пасяленні ў Іркуцкай і Карагандзінскай абласцях. Працаваў лекарам у лагерным медпункце. У 1957 г. рэабілітаваны. Ужо будучы цяжкахворым, пераехаў у Ленінград, дзе працягваў займацца даследаваннямі ў галіне медыцыны. 9 красавіка 1959 г. Мікола Аляхновіч пайшоў з жыцця.

Прыкладна за 10 год літаратурнай працы Мікола Аляхновіч напісаў шэраг артыкулаў і рэцэнзій пра творчасць М. Гарэцкага, А. Александровіча, М. Багдановіча, М. Зарэцкага, Я. Коласа, Р. Мурашкі, П. Труса, Я. Скрыгана, А. Пушкіна і інш.

Ірына МАКАРЭВІЧ

Слынны рэстаўратар

Пётр Жынгель нарадзіўся 12 лютага 1898 года ў Докшыцах (цяпер Віцебская вобласць), памёр 27 студзеня 1983 года ў Гданьску (Польшча). Вядомы і як мастак, і як рэстаўратар твораў мастацтва.

У час Першай сусветнай вайны П. Жынгель жыў з бацькамі ў Пецярбургу, вучыўся там у сярэдняй школе. Пасля вайны вярнуўся з роднымі ў Беларусь. У 1921—1927 гг. вучыўся на мастацкім факультэце Віленскага універсітэта. Закончыўшы яго, працаваў настаўнікам у Дзяржаўнай рамесніцка-прамысловай школе ў Вільні, выкладаў сталярства ў спецыяльнай школе для хлопчыкаў. Але дыплом мастака атрымаў толькі ў 1939 годзе. Тады ж ажаніўся з настаўніцай польскай мовы і гісторыі Вандай Баркоўскай.

У пачатку 1945 года П. Жынгель выехаў з сям'ёй у Люблін (Польшча), дзе выступіў адным з заснавальнікаў мастацкай групы "Zespół" ("Супольнасць"). Восенню ж наступнага года перабраўся ў Гданьск, дзе арганізаваў рэстаўрацыйную майстэрню пры мясцовым аддзяленні Саюза польскіх мастакоў, кіраваў ёю на працягу 1948—1951 гг. Пасля восем гадоў загадваў майстэрняй жывапісу і яшчэ сем гадоў працаваў галоўным рэстаўратарам Гданьскай майстэрні рэстаўрацыі помнікаў. Карыстаўся вялікай павагай і папулярнасцю як вопытны спецыяліст у сваёй галіне. У вольны час займаўся жывапісам. У яго палотнах адчуваецца настальгія па родным краі.

Па слядах бацькі пайшоў сын Вітаўт, які працуе рэстаўратарам у Торуні. Дачка Марыя — архітэктар, жыве ў Гданьску.

Алена ГЛАГОЎСКАЯ
г. Гданьск

Дзеля простага чалавека

Міхась Андрасюк нарадзіўся 2 снежня 1959 года у вёсцы Войнаўка Гайнаўскага павета на Беласточчыне ў сялянскай сям'і. Закончыўшы пачатковую школу ў Старыне (1974 г.), вучыўся ў Гайнаўскім ліцэі з беларускай мовай навучання (1974—1978 гг.). Працуючы настаўнікам пачатковай школы (вёска Палічна, 1978—1983 гг.), закончыў завочныя двухгадовыя настаўніцкія курсы ў Беластоку, пасля чаго паступіў на завочнае аддзяленне Інстытута фізкультуры ў Варшаве, аднак у 1983 годзе ў сувязі са стратай пасады настаўніка, ён як беспрацоўны быў пазбаўлены права вучыцца ў вышэйшай установе. Спрабуе авалодаць прафесіяй каменячоса (1983—1987 гг.), адкрывае нават сваю фірму, затым бярэцца за дзейнасць муляра, паштальёна, пераплётчыка кніг. У 1999 годзе ўладкоўваецца журналістам на Радыё "Рацыя" ў Беластоку, дзе і працуе да гэтага часу, супрацоўнічае з тэлеканалам "Белсат" як сааўтар і вядучы перадачы "Дэмакратыя на штодзень". З'яўляецца старшынёй няўрадавай арганізацыі "Беларускі форум самакіравання ў РП". У 2002—2006 гг. — дэпутат рады павета Гайнаўка (ад Беларускага выбарчага камітэта).

Яшчэ ліцэістам у 1976 годзе М. Андрасюк стаў карэспандэнтам "Нівы", дзе дэбютаваў вершам. Друкаваў свае творы ў часопісах "Тэрмапілы", "Дзеяслоў", у перакладах у чэшскім друку. Аўтар кніг прозы "Фірма" (Беласток, 2000), "Мясцовая гравітацыя" (Беласток, 2004), аповесці "Белы конь" (Беласток, 2006).

Творчасць М. Андрасюка цалкам паглыблена ў сучаснасць, адлюстроўвае жыццё простага чалавека на польска-беларускім памежжы.

Ян ЧЫКВІН
г. Беласток

Вядучы рубрыкі — доктар філалагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Адам МАЛЬДЗІС.
Выпуск 9.

Найперш — паэт

Шмат часу можа прайсці, пакуль пра існаванне нейкай каштоўнасці, скарбу дазнаюцца людзі. Так адбылося і на гэты раз. Толькі да стагоддзя з дня нараджэння асоба Веніяміна Фабрыканта, таленавітага ўраджэнца беларускага горада Оршы, адкрылася сваім землякам.

Такому адкрыццю мы абавязаны сябрам з Рыгі, куды ў 60-я гады пераехаў Фабрыкант. Яны прапанавалі беларусам разам ушанаваць памяць знакамітага за мяжой земляка напярэдадні яго стогадовага юбілею. Да гэтага ж моманту імя Фабрыканта не сустракалася ні ў прэсе, ні ў энцыклапедычных даведніках Беларусі. Хоць падстаў для гэтага больш, чым дастаткова.

Веніямін Львовіч Фабрыкант — вядомы вучоны-энергетык, прафесар, доктар тэхнічных навук, лектар Маскоўскага энергетычнага і Рыжскага політэхнічнага інстытутаў, кіраўнік розных навукова-даследчых прац, метадыст, вынаходца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Латвійскай ССР, аўтар шэрага артыкулаў і навуковых кніг. А яшчэ ён ПАЭТ.

"Калі б не паэзія Фабрыканта, ён не прыйшоў бы сюды, бо спярша прыходзіць слова, якое было ў пачатку," — казаў на "круглым стале" ў Беларускім доме дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, прысвечаным юбілею Веніяміна Львовіча, Фелікс Кац, рыжскі паэт і выдавец кніг Фабрыканта (між іншым, таксама родам з Беларусі, з Бабруйска).

Аб прыярытэтным становішчы паэзіі ў сваім жыцці пісаў і сам Веніямін Львовіч: "Усе думаюць, што я вучоны, а я перш-наперш — паэт".

Першы верш Веніямін напісаў яшчэ ў 9 год, а потым ужо не мог спыніцца. Ён не

толькі не ўяўляў сябе без паэзіі, але, часам, проста не мог без яе існаваць. Экспромты нараджаліся ў яго як водгукі на падзеі, дзеянні людзей, як адказы і прысвячэнні. Аб чым яго вершы? "Аб усім — аб жыцці ва ўсіх яго праявах: ад кахання да палітыкі, ад зямной дарогі да космасу...", — сцвярджае Фелікс Кац. Усяго ж Фабрыкант напісаў больш 250 вершаў, розных па тэмах і манеры. Пры жыцці, аднак, быў апублікаваны толькі адзін яго верш — у рэспубліканскай "Советской Латвии", з дзесятак — у студэнцкіх газетах. Больш не друкавалі... Можа, таму, што вершы былі занадта вострымі ў адносінах да савецкай рэчаіснасці. Ці мо рэдактары ніяк не маглі зразумець, як вучоны-энергетык можа адначасова быць і паэтам. У любым выпадку, гэта была адна з трагедый у жыцці Фабрыканта, якая яшчэ два дзесяткі гадоў працягвалася і пасля яго смерці. Рускамоўныя зборнікі "Шаги истории" і "Второе начало" ўбачылі свет толькі адпаведна ў 2001 і 2003 гадах, дзякуючы намаганням Фелікса Каца і жонкі Фабрыканта Веры Блок.

А крыху раней, у 2000 годзе, у той жа Рызе ўдалося надрукаваць выдатны раман у вершах Веніяміна Фабрыканта "Фёдар Соеў". Пісаўся ён з перапынкамі: пачаў яго аўтар на чацвёртым курсе універсітэта, у 1935 годзе, а закончыў толькі ў 1955-м. Потым дзесяткі гадоў рукапіс ляжаў у рэдактара часопіса "Даўгава", непрыняты і незапатрабаваны па тых жа прычынах, што і вершы.

"Фёдар Соеў" цікавы для нас ужо сваёй формай — гэта 359 чатырнаццацірадковых "анегінскіх строф". Да гэтай найбольш ёмістай разнавіднасці страфы ў рускай літаратуры ўпершыню звярнуўся А. Пушкін, стварыўшы адзін з самых значных паэтычных твораў не толькі ў рускай, але і сусветнай літаратуры — "Яўгеній Анегін". Гэта быў самы любімы твор Фабрыканта, які ён мог цытаваць бясконца. Шмат аналогій можна правесці паміж гэтымі творамі Пушкіна і Фабрыканта, нават імёны некаторых герояў тут супадаюць: Яўгеній, Вольга. Аднак Веніямін Львовіч не быў простым перайманьнікам. Ён не толькі развіў "анегінскую страфу" (19 мадыфікацый у параўнанні з 10-ю ў рамане "Яўгеній Анегін"), але і напоўніў яе новым зместам. Дакладней, апісаў тут савецкае жыццё з усімі яго супярэчнасцямі.

Галоўны герой рамана Фёдар Соеў — толькі што дыпламаваны інжынер, прызначаны на кіруючую пасаду, апанаваны адзінай марай-мэтай, якая, як атрутная кветка, цвіце ў яго галаве. Назва ёй — улада, вялікая, усеабдымная, жорсткая, здольная і заняволіць, і забіць. Усе метады прыдатныя для гэтай справы: ліслівасць, інтрыгі, паклёп. Аднак Соеў не спадзяецца на просты, "шэры" народ, а выбірае для ажыццяўлення сваёй мары таго, хто стаіць вышэй, хто можа стаць заступнікам і абаронцам, выканае ролю льва, у поўсці якога можна ў патрэбны момант схавацца, як блыха, а пройдзе час — саскочыць прэч. Але выкрыць, вывесці на чыстую ваду, зняць не са сваёй пасады Соева-кіраўніка здольны менавіта працоўны люд, простая "шэрая маса". І Соеў адыходзіць, бяжыць па дапамогу да свайго льва з надзеяй зноў кінуцца ў бой ужо на новым месцы. Быццам бы перамагае, але ў той жа час губляе свабоду выбару, сам становіцца рабом, хвастом льва, якому ўжо не наканавана ад яго аддзяліцца...

"Фёдар Соеў" поўны каларытных вобразаў, аўтабіяграфічных звестак (да прыкладу, галоўнага героя, як і Фабрыканта некалі, накіроўваюць на работу ў Сібір), афарыстычных выразаў, падставу для якіх давала форма "анегінскай страфы". Фелікс Кац нават падрыхтаваў зборнік афарызмаў, якія знайшоў на старонках рамана. У зборнік увайшло больш 500 выразаў.

Трэба спадзявацца, што неўзабаве паэзія нашага земляка загучыць і на беларускай мове.

**Людміла МІНКЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ**

Беларусы ў Прыбайкаллі

Іркуцкае таварыства Беларускай культуры імя Яна Чэрскага — нібыта асобная маленькая краіна, беларуская прастора ў Сібіры, з уласнымі гербам, гімнам і органам кіравання — Радай, нават са сваёй газетай "Маланка", адкуль можна даведацца пра ўсе справы таварыства.

Раз на два гады адбываецца таксама З'езд таварыства, на якім агучваюцца справаздачы, выбіраецца кіраўніцтва і зацвярджаецца праграма дзейнасці. Сёлета, дарэчы, у рабоце З'езда прымаў удзел губернатар Іркуцкай вобласці.

Планы таварыства на наступныя два гады сапраўды маштабныя: арганізаваць "Тыдзень беларускай культуры ў Іркуцкай вобласці" і музычны фестываль "Гучы, гоман беларускі", куды плануецца запрасіць гасцей з Беларусі і розных рэгіёнаў Расіі; наладзіць цесныя сувязі з беларускім пасольствам; выдаваць беларускія кнігі і метадычныя дапаможнікі.


"Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць..."

МАЛАНКА

Білетэнь–газета Іркуцкага таварыства Беларускай культуры ім. Я.Д.Чэрскага

№ 93 ТРАВЕНЬ 2008 год наклад 900 асобнікаў

У ТРАЎНІ НАРАДЗІЛІСЯ СЯБРЫ НАШАЙ СУПОЛКІ

1 траўня нарадзіўся – Раманенка Валерый Міхалаевіч; 5 траўня – Якаўлева Света; 7 траўня – Юранкова Галіна Міхалаеўна, Аксана Хвесюк; 9 траўня – Васілюк Аляксандра Уладзіміраўна; 10 траўня – Брыгун Сяргей, Дубавец Тамара Рыгораўна; 11 траўня – Філіпенка Кацярына Логвінаўна; 12 траўня – Тацьцяна Тарануш...; 13 траўня – Сіпакова Алена, Куімова Тацяна Юр'еўна; 19 траўня – Аксана Рэчкіна; 23 траўня – Асечкіна Маргарыта Анатольеўна, Георгіеў Руслан; 25 траўня – Асіноўская Вольга, Бабічава Ларыса Іванаўна; 28 траўня – Нікалаенка Алена, Анкудзінава Вольга; 29 траўня – Рудкоўскі Раман; 31 траўня – Замарзееў Міхась.

Шаноўныя спадарыні і спадары! Ад імя Рады ІТБК і Рэдакцыі «Маланкі» віншуем Вас з Днём нараджэння! Жадаем моцнага здароўя, посьпехаў у справах, асабістага шчасця, добрага настрою і трывалага Кахання!

Спадзяёмся, што Вы заўжды будзіце прымаць актыўны ўдзел у справах нашай суполкі, дый на карысць нашай любай Бацькаўшчыны. Усяго Вам найлепшага!

Па шматлікіх просьбах мы друкуем Дні народзінаў нашых сябраў, якія адбудуцца у наступным месяцы. Гэта абумоўлена тым, што шмат хто жадае наперад ведаць калі каго можна павіншаваць. Дык мы вырашылі задаволіць гэтую просьбу. Друкуем Дні народзінаў за ліпень, але без папярэдніх віншаванняў.

У ЧЭРВЕНІ НАРАДЗІЛІСЯ СЯБРЫ НАШАЙ СУПОЛКІ

2 чэрвеня нарадзілась Шурына Галіна Герасімаўна; 3 чэрвеня – Дакучыц Ніна Кузьмінічна; Корзун Алена; ... чэрвеня – Юзенкоў Мікалай Уладзіміравіч; 6 чэрвеня – Клімовіч Наташа, Зінкевіч Ліла Змітраўна; 8 чэрвеня – Марозаў Алесь Аляксеевіч; 13 чэрвеня – Мамантава Алена; 15 чэрвеня – Васільеў Антось Міхайлавіч; 17 чэрвеня – Ніканковіч Кастусь Леанідавіч; 18 чэрвеня - Казанцава Галіна Пятроўна; 19 чэрвеня – Кур'яновіч Мікалай Уладзіміравіч; Мілашэўская Ксенія; 20 чэрвеня – Назарава Натальля Аляксандраўна; 22 чэрвеня – Сіпакова Тацьцяна Уладзіміраўна; 23 чэрвеня – Якавенка Уладзімір Кузьміч; 29 чэрвеня – Галкін Алесь Змітравіч; 29 чэрвеня – Вольмар Вольга Сяргееўна; Дубавік Алесь; Гусеў Віктар Сяргеевіч; 30 чэрвеня – Шырокаў Сяржук Васільевіч; Кочнева Даша.

Падзеі і справы ІТБК

Основные итоги

8-го Съезда Региональной общественной организации «Иркутское Товарищество Белорусской Культуры им. Я. Д. Черского»

26 апреля 2008г. в Иркутске в администрации Правобережного округа прошёл 8-ой Съезд Региональной общественной организации «Иркутское Товарищество Белорусской Культуры им. Я. Д. Черского» (РОО ИТБК)

Присутствовало: 75 делегатов Съезда из отделений РОО ИТБК: Иркутского городского Черемховского, Усольского, Слюдянского, деревень: Чарчут Тайшетского района; Тургеневка Баяндаевского района; Бабагай, Мариинск, Жилзневка Заларинского района, Андрюшино Куйтунского района.

99 гостей Съезда, в том числе:

- Хохряков Евгений Михайлович – 1-й заместитель руководителя администрации Губернатора Иркутской области, помощник губернатора;
- Павлович Владимир Станиславович – Советник-посланник Республики Беларусь в РФ;

(Продолжение на стр.2)

Ёсць планы наконт будаўніцтва Цэнтра беларускай культуры з рэпетыцыйнымі пакоямі, музеем, майстэрняй, навучальным класам...

Таварыства мае ў Прыбайкаллі 10 аддзяленняў, на аснове самых буйных з іх плануецца стварыць мясцовыя нацыянальна-культурныя аўтаноміі беларусаў. Акрамя таго, у 2009 годзе мяркуецца правесці канферэнцыю, дзе размова будзе ісці пра стварэнне ўжо рэгіянальнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Прыбайкалля".

ІТБК імя Яна Чэрскага існуе 12 гадоў, пры ім дзейнічаюць фальклорныя ансамблі, беларускі народны хор, танцавальныя групы, моладзевы клуб, бібліятэка беларускай літаратуры, музей-майстэрня, гістарычны клуб. Кожны год сябры суполкі з традыцыйнымі песнямі, гульнямі і абрадамі адзначаюць беларускія святы — Купалле, Дзяды, Гуканне вясны, ладзяць вячоркі для моладзі, ажыццяўляюць этнаграфічныя даследаванні ў беларускіх вёсках Прыбайкалля, арганізуюць гурткі для дзяцей, дзе тыя вучацца размаўляць па-беларуску, чытаюць творы роднай літаратуры, вывучаюць беларускую гісторыю, фальклор. Словам, таварыства робіць высакародную справу — стварае нацыянальную прастору і яднае беларускую дыяспару ўдалечыні ад радзімы.

Саша ДОРСКАЯ

На здымку: у прыбайкальскіх беларусаў — Гуканне вясны; "Маланка" — газета таварыства, І-я старонка.

Пачаўся канцэрт. Выступаў Лявонавіцкі народны хор. Жанчыны і дзяўчаты, мужчыны і хлопцы, якія днём працавалі ў закрытым акцыянерным таварыстве "1 Мая", што ў Нясвіжскім раёне, цяпер спявалі на сцэне. У той дзень у прыбраным па-святочнаму сельскім клубе прысутнічалі старшыня Нясвіжскага райвыканкама Ігар Макар, старшыня ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Анатоль Акушэвіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Марыя Худая, загадчыца аддзела культуры райвыканкама Леаніда Віхрова, кіраўнік ЗАТ "1 Мая" Анатоль Рудзяк, народныя калектывы раёна "Лянок", "Вяночак", Ланскі мужчынскі хор, "Зараніца" ды іншыя. Усе ад шчырага сэрца віншавалі калектыў Лявонавіцкага народнага хору з 80-годдзем з дня яго ўтварэння.

Лявонавіцкія «Зорачкі»

Дарэчы, і актыўныя ўдзельнікі стварэння і арганізацыі Лявонавіцкага харавога гуртка (сярод іх былі Васіль Бенька, Юльян Непаканчыцкі, Іван Чарняўскі, Пятрусь Шчарбач, прыгадваецца ў пераліку гэтых імён і прозвішча паэта, кампазітара Сяргея Новіка-Пеюна, у бацькоўскай хаце якога адбылася першая рэпетыцыя хору), з першых дзён яго існавання не чакалі сподачка з блакітным беражком у тым далёкім 1926 годзе, а, нягледзячы на забарону польскіх уладаў, — самі арганізавалі падбор талентаў, склалі рэпертуар выступленняў (дарэчы, у выкананні самадзейных артыстаў гучалі на той час беларускія, украінскія, польскія, рускія народныя песні), праводзілі ў вольныя ад працы хвіліны рэпетыцыі, каб пасля звонкагалосай песняй абудзіць светлыя людскія пачуцці беларусаў не толькі на Нясвіжчыне, але і ў навакольных вёсках і мястэчках, прылеглых да яе паветаў. Трэба падкрэсліць, што ў 1926 годзе ў склад хору ўваходзілі семдзесят чатыры ўдзельнікі і большасць з іх былі з вёсак Лявонавічы, Лазавічы, Цякалаўшчына, Габруны, Ляхі, Смалічы.

Сведчаннем таленту выканаўцаў — шматлікія ўзнагароды: дыпломы, граматы за паспяховыя выступленні на раённых, абласных і рэспубліканскіх конкурсах і аглядах, на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР у 1971 годзе.

Зразумела, што на сённяшні дзень калектыў хору іншы. У склад яго ўліліся маладыя галасы: выканаўцы з ліку вучняў Лявонавіцкай сярэдняй школы, чарада навучэнцаў Копыльскага СПТВ, вучаніц каледжа мастацтваў, бібліятэкары.

Прасачыць гісторыю дзейнасці Лявонавіцкага хору ад дня яго стварэння і па сённяшні, прапанаваў падчас нашай сустрэчы краязнаўца з вёскі Лявонавічы Расціслаў Міхайлавіч Ждановіч.

"Хор, як сведчаць некаторыя артыкулы ў друкаваных выданнях быў створаны 18 ліпеня 1926 года, — кажа Расціслаў Ждановіч. — Аповядаецца і аб тым, што яго стваральнік Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн. Аднак дакументы, атрыманыя мною з Польшчы, сведчаць пра іншае. Справа ў тым, што дваццацігадовы Сяргей Пяюн з 1 верасня 1926 года працаваў настаўнікам у маёнтку Свет, што ля Віслы (Польшча). І, вядома ж, ніяк не мог кіраваць хорам, прыязджаючы толькі летам на адпачынак. Ды і месяц стварэння хору — ліпень — не самы лепшы для сельскага жыхара: тут і жніво табе, і нарыхтоўка сена... Карацей кажучы, самая гарачая пара для хлебароба. І тут, пагадзіцеся, было не да спеваў. Верагодна, хор быў створаны крыху пазней, мабыць, у кастрычніку-лістападзе...Дарэчы, на той час у вёсцы Цякалаўшчыне, што непадалёку Лявонавічаў, жыла сям'я Кудрукоў. Там быў свой хор, а потым іх аб'ядналі і Уладзімір Міхайлавіч Кудрук кіраваў гэтымі пеўчымі аб'яднаннямі і ў сваёй вёсцы, і Лявонавічах да 1939 года".

Цяпер, што тычыцца асабіста Сяргея Пеюна. Ён нарадзіўся ў Пецярбургу, а вось ягоны бацька Міхаіл Сцяпанавіч быў родам з Лявонавічаў. У 1918 годзе сям'я, як сведчаць дакументы, тэрмінова вярнулася назад, у Лявонавічы.

Краязнаўца Расціслаў Міхайлавіч Ждановіч паказаў пашпарт Міхаіла Сцяпанавіча Пеюна, характарыстыку і пасведчанне аб вучобе ў Нясвіжы яго сына Сяргея Пеюна, дакументы віленскага перыяду, а таксама пасведчанне аб заканчэнні настаўніцкіх курсаў у Вільні і ліст-запрашэнне, выдадзены Сяргею Пеюну, заняць пасаду настаўніка ў маёнтку Свет ля Віслы, што непадалёку Торуня (Польшча).

"А вось фота, зробленае ў маі 1934 года, — прадоўжыў аповед Расціслаў Міхайлавіч, — тут усе ўдзельнікі. Дарэчы, цікавы факт — хор быў арганізаваны пры пажарнай ахове вёскі Лявонавічы, якой на той час кіраваў мой дзед Васіль Станіслававіч Бенька. Вось ён на здымку сярод удзельнікаў хору. А гэта Пятрусь Шчарбач — дзед старшыні нашага сельскага Савета, ля іх жа побач бацька Івана Іванавіча Чарняўскага, былога дырэктара Лявонавіцкай сярэдняй школы. Вось яны ўтрох і яшчэ бацька Сяргея Пеюна і арганізавалі хор у вёсцы. Што ж тычыцца першага кіраўніка хору, то ім быў не Сяргей Пяюн, а менавіта скрыпач Уладзімір Міхайлавіч Кудрук з вёскі Цякалаўшчына. Гэта ў 60—70 гадах пацвердзілі і многія з былых удзельнікаў хору, з якімі я не раз сустракаўся, калі збіраў матэрыялы пра гісторыю стварэння хору".

Краязнаўца Расціслаў Міхайлавіч Ждановіч на працягу многіх гадоў адшукваў рукапісныя і афіцыйныя дакументы, пісьмы, якія тычыліся не толькі дзейнасці Лявонавіцкага народнага хору, але і наогул людзей, якія зрабілі важкі ўнёсак у культурна-гістарычную спадчыну роднага краю. Хоць таго ж Сяргея Міхайлавіча Новіка-Пеюна няма ўжо сярод нас, аднак засталася літаратурная спадчына: некалькі зборнікаў вершаў: "Заўсёды з песняй", "Зорачкі ясныя", "Песні з-за кратаў", успаміны пра Купалу, Карскага, Стаброўскага ды 75 песень на яго вершы.

Ёсць у Расціслава Міхайлавіча дакументы, пісьмы, фотаздымкі, у якіх апавядаецца, што з 1948 года кіраўніком Лявонавіцкага хору быў Аляксандр Кіеня, а з 1952 — заслужаны дзеяч культуры Беларусі Павел Касач (у Нясвіжы на доме, дзе жыў Павел Касач прымацавана мемарыяльная дошка). З 1964 года хор узначальваў Станіслаў Лагіновіч, а з 1990 — Святлана Аляксеева і Валерый Цыганкоў. Шмат зроблена для паляпшэння творчага майстэрства хору Стэлай Івановай, якая да нядаўняга часу кіравала хорам.

...Адсюль, з Лявонавіцкага сельскага Дома культуры, пабудаванага ў далёкім 1933 годзе мясцовым кавалём, кавалерам ордэна святога Георгія Васілём Бенькам, разляталіся песні па ўсёй Беларусі і нават за яе межы.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

На здымках: першы склад удзельнікаў хору 1926 год; Лявонавіцкія харысты падчас рэпетыцыі; у вольныя хвіліны за ваколіцай.

Фота з архіва Расціслава Ждановіча

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар, намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3379
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 1.10.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 5354
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686